

Уладзімір МАРОЗ

# БЕЛАРУСКІ ХРАМ





**Уладзімір МАРОЗ**
нарадзіўся ў 1953 годзе ў горадзе Косава Івацэвіцкага раёна. Скончыў архітэктурны факультэт БПІ (1975), Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага (1983). Працаваў у інстытуце «Мінскпраект», Дзяржкіно БССР, на кінастудыі «Беларусьфільм». Цяпер – намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Бярозка». Аўтар нізкі вершаў «Пяшчотны дотык» у зборніку «Крыло», паэтычных кніг «Голас», «Рэй», «Хутаранская зорка», кнігі эсэ «Мінск старадаўні і малады». Аўтар сцэнарыяў шматлікіх дакументальных фільмаў, звернутых да гісторыі і культуры Беларусі. Фільм «Успамін пра Міколу Равенскага» у 1984 годзе адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

Уладзімір МАРОЗ

# БЕЛАРУСКІ ХРАМ

Эсэ

МІНСК
Міжнародны цэнтр
культуры кнігі
2003

УДК 726.03 (476)
ББК 85.11 (4Беи)
М 28

Кніга эсэ Уладзіміра Мароза вылучаецца ў пэўнай ступені навізной. На лёс нашага народа, нашай гісторыі і культуры ён зірнуў па-свойму, не толькі праз найноўшае асэнсаванне гістарычных падзей, але і праз прызму духоўнасці, веры. Дзеля гэтага ўспамінае сваё маленства, што ёсць вытокам любові, згадвае вандроўку ў Святыя мясціны, далучанасць да якіх уразіла, адухавіла, натхніла, у тым ліку і напісаць пра тых, хто вякамі дбаў пра святасць нашай зямлі.

*Генрых ДАЛІДОВІЧ*

ISBN 985-6168-33-3
© Міжнародны цэнтр культуры кнігі, 2003
© Мароз У., 2003

# ЗНАКІ ГІСТОРЫІ

Аўтабіяграфічнае

Чамусьці мне, пасталеламу, пэўны час здавалася, што я памятаю жалобны дзень смерці Сталіна. Я – на руках у мамы, наўкола – мноства людзей. У сапраўднасці «бацька народаў» сканаў у сакавіку, а я нарадзіўся 11 чэрвеня таго ж 1953 года. Хутчэй мая дзіцячая карцінка з людствам – гэта з нейкага пазнейшага першамайскага ці кастрычніцкага збору. Але сам год – сёння знак гісторыі. У гарадок Косава бацькі мае, Вікенцій Іванавіч і Дзіна Канстанцінаўна, трапілі пасля Нясвіжскай педагагічнай вучэльні, якую скончылі ў 1948 годзе. Настаўнічалі яны спачатку ў недалёкай вёсачцы Скураты, дзе пабраліся шлюбам. Неўзабаве перабраліся ў самое мястэчка. Маці выкладала беларускую мову і літаратуру ў Косаўскай школе, а бацька працаваў у дзетдоме завучам, пэўны час нават дырэктарам.

Дык вось гэты самы дзетдом – ці не першы мой косаўскі ўспамін. Была ўжо ў нас палова хаты побач з ім, былі ў нас са старэйшым на два гады братам Алегам нават нянькі і, натуральна, ніякіх цяжкасцей у жыцці. Культ асобы выкрываўся пакуль для нашых бацькоў і дзядоў, а нашае маленства цякло нязмушана, як яно і павінна быць. Сапраўды маленства, бо пражыў я ў Косаве ад нараджэння роўна сем гадоў. У памяці засталося не так і шмат ад таго часу, толькі самае яркае і адметнае. Памятаю, як з братам і дзетдомаўскімі хлопцамі гулялі на пляцы перад будынкам у лапту, а хаваючыся, у карты. Але самым цікавым было глядзець дыяфільмы ў дзетдоме. Зараз думаецца, ці не адтуль у мяне нечакана потым спраўджаная ў жыцці любоў да светлага экрана ў цёмнай залі?

Маленькая рачулка Мальвінка, што цякла ўнізе за агародамі. Праз яе па кладцы мы хадзілі на горку, дзе быў дзетдомаўскі інтэрнат, каб памыцца ў лазні. Аднойчы, гуляючы, я скінуўся ў гэтую рэчачку, праплыў у бязважкасці пад вадою

некаторы час, яшчэ не паспеўшы спалохацца. Галоўнае, з расплюшчанымі вачыма. Дзякаваць Богу, там было неглыбока, так што ўратаваўся сам.

Косаўскі паваенны дзетдом, якога даўно ўжо няма, сёння таксама — знак гісторыі. Яшчэ адзін знак такі стаяў праз брукаваную вуліцу насупраць дзетдома. Касцёл. Ён мне здаваўся высокім, змрочным, непадступным. Мы вельмі любілі лазіць па цвінтары, абыходзіць будыніну з усіх бакоў. Я быў упэўнены, што касцёл увесь час зачынены. Па словах бацькі, гэта было не так, зрэдчас ён працаваў, але памяць не захавала мяне малога ўнутры храма, напэўна, каб не парушыць стан містычнага рамантызму, у якім трымаў касцёл хлапчука сваёй закінутасцю. А недалёка, на ўездзе ў горад, ля брукаванкі стаяла каплічка з абразам Маці Божай, зусім дзіўнае для дзіцяці збудаванне.

Была ў Косаве і царква, уверх па вуліцы, у цэнтры горада. Памятаю, што па нядзелях там было людна — кірмашовы дзень, а вось самой царквы не памятаю. Потым ужо разабраўся, што гэта далёка не лепшы ўзор мураўёўскай архітэктуры, але добра і тое, што яна была.

Што тут, каля Косава, у Марачоўшчыне нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, уведаў значна пазней. Невысокі пагорак, радок камянёў ад былога падмурка, невялічкае дрэўца – глог, чырвоны ягады, ужо напалову паабсыпаныя на зямлю. Ляжаць, нібыта кропелькі крыві. Асоба ўсясветнага маштабу – і твой зямляк.

А вось палац на горцы побач з Марачоўшчынай – казка дзяцінства. Ён зачароўваў сваім нязвыклым выглядам, таямнічасцю, закінутасцю, напаўразбуранасцю. Пабудаваў яго ў 1838 годзе беларускі шляхціч граф Войцэх Пуслоўскі. Дасталося палацу падчас першай сусветнай, а ў другую справу давяршылі савецкія партызаны – засталіся адны сцены. І чаго ён так ужо замінаў ім? Сядзібу Касцюшкі таксама спалілі.

Яшчэ больш маляўнічыя руіны ўяўляў сабою палац Сапегаў у Ружанах, не такіх далёкіх ад Косава. Там працавалі знаёмыя бацькоў. Лёс палаца аналагічны косаўскаму, дабіты дашчэнту быў у апошнюю вайну. І ўсё ж нават гэтыя руіны трымалі даўнюю веліч палаца, асабліва паўкруглыя аркады, што ўводзілі ў рытм нейкага ўрачыстага бальнага танца. З асобаю заснавальніка палаца, нашага знакамітага Льва Іванавіча Сапегі, я пазнаёмлюся знач-

на пазней, нават зраблю пра канцлера Вялікага княства Літоўскага дакументальны фільм.

Наогул з месцамі нараджэння мне пашанцавала. Кажу «месцамі», таму што з груднога ўзросту мы з братам кожнае лета, а то і ў іншы час, гадаваліся то ў адной бабы, то ў другой. Бацькі вучыліся завочна ва універсітэце і, прыкладам, на сесію ну аніяк не маглі ўзяць нас у Мінск. Мама мая родам з Мікалаеўшчыны, а тата – з вёскі Цякалаўшчына, што кіламетраў за чатырнаццаць ад Нясвіжа.

Так і атрымалася: Касцюшка – зямляк, найбліжэйшы зямляк і Якуб Колас. Мікалаеўцы патрыятычна лічаць, што нарадзіўся наш вялікі пясняр якраз тут, а не ў недалёкіх Акінчыцах, як прынята лічыць афіцыйна. Хоць гэта ўжо зусім не прынцыпова. Да таго ж і дзявочае прозвішча маці – Міцкевіч. Да Нясвіжа таксама каментар непатрэбны – пра Радзівілаў чулі ўсе.

У Мікалаеўшчыне на самым высокім пагорку над Нёманам, як тое і павінна быць, стаяла прыгожая драўляная царква. Ажно сем купалаў узлятала ў неба, царковішча было з мяккай зялёнай муравою і высокімі дрэвамі. Мая баба Маня, Марыя Антонаўна, спявала ў царкоўным хоры, брала мяне на набажэнствы. З таго засталося адчуванне спакою, цеплыні, дабрыні, лагоды. І гэта якраз — уражанне маленства да сямі гадоў, бо недзе напрыканцы 60-х камуністы царкву разбурылі. Ужо студэнтам-архітэктарам па просьбе бабы Мані я зрабіў малюнак царквы з фотаздымка, пяром і тушшу на даволі вялікім аркушы ватмана. Добрая памяць засталася, але малюнак знік у пажары, калі бабіна хата гарэла.

Хрысціў нас з братам малых святар той мікалаеўскай царквы. Баба клікала яго, адбывалася гэта дома, да таго ж і ў адсутнасць нашых бацькоў. Каб ніхто не ведаў. Думаю, што тата і мама сапраўды да пары не ведалі, а потым не гаварылі. Такі час. А мне баба Маня сказала, што я хрышчаны, бадай, ужо ў студэнцкія гады.

А Нясвіж! Суцэльныя знакі гісторыі, нібы трапляеш у іншы свет. Гандлёвыя рады з ратушай на плошчы, Слуцкая брама, фарны касцёл, нарэшце, сам замак Радзівілаў на выспе, абведзенай рукатворным непераходным ровам. Мост да ўязной брамы быў калісьці пад'ёмным. Старадаўні парк, які так і веяў рамантызмам, паэзіяй. Велізарныя штучныя вадаёмы наўкола

парка і палаца. Усё гэта, праўда, было ў даволі дагледжаным выглядзе.

А вось Мірскі замак стаяў напаўразбураным. Але затое веліч якая, магутнасць, грунтоўнасць. Адчувалася, што тут сапраўды можна схавацца ад ворагаў, абараніцца. Як хацелася лазіць па гэтых мурах, вежах! Зразумела, гісторыі сваёй айчыны мы ад дзяцінства не ведалі, але такімі вось знакамі сваімі ўваходзіла яна ў свядомасць і падсвядомасць, выклікала неакрэсленыя пачуцці, што людзі жылі на гэтай зямлі спрадвеку.

Але вернемся ў Косава. Там яшчэ паспеў нарадзіцца трэці сын у сям'і Марозаў, мой малодшы брат Коля. Летам 60-га мы пераехалі ў вёску Даманава таго ж Івацэвіцкага раёна. Тут я пайшоў у першы клас, тут жа правучыўся ўсе дзесяць гадоў. Бацька працаваў завучам у школе, мама настаўніцай. Жылі мы гадоў восем проста ў будынку школы, мелі два пакойчыкі і кухню. Таму можна сказаць, што я не толькі вучыўся, але і вырас у школе.

У Даманаве ў маё жыццё ўвайшла чыгунка, якая праходзіла метраў за сто ад школы. Пасля ціхага Косава, які месціўся крыху наўзбоч магістральных шляхоў, тыдні са два, а то і месяц заснуць на новым месцы было вельмі цяжка. Здавалася, што літаральна каля вуха грукочуць начныя цягнікі, што імчаць з Масквы некуды ў Еўропу. Станцыя была крыху воддаль, а каля школы ўздоўж чыгункі ішла рампа, дзе разгружалі розныя грузы. Былі моманты разгрузкі нечага незразумелага і ноччу. Салдаты ачаплялі прылеглую тэрыторыю, людзей не прапускалі. Стаяў грукат, раўлі маторы магутных ваенных машын. А ўсё было проста – разгружалі ядзерныя ракеты, а найчасцей паліва для іх, везлі потым па Дражэнскай дарозе ў лес, у Воўчыя Норы, дзе была адна са шматлікіх на Беларусі ядзерных баз. Радыяцыя з-за ўсяго гэтага ў Даманаве і ў бліжэйшых Каханове, Гнойным і Дабрынёве была павышаная. Але хто калі яе мераў? Вядома аб павышаным фоне стала толькі пасля Чарнобыля, тут знайшлі пляму. Нават і тады не сказалі, што катастрофа на атамнай станцыі да гэтай плямы адносінаў не мае.

Дзякаваць Богу, сёння гэтай ядзернай базы няма. Як няма іх і наогул у Беларусі, павывозілі ўсе ракеты ў Расію, ачысцілі нарэшце самую нашпігаваную ядзернай зброяй рэспубліку. Прытым маецца на ўвазе, што не толькі ў былым Саюзе, але і нідзе

ў Еўропе такой колькасці ракет, як у Беларусі, не было. Няхай гэтыя закінутыя цяпер базы назаўсёды застануцца знакамі былога.

З часам сталення чыгунка ўсё больш клікала ў шлях, вабіла абяцаннем новых краёў і зямель, новых уражанняў. Пасля ў жыцці хапіла дарог і вандровак, а зараз была проста вучоба ў школе, гульні, догляд самага малодшага брата Ігара, які нарадзіўся ў Даманаве.

Апроч чыгункі і ядзернай базы, іншых фармальных знакаў гісторыі ў вёсцы не было. Ды і саму гісторыю Беларусі ў школе практычна не вучылі. Аднак усё роўна яна не пакідала ў спакоі, нагадвала пра сябе часам незвычайным чынам. Школьнікамі ці не кожны год мы хадзілі на буракі, моркву ці бульбу на Пагоню. Чаму так называлася гэтае асушанае тарфяное балота, я тады не ведаў, не ведаў, што Пагоня – старажытны беларускі герб, але слова прыцягвала сваёй прыхаванай эмацыянальнай сілай, заваражвала. Пагоня!..

Пазней, ужо ў перабудовачныя часы, калі пачалі прадаваць дробнамаштабныя дакладныя ваенныя карты, я ўбачыў (карта «Слонім»), што балота Пагоня – вялізны абшар, які ідзе ад Даманава на паўднёвы ўсход да Выганаўскага возера. У другі бок, на паўночны захад і на захад ад Даманава – лес Літва. Так і напісана: «лес Літва». Стала ўсё зразумелым – гэта і ёсць паўднёвай мяжою той летапіснай Літвы, што была на нашай зямлі, і якую акрэсліў слынны гісторык Мікола Ермаловіч. Толькі яшчэ больш на поўдзень ад Слоніма. Што тычыцца ўласна майго Івацэвіцкага раёна, то яго ўмоўна дзеліць уяўная мяжа: тут – ліцьвіны, а тут – палешукі, пачатак Палесся. Прыслухайцеся, і сёння ёсць адбітак у гаворках.

Уся гэтая гісторыя з геаграфіяй яшчэ раз асабіста і мяне ўпэўніла, што старажытная Літва была тут практычна ў цэнтры беларускіх зямель, адсюль, ад ліцьвінаў, пачыналася Вялікае княства Літоўскае, наша старабеларуская дзяржава.

Апошнім, ужо свядомым, штуршком да выбару прафесійнага шляху пасля школы быў набор паштовак з выявамі помнікаў дойлідства. Нешта, як відаць з папярэдняга аповеду, я бачыў на свае вочы, астатняе толькі на гэтых картачках. Рамантызм занядбання, але разам з тым прыгажосці і велічы, нараджаў жаданне самому пабудаваць хоць калі такое ж прыгожае і каб на вякі. Я

вырашыў стаць архітэктарам. Напэўна, перадумовы для гэтага былі – я нядрэнна маляваў. З другога боку, з дзевятага класа я стаў весці дзённік, вольны запіс сваіх думак даваў мне вялікае задавальненне.

На жаль, тыя тры тоўстыя агульныя сшыткі школьных запісаў згарэлі з хатай у Мікалаеўшчыне, студэнтам я іх хаваў там. А як цікава было б сёння сустрэцца з сабою 16—17-ці гадовым!

Спрабаваў я пісаць і вершы. Для поўнай карціны засталося дадаць, што скончыў яшчэ і музычную школу ў Івацэвічах па класу баяна. А Даманаўскую дзесяцігодку закончыў з залатым медалём.

Зрэшты, планы мае так і спраўдзіліся – скончыў архітэктурны факультэт БПІ і стаў архітэктарам, працаваў у праектным інстытуце. Праўда, праз два гады паступіў на завочнае аддзяленне Літаратурнага інстытута ў Маскве, літаратура пакрысе перамагала. Таму на заканчэнне гэтага інстытута я ўжо працаваў рэдактарам Дзяржкіно БССР. Паваротак на кіно бачыўся на той час выпадковым, але сёння ўсё выглядае інакш, думаецца, што мая праца рэдактарам студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» (пасля Дзяржкіно) – заканамернае ўвасабленне ў кінавобразах тых знакаў гісторыі, што ўвайшлі ў свядомасць з дзяцінства. Перадусім маю тут на ўвазе аўтарскую работу – практычна ўсе мае сцэнарыі дакументальных фільмаў звернуты да гісторыі Беларусі. Ды і вершы ў большасці сваёй таксама неад'емныя ад гэтага. І цяпер, працуючы ў дзіцячым часопісе «Бярозка», я дзялюся сваім веданнем мінуўшчыны з юнымі і дарослымі чытачамі.

Паглядзіце наўкола – і вы самі знойдзеце шмат знакаў гісторыі, толькі трэба ўспомніць, што мы беларусы і адкрыць душу. І тады адчуеце непарыўную повязь падзей, часоў і людзей, тады адчуеце сапраўдную адказнасць за нашу дзяржаву, за мінулае і будучыню цудоўнага куточка зямлі, які завецца Беларуссю.

# ПОШУМ СТАГОДДЗЯЎ

## Ланцужок беларускай гісторыі

Сто гадоў, пяцьсот, тысяча... Для чалавека – прамежкі агромністыя. Для Бога, для гісторыі – імгненні. Усведамленне гэтага робіць усіх нас – папярэднікаў і наступнікаў – сучаснікамі. Праз такі погляд лягчэй зразумець, што мы не першыя на сваёй зямлі і не апошнія, што тут стагоддзямі жылі людзі, кахалі і нараджалі дзяцей, будавалі жытло, храмы і замкі, працавалі, ваявалі, у змаганні стваралі і мацавалі беларускую дзяржаву. Веданне мінуўшчыны, адчуванне непарыўнай повязі часоў і падзей, памкненняў людскіх дае чалавеку трывалы грунт яго існавання на зямлі, дазваляе ясна глядзець у будучыню. Гісторыя – наш бясцэнны духоўны скарб, які мы павінны зберагчы і перадаць нашчадкам.

Можна па рознаму расказваць пра гістарычны шлях бацькаўшчыны. Зазвычай трымаюцца перыядызацыі, звязанай з асноўнымі вехамі беларускай гісторыі. У гэтай кнізе мы ўзялі за адлік натуральны крутабег часу – стагоддзі. Найперш таму, што ўсім нам пашчасціла стаць сведкамі злому вякоў, у нечым усё ж з'явы містычнай. Здаецца, нічога знамянальнага не адбылося ў нашым асабістым жыцці і ў існаванні Беларусі. І ўсё ж – яшчэ адзін стогадовы адрэзак часу стаў гісторыяй. У невялікіх сціслых аповедах мы пройдземся шляхам беларускіх стагоддзяў, нагадаем славутыя імёны і найважнейшыя падзеі мінуўшчыны. Гэта будзе своеасаблівы ланцужок, дзе звенні – вякі беларускай гісторыі. Ці, калі хочаце, катэхізіс, тое неабходнае, што трэба ведаць, каб мець гонар называцца беларусам.

## X СТАГОДДЗЕ
# КАЛІ ПРЫПЛЫЛІ КРЫЖЫ...

Пачатак беларускай гісторыі хаваецца ў смузе стагоддзяў. Ведаем адно з летапісаў і хронік, што жылі на гэтай зямлі славянскія плямёны крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў ды тая, наша Літва, што Полацк упершыню згадваецца пад 862 годам, што бацька гарадоў беларускіх паўстаў на шляху «з варагаў у грэкі». І толькі X стагоддзе прыбівае да берага нашай самасвядомасці імя першага вядомага беларускага князя – Рагвалода. Акурат з таго часу мы вядзём адлік летапіснай нашай гісторыі, бо яна перастае быць безасабовай, асвятляецца славутымі імёнамі і падзеямі.

Рагвалод княжыў у Полацку, які на той час не саступаў Кіеву і Ноўгараду. Меў дачку – прыгажуню Рагнеду. Пасватаўся да яе ноўгародскі князь Уладзімір Святаславіч, але гордая князёўна адказала яму: «Не хачу разуці рабыніча, а Яраполка хачу». Справа ў тым, што Уладзімір нарадзіўся ад рабыні, быў пазашлюбным сынам кіеўскага князя. Яраполк жа, брат яго, княжыў у Кіеве. Дарага абышліся дзявочыя словы. Напаў Уладзімір на Полацк, забіў князя Рагвалода і двух яго сыноў, а Рагнеду гвалтам узяў за жонку. Пасля рушыў на Яраполка. Было тое ў 980 годзе.

Летапісная падзея сталася першай у шэрагу бясконцага змагання беларусаў за права на сваё існаваннне як нацыі. Наша гісторыя праз кроў Рагвалода і яго сыноў вельмі рана зрабілася трагедыяй. Сумная наканаванасць...

Рагнеда, жонка цяпер ужо кіеўскага князя Уладзіміра, нарадзіла першынца Ізяслава, потым яшчэ трох сыноў: Яраслава (Мудрага), Мсціслава, Усевалада. Але не магла забыць гордая палачанка свае крыўды — аднойчы спрабавала забіць Уладзіміра. Той у сваю чаргу схапіўся за меч, але малы Ізяслаў стаў на абарону маці. Тады князь кіеўскі аддаў сыну дзедзічнае Полацкае княства. Збудаваў горад, які так і назваў – Ізяслаўлем, і адправіў туды Рагнеду з сынам. «І з таго часу ўзнімаюць мячы Рагвалодавы ўнукі (полацкія князі) супраць Яраслававых унукаў (кіеўскіх князёў)» – гаворыцца ў летапісе. Барацьба за незалежнасць працягваецца.

Стаміўшыся ад жорсткасці свету, Рагнеда вырашыла прыняць манаства, стаць чарніцаю. Яна заснавала пад Ізяслаўлем

першы ва Усходняй Еўропе жаночы манастыр і пастрыглася пад імем Анастасія. Як сведчанне таго, што якраз адсюль пачало шырыцца хрысціянства на беларускіх землях, стаіць сёння ў Заслаўі на старажытным гарадзішчы «Замачак» каменны крыж, узведзены ў 1992 годзе ў гонар 1000-годдзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай царквы на Беларусі.

А вось каменныя крыжы, што зберагаюцца ў адзінай ацалелай царкве ў Тураве, – гэта знак нам адтуль, з далёкага Х стагоддзя. Згодна з паданнем, з'явіліся яны з Кіева па Дняпру і Прыпяці супраць плыні, паказваючы тым моц хрысціянства. Нялёгка ўсталёўвалася яно на нашых язычніцкіх землях. Тое ж паданне сведчыць, што вада ўскрывавела, калі крыжы спыніліся ля Турава. Яркая вобразная дэталь – паганства не здавалася без бою. Зрэшты, усё новае заўсёды сустракае супраціўленне. Ды і адкуль было зразумець тагачаснаму люду, што з хрысціянствам пачынаецца новы адлік палітычнага і культурнага жыцця? Быў у Тураве і калодзеж, у якім прыняў хрост легендарны князь Тур. Заснавальнік горада і Тураўскага княства, магчыма, брат Рагвалода – яшчэ адна вядомая нам гістарычная асоба з тых далёкіх часоў. Тураўскае княства, як і найперш княства Полацкае, – пачатак беларускай дзяржаўнасці.

Яна мацавалася і сынам Рагнеды, унукам Рагвалода Ізяславам, які княжыў у Полацку. У летапісах малады князь першым з усіх усходнеславянскіх валадароў ахарактарызаваны як кніжнік і асветнік: «Бысть жа сий князь тих и кроток, и смирен, и милостив, и любя зело и почитая священнический чин иноческий, и прилежаще прочитанию божественных писаний, и отвращался от суетных глумлений, и слезен, и умилен, и долготерпелив...». Памёр Ізяслаў у 1001 годзе, годам пазней сваёй маці. Праз яго аднавілася полацкая княская дынастыя, і Полаччына канчаткова сфармавалася як самастойнае княства. Галоўны вынік Х стагоддзя.

## XI СТАГОДДЗЕ
# ДАБРАВЕСТ ПОЛАЦКАЙ САФІІ

Пасля Ізяслава справу па адраджэнні былой моцы і славы Полацкай зямлі працягваў яго сын Брачыслаў. Княжыў ён у слаўным горадзе да сваёй смерці ў 1044 годзе. Няшмат звестак пра яго данеслі нам летапісы. Ведаем, што пэўны час («тры зімы») сядзеў Брачыслаў вялікім князем у Кіеве, там быў «двор Брачыслаўля», што ў 1021 годзе скарыў Ноўгарад. Праўда, потым быў разбіты Яраславам Мудрым на рацэ Судоме, але вынікі гэтай паразы сталі спрыяльнымі для Полаччыны: да княства адышлі гарады Віцебск і Усвяты. Тым самым вернутыя былі страчаныя крывіцкія землі і адначасова кантроль над гандлёвым шляхам «з варагаў у грэкі». Не абмінаў полацкі князь і заходні накірунак пашырэння сваёй зямлі. З мэтай пакарэння памежных балцкіх плямёнаў ім быў заснаваны горад Брачыслаўль (сучасны Браслаў).

І ўсё ж XI стагоддзе нашай гісторыі можна з поўным правам назваць векам Усяслава Чарадзея. І не толькі таму, што час княжання ў Полацку Брачыславава сына з 1044 па 1101 гады выключны па сваёй працягласці, а найперш таму, што Полацкая зямля пры ім мацавалася як самастойная дзяржава, не страціла незалежнасці ў барацьбе з Кіевам. Усяслаў быў незвычайнай асобай, у яго жыцці пераплялося белае і чорнае, бліскучыя ўзлёты межаваліся з трагічнымі падзеямі. Ён стаў героем не толькі летапісных звестак, але і народных былін, і неўміручага «Слова пра паход Ігаравы». З гэтых розных крыніц ярка паўстае рэальны і фантастычны вобраз Усяслава. Нават з'яўленне яго на свет ахутана арэолам таямнічасці, бо напісана, што нарадзіла яго маці ад «волхования». Калі Чарадзей, то ўжо з самага пачатку.

Першыя шаснаццаць гадоў княжання Усяслава прайшлі мірна, ён цалкам заняты сваёй дзяржавай. Найгалоўнаю справай стала будаўніцтва ў 1050—1055 гадах у Полацку Сафійскага сабора. Гэта быў не проста галоўны знак усталявання хрысціянства на беларускай зямлі, а найперш сімвал дзяржаўнай незалежнасці, знак роўнасці Полацка Кіеву і Ноўгараду, дзе такія саборы паўсталі ўжо. На адным з каменяў падмурка захаваліся надпісы з імёнамі муляраў храма: Давыд, Таўма, Мікула,

Капес. Тагачасны воблік сабора можна ўявіць толькі па рэканструкцыях, святыня некалькі разоў перабудоўвалася. Сёння яна ўпрыгожвае старадаўні Полацк як помнік беларускага барока XVII стагоддзя.

Але мірныя часы канчаюцца. Усяслаў у 1065 годзе нападае на Пскоў, а праз год ідзе на Ноўгарад, які захоплівае. Пасля рушыць на Наваградак, збудаваны ў 1044 годзе Яраславам Мудрым як сімвал уладарання Кіева над старадаўняй Літвой, тым самым разбівае «славу Яраславу». Тут і выступілі супраць Усяслава Яраславічы: Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад, так званы «трыумвірат». Яны пайшлі на Менск, паўднёвы фарпост Полаччыны, заснаваны Чарадзеем. Расправа была неміласэрнай – мужчын забілі, жанчын і дзяцей узялі ў палон, а горад спалілі. А потым адбылася бітва на Нямізе – самая жорсткая і крывавая ў даўняй нашай гісторыі. Аўтар «Слова пра паход Ігаравы» так напіша пра яе:

На Нямізе галовы сцелюць снапамі,
харалужнымі малоцяць цапамі,
жыццё кладуць на таку злюцела,
веюць душу ад цела.
Нямігі крывавыя берагі
не збожжам былі засеяны зноў –
засеяны косцьмі рускіх сыноў.

Пераможцаў у гэтай бітве не было. Яраславічы не маглі ўжо ісці на Полацк, прапанавалі мір Усяславу. Але потым пераступілі крыжацалаванне і ўвязнілі полацкага князя з сынамі ў Кіеве ў порубе. Палон гэты абярнуўся цудадзейным выратаваннем – Усяслаў сеў на кіеўскі прастол. Праўда, нядоўга правіў ён у Кіеве, усяго сем месяцаў, потым збег на радзіму ў Полацк.

Яму ў Полацку пазвоняць ютрань рана
ў званы ў святое Сафіі,
а ён той звон чуе ў Кіеве.

Наўрад ці можна знайсці больш яркі мастацкі вобраз, каб падкрэсліць патрыятызм Усяслава, яго адданасць роднай Полаччыне. Сапраўды, куды б потым не кідаў яго лёс, ён заўсёды вяртаўся ў свой родны горад, бараніў яго. Асабліва цяжкімі выдаліся 1077 і 1078 гады. Уладзімір Манамах з незлічоным войскам пустошыў полацкую зямлю, але самога горада ўзяць

так і не змог. Полацк выстаяў. Калі ў 1087 годзе ў Любечы быў скліканы з'езд князёў, Усяслава там не было. Красамоўны факт незалежнасці Полацкага княства. Выключнасць асобы Чарадзея падкрэслівае і летапіснае паведамленне пра яго смерць: «В лето 6609 (1101) преставися Всеслав, полоцкий князь, месяца априля, в 14 день, в 9 час дне, в среду». Такая дакладнасць не сустракаецца больш нідзе ў дачыненні да іншых князёў.

Акрамя паходаў і бітваў, XI стагоддзе – гэта яшчэ і час культуры. Адтуль першыя з вядомых на Беларусі кніг «Тураўскае Евангелле» і «Супрасльскі рукапіс». Евангелле захоўваецца ў Вільні, у бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. Калі трымаеш у руках гэтую кнігу, гартаеш празрыстыя пергаменныя старонкі з каляровымі застаўкамі і буквіцамі, міжволі прыходзіць адчуванне, быццам ты сам далучаешся душою да тых даўніх часоў.

XII СТАГОДДЗЕ
# КРЫЖ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

Той далёкі час уваходзіў у мяне праз вобраз Кірылы Тураўскага, калі пісаўся сцэнарый і вяліся здымкі дакументальнага фільма пра вялікага асветніка зямлі беларускай. У расійскай кніжнай скарбніцы – публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына – прынеслі нам пацягнутыя пылам часоў рукапісныя фаліянты XIII, XIV, XV, XVII стагоддзяў, дзе сярод іншых твораў змешчаны словы, прыпавесці, павучанні, малітвы вялікага тураўца. Старажытнае кірыліцкае пісьмо забірала ў мінуўшчыну, далучала да вытокаў духоўнасці. Слова Кірылы не страціла сваёй энергіі і сёння, бо пасля дзесяцігоддзяў бязбожнай савецкай улады нам зноў трэба шукаць дарогу да храма.

Кнігі тыя сведчаць пра талент Залатавуста, як назвалі яго яшчэ сучаснікі. Слаўны быў Кірыла Тураўскі не толькі творамі сваімі, але і дзеямі. Ён свядома стаў манахам, а пасля некаторы час наогул адышоў ад мітусні свету, зачыніўся ў стаўпе. Гэта ці не адзіны прыклад такой формы пустэльніцтва ў старажытнай Русі. Далей быў епіскапам тураўскім, клаў сілы на духоўнае ўмацаванне горада і княства. Некаторыя даследчыкі лічаць, што Кірыла мог быць аўтарам неўміручага «Слова пра паход Ігаравы», якое было напісана якраз у канцы XII стагоддзя, апошнія гады жыцця пісьменніка. Неўзабаве пасля смерці ён быў залічаны да ліку святых.

А ў старажытным Полацку ў той час шчыравала на ніве асветніцтва Еўфрасіння Полацкая, унучка легендарнага Усяслава Чарадзея. Яна не пакінула нам уласных твораў, як яе тураўскі суайчыннік, але справамі была не менш слаўная. Еўфрасіння дзяўчом (свецкае імя яе было Прадслава) пастрыглася ў манахіні і ўсё жыццё аддала служэнню Богу, людзям і краю. Яна сама перапісвала кнігі ў келлі Сафійскага сабора. Кідала зерне асветы, якое з часам дало ўраджай. Вялікая палачанка заснавала два жаночыя манастыры, а пры іх – школы. Спаскі існуе ў Полацку і сёння. А ў манастыры гэтым белаю свечкаю ўзнёсся Спаса-Прэабражэнскі храм, падобнага якому не было яшчэ ні ў полацкай зямлі, ні ўва ўсёй старажытнай Русі. Пабудаваў яго на замову Еўфрасінні дойлід Іаан.

Спаса-Еўфрасіннеўская царква амаль у першапачатковым выглядзе (у XIX стагоддзі толькі перабудаваны дах) захавалася да нашых дзён. Уваходзіш у сярэдзіну – і быццам трапляеш і ў тыя далёкія часы. Чатыры масіўныя, але стромкія калоны ў цэнтры трымаюць барабан купала. На іх гранях, а таксама на сценках – унікальныя фрэскі. Мяркуюць, што на адной з фрэсак выяўлены лік самой Еўфрасінні. За ўваходам направа – вузкая цёмная лесвіца, што вядзе як у іншасвет на хоры і да келлі-галубніцы. Тут найпадобнейшая аддавалася духоўнай працы. Толькі адзінае вузкае акенца злучала яе з навакольным светам. Магчыма, малілася яна на абраз Эфескай Маці Божай, напісаны, паводле падання, евангелістам Лукой. Гэты абраз прыслалі ў Полацак па яе просьбе візантыйскі імператар і патрыярх.

З імем Еўфрасінні звязана і найгалоўнейшая святыня зямлі беларускай – напрастольны крыж. Створаны ён быў полацкім ювелірам Лазарам Богшай з найвялікшым майстэрствам. Але каштоўнасць крыжа найперш не мастацкая, хоць гэта непаўторны шэдэўр, а духоўная, бо ў ім знаходзіліся хрысціянскія рэліквіі: кроплі крыві Ісуса Хрыста, кавалачак крыжа Гасподняга, каменьчыкі ад дамавіны Багародзіцы... Няпросты лёс святыні праз вякі, знік з Беларусі канчаткова крыж у апошнюю вайну. На схіле свайго жыцця Еўфрасіння зрабіла паломніцтва на Святую зямлю, дзе і скончыўся яе зямны шлях. Першая сярод жанчын далучана яна была да ліку святых. І сёння нябесная апякунка з тымі, хто кладзе свае сілы на адраджэнне бацькаўшчыны.

Светлыя постаці Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага даюць нам падставы назваць XII стагоддзе векам культуры, якая многія стагоддзі грунтавалася на каштоўнасцях хрысціянства. А было ж яшчэ і храмавае будаўніцтва. Акрамя Полацка, у часы Кірылы быў узведзены храм і ў Тураве, які, на жаль, не захаваўся. Дабравешчанская царква ўпрыгожыла Віцебск. У Навагрудку была пабудавана Барысаглебская царква, на падмурку якой у пачатку XVI стагоддзя ўзнік новы храм. Яшчэ адзін шэдэўр старабеларускай архітэктуры паўстаў у Гародні – Каложская царква, якая і сёння стаіць на высокім беразе Нёмана. Праўда, адна сцяна адкалолася і ссунулася пад адхон, але і тое, што ёсць, уражвае. Гэта найперш кладка сцяны, якая робіць храм непаўторным і ўнікальным. Паліваныя керамічныя крыжы і камяні

ў цаглянай муроўцы з'яўляюцца часткай архітэктурнай сімволікі. Бляск ад украпінак напаўняе мур таямнічым мігценнем. Калі дакранаешся рукою да камянёў, здаецца, адчуваеш цеплыню рук нашых таленавітых продкаў, што ўзводзілі гэты цудоўны храм.

З тых часоў згадаць трэба і Барысавы камяні – вялізныя валуны, помнікі эпіграфікі. Адзін з ацалелых ляжыць цяпер каля Сафійскага сабора. На ім высечаны шасціканцовы крыж і надпіс: «Господи помози рабу своему Борису».

Усе дасягненні культуры ў XII стагоддзі трэба бачыць на фоне палітычным. Несупынныя звадкі, бітвы, паходы неад'емныя ад таго часу. Працягвалася барацьба Полацка і Кіева. Сумнай падзеяй у нашай гісторыі стала расправа з Полаччынай і высылка ў 1129 годзе полацкіх князёў у Візантыю. Даставалася і Тураву. Напрыклад, у 1158 годзе ён 20 тыдняў (пяць месяцаў!) трымаў аблогу аб'яднаных сіл на чале з кіеўскім князем. Міжусобіцы не мінулі і ўдзелы Полацкай зямлі – паміж князямі вялася жорсткая барацьба. Асабліва вызначаўся Мінск у змаганні з Полацкам за верхавенства на беларускіх землях. Супраць звадак выступалі і Кірыла Тураўскі, і Еўфрасіння Полацкая, якая імем Бога забараняла князям брацца за зброю, накіроўвала іх на любоў і згоду. Нарэшце так і сталася. У 80-я гады XII стагоддзя пры княжанні Усяслава Васількавіча Полаччына прайшла пакуты міжусобіц, захавала сваю цэласнасць.

XIII СТАГОДДЗЕ

# ПАД КРЫЛОМ ПАГОНІ

Згадкамі пра пакручасты шлях гісторыі ў тым стагоддзі адразу паўстаюць велічныя руіны Навагрудскага замка. Здаецца, дзве напаўразбураныя вежы стаяць тут адвеку, яны маўкліва плывуць над наваколлем, нітуючы стагоддзі. Наваградак, старадаўні Новагародак, першая сталіца Вялікага княства Літоўскага, старабеларускай дзяржавы. Узыдзі на Замкавую гару, дакраніся рукою да ссівелых камянёў – і адчуеш сябе далучаным да хады гісторыі.

Падзеі, звязаныя з Наваградкам, разгортваюцца бліжэй да сярэдзіны веку. На пачатку яго больш звестак сустракаецца ў летапісах пра Полацкае княства, дзе 30 гадоў на зломе стагоддзяў валадарыў князь Уладзімір (1186 – 1216 гады). Ён, як і князі Вячка з Кукейноса і Усевалад з Герцыке (гэтыя гарады былі асяродкамі полацкай каланізацыі па Заходняй Дзвіне), не адразу адчулі, якая бяда пастукалася ў дзверы іхняга дома. А бядою той сталася з'яўленне ў Лівоніі ордэна мечаносцаў, які на словах меў мэтай хрышчэнне язычнікаў, а на справе вёў захопніцкую палітыку. Сапраўды — з крыжам прыйшоў меч. З таго часу больш чым на два стагоддзі крыжакі сталі самымі небяспечнымі ворагамі нашых продкаў. Страцілі палачане Герцыке і Кукейнос, сам Уладзімір быў атручаны крыжацкімі шпегамі напярэдадні паходу супраць Ордэна.

А з поўдня існавала іншая пагроза, у 30—40-х гадах XIII стагоддзя адбылося нашэсце мангола-татараў на Русь. Войска хана Батыя заваявала Уладзіміра-Суздальскую Русь (Залессе), зруйнавала Украіну і Польшу і дайшло ажно да Чэхіі. Беларусь жа заставалася незалежнай, чыстай (белай), хоць татары пазней не раз нападалі і на яе. У такіх умовах, каб супрацьстаяць агрэсіі з розных бакоў, патрэбна было яднацца, умацоўваць дзяржаўнасць. Гэты працэс пайшоў з узвышэннем Новагародка, калі ў 40-я гады новагародцы запрасілі да сябе на княжанне літоўскага князя Міндоўга, які павінен быў «прывесці» з сабою і Літву.

Тут трэба яшчэ раз адзначыць, што старажытная летапісная Літва была гістарычнай вобласцю Беларусі. Яна ўрэзвалася клінам паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Новагародскай зем-

лямі, яе паўночная мяжа праходзіла пад Маладзечна, а паўднёвая сягала ажно да Палесся. Гэта адбілася ў назвах леса Літва і балота Пагоня, якія і сёння ёсць у Слонімскім і Івацэвіцкім раёнах. Навагародскі князь Міндоўг «прывёў» гэтую Літву («Литву зане»), яна і дала назву Вялікаму княству Літоўскаму са сталіцай у Новагародку. Сам вялікі князь 6 ліпеня 1253 года быў каранаваны як кароль.

Станаўленне дзяржавы выклікала непрыняцце крыжакоў і галіцка-валынскіх князёў, якія неаднаразова клікалі на падмогу татараў. Як прыклад – легендарная бітва Міндоўга з татарамі ля Крутагор'я, дзе ён разбіў хана Койдана. Так і стала гэтае мястэчка называцца Койданавым (цяпер Дзяржынск). Няпросты лёс быў у Міндоўга – перад княжаннем ён прыняў праваслаўе, потым, каб заручыцца падтрымкай Ордэна, перахрысціўся ў каталіцтва, а на схіле жыцця зноў стаў язычнікам. Загінуў жа вялікі князь ад рук свайго любімага пляменніка, а пасля ворага Траняты.

Новагародак з Міндоўгам былі пачынальнікамі. Па-сапраўднаму ж заснавальнікам Вялікага княства Літоўскага стаў ягоны сын Войшалк – мудры палітык, воін, адначасова і манах, які заснаваў Лаўрышаўскі манастыр пад Новагародкам. Ён здолеў аб'яднаць Новагародскую, Літоўскую, Нальшчанскую землі і Дзяволтву ў адзіную дзяржаву. Пад яго воляю сталі і Полацкая ды Турава-Пінская землі. Так пачынаў стварацца, у супрацьвагу суседзям, моцны цэнтр аб'яднання ўсходніх славян.

Войшалк таксама памёр не сваёй смерцю – быў забіты галіцка-валынскім князем Львом Данілавічам. Забіты былымі слугамі Міндоўга і Транята, якому вельмі нядоўга ўдалося пабыць вялікім князем. Невялікі час з перапынкамі былі князямі ў Навагрудку Раман і Шварн Данілавічы. Затым 12 гадоў княжыў у Літве Тройдзень. Пры ім пачалося на Беларусі будаўніцтва замкаў як сістэмы абароны Вялікага княства ад варожых нашэсцяў. Першая мураваная вежа, узведзеная ў сталіцы княства, называлася Шчытоўка ці Шчытавая. Так, якраз руіны гэтай вежы вы можаце ўбачыць на свае вочы ў Навагрудку, яна адтуль, з тых часоў. Як адтуль і знакаміты Камянецкі стоўп, што паўстаў фарпостам на заходніх межах.

Паколькі гістарычных звестак пра першых вялікіх ліцвінскіх князёў захавалася не так і шмат, яны больш падоб-

ныя на міфічных герояў-волатаў, перамогі якіх непазбежныя. Хоць ў сапраўднасці ўсё складвалася больш складана і жорстка. У гэтым шэрагу і князь Віцень, які ўладарыў у Вялікім княстве Літоўскім на зломе XIII і XIV стагоддзяў. Яго княжанне прайшло ў войнах з польскімі і жамойцкімі феадаламі, з прускімі і лівонскімі рыцарамі. Маладая дзяржава выстаяла – мацавалася, шырылася. І гэта быў галоўны вынік таго далёкага стагоддзя.

З князем Віценем (якое прыгожае славянскае імя!) звязана і Пагоня як адзін з галоўных атрыбутаў старажытнай беларуска-ліцвінскай дзяржавы. Вось радкі з Густынскага летапісу: «А Витен нача княжити над Литвою, измысли себе герб и всему княству Литовскому печать: рыцар збройны на коне з мечем, еже ныне наричут погоня». Ёсць шмат тлумачэнняў паходжання і сэнсу гэтага сімвала, але галоўнае тут зразумела. Само слова «пагоня» ёсць адбітак старажытнай ліцвінскай традыцыі – выгнанне ворага, калі ў пагоню за ім «адпраўляюцца не толькі рыцары, але і ўсякі мужчына, якога ён ні быў бы паходжання або стану, толькі б ён насіў зброю». Дык памятайма традыцыі продкаў!

XIV СТАГОДДЗЕ
# ВІЛЕНСКІ ШЛЯХ

Сучаснікі называлі Беларусь краінай замкаў. Гэтае вызначэнне найперш адтуль, з XIV стагоддзя. Мэта ўсё тая ж – абараніцца ад крыжакоў. Дабудаваны замак у Наваградку, паўставалі замкі па лініі Трокі – Вільня – Меднікі – Гародня – Ліда – Крэва. Апошні быў першым цалкам мураваным замкам у Вялікім княстве. І сёння жыве ў народзе праклён: «Каб ты на Крэўскі замак каменне цягаў!» Варта ўявіць, колькі высілкаў каштавалі нашым продкам такія спаруды, якім будаўнічым майстэрствам яны валодалі! Рэшткі гэтай велічы можна і сёння ўбачыць у ціхім цяпер мястэчку.

Крыжакі не давалі спакою нашым продкам на працягу некалькіх стагоддзяў. Асабліва вызначыўся ў барацьбе з імі Давыд Гарадзенскі. Неаднаразова адбіваў ён напады крыжакоў на сваю зямлю, замак у Гародні так і застаўся для ворага непрыступным. Хадзіў і сам Давыд на Прусію, наводзіў жах на Тэўтонскі ордэн. І толькі здрадніцкім забойствам змаглі крыжакі пазбавіцца ад князя Давыда. Было тое ў 1326 годзе.

Усё XIV стагоддзе пазначана ў нашай гісторыі славутымі імёнамі. Найперш трэба згадаць вялікіх князёў літоўскіх, што мацавалі і шырылі сваю дзяржаву. Гедзіміну, які стаў княжыць пасля Віценя, дасталося ў спадчыну Вялікае княства – Літва, Наваградчына, Аўкштайція, Нальшчаны, Полаччына. За гады яго валадарства ў склад ВКЛ увайшлі Віцебская, Менская, Турава-Пінская землі, Падляшша з Бярэсцем. Гэтае аб'яднанне адбылося мірна, заснаванае на прынцыпе «старыны не рушыць». Захоўваліся аўтаномія і непадзельнасць тэрыторыі, мясцовыя законы. Такое пашырэнне канчаткова акрэсліла беларускую аснову дзяржавы, бо нашы землі з'яўляліся яе цэнтрам. Толькі сумесна можна было выстаяць супраць агрэсіі крыжакоў, барацьба з якімі ішла з пераменлівым поспехам.

Пры Гедзіміне скончыўся Новагародскі перыяд нашай гісторыі. Сталіцу княства ён перанёс у Вільню, ужо ў 1323 годзе горад згадваецца як каралеўскі. Вялікі князь будуе замак на Крывой гары, вежа Гедзіміна і сёння – галоўны сімвал Вільні. Адзначым, што Крыў-горад ці Крывіч-горад як удзел Полацкага княства існаваў ужо ў XI-XII стагоддзях. Старая назва

Вільні сведчыць, што заснавана яна крывічамі, была фарпостам каланізацыі славянамі балцкіх зямель. Акурат каб паскорыць працэс гэтай каланізацыі, Гедзімін і пераносіць сюды сваю сталіцу. «Адна дзяржава – адзін народ» – такі прынцып спавядаў ён. Так на многія стагоддзі Вільня стала цэнтрам усходнеславянскіх зямель. Другім цэнтрам у гэты ж час станавілася і Масква, якая таксама вяла палітыку аб'яднання ўсходніх славян.

Вялікі князь стаў заснавальнікам дынастыі Гедзімінавічаў, меў сем сыноў. Найвялікшую ролю з іх адыграў Альгерд, які княжыў у Вялікім княстве з 1345 па 1377 гады. Ён вёў палітыку на канчатковае аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель у адзінай дзяржаве. Да ВКЛ далучана Чарнігаўска-Северскае княства, у палітычнай залежнасці апынулася княства Смаленскае. Пасля знакамітай перамогі Альгерда над Залатой Ардой каля ракі Сінія Воды ў склад ВКЛ увайшлі Падолле, Кіеўскае княства, потым Валынь. Тэрыторыя павялічылася больш чым у два разы, беларускія землі займалі цэнтральнае месца ў дзяржаве. Ажно тры разы хадзіў Альгерд і на Маскву («кап'ё літоўскае стаяла пад Масквой»), жадаючы сцвердзіць вядучую ролю Вялікага княства ў аб'яднанні ўсходнеславянскіх зямель. Праз усе гады княжання змагаўся і з крыжакамі.

З'явіліся пры Альгердзе першыя на Беларусі пакутнікі за праваслаўную веру. Гэта былі прыдворныя вяльможы вялікага князя, славяне Кумец, Няжыла, Круглец – у хрышчэнні Іаан, Антоній і Яўстафій. Альгерд вымушаны быў лічыцца з яшчэ моцным паганствам на сваіх землях і аддаў хрысціянаў на смерць. Тры віленскія пакутнікі лічыліся нябеснымі заступнікамі праваслаўных Вялікага княства Літоўскага на працягу ўсяго яго існавання. Святыя шануюцца вернікамі і сёння.

Пасля Альгерда вялікім князем стаў яго сын Ягайла. Трэба было шукаць саюзнікаў, каб выстаяць у змаганні з Крыжацкім ордэнам. Гэта – галоўная прычына таго, што ў 1385 годзе Ягайла пагаджаецца на унію (саюз) з Польшай і становіцца каралём Польскім, заснавальнікам дынастыі Ягелонаў. Не ўсім у Вялікім княстве падабалася гэтая унія, Ягайлава змаганне за ўладу вылілася ў міжусобныя звадкі. Яшчэ ў 1382 годзе ў Крэўскім замку па яго загаду быў забіты родны дзядзька Кейстут. Такі ж лёс чакаў і сына Кейстута Вітаўта, але таму ўдалося ўцячы.

Падпісанне уніі, забойства Кейстута, звязненне ды ўцёкі Вітаўта – усё гэта зрабіла Крэўскі замак сімвалам таго далёкага XIV стагоддзя. Прыедзьце сюды, пастойце каля руінаў велічнага замка, яго напаўразбуранай вежы – і вы далучыцеся да самой гісторыі.

З XIV стагоддзя абавязкова трэба памятаць пра ўдзел у Кулікоўскай бітве старэйшага брата Ягайлы Андрэя Полацкага, які з ліцвінскімі дружынамі фактычна вырашыў зыход бітвы. Андрэй сам прэтэндаваў на вялікакняскі пасад, але адолець Ягайлу яму не ўдалося. Таму стаў на бок Вітаўта, які і вымусіў стрыечнага брата адмовіцца ад прэтэнзій на Вялікае княства і сам у 1392 годзе стаў вялікім князем літоўскім.

Вітаўт – слаўнае імя ў нашай гісторыі. Асноўныя яго дзеі будуць ужо ў наступным, XV стагоддзі. Але яшчэ напрыканцы папярэдняга Вітаўт са сваімі дружынамі дайшоў да Чорнага мора. Адплыў ад берага паўмілі і засведчыў тым, што ўжо і Чорнае мора належыць ВКЛ. Вось так, ад мора да мора мела абсяг Вялікае княства Літоўскае і Рускае. Тады ж, у канцы XIV, напаткала Вітаўта і вялікая трагедыя – параза ад татараў на рацэ Ворскле, дзе сярод вояў і князёў ліцвінскіх загінуў і Андрэй Полацкі.

Памятаць варта, што ў 1384 годзе герб «Пагоня» стаў гербам Вялікага княства. Развівалася яно ў агульнаеўрапейскім рэчышчы, аб чым сведчыць наданне ў 1387 годзе Вільні, а ў 1390 годзе Бярэсцю Магдэбургскага права – гарадскога самакіравання, якое практыкавалася ў Еўропе. З'явіліся ў ВКЛ і свае грошы – у Вільні пачаў дзейнічаць манетны двор.

XV СТАГОДДЗЕ

# РЭХА ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЫ

На Грунвальдскае поле ў свой час я трапіў позняй восенню. Турысцкі сезон скончыўся, нішто не замінала спакойна агледзецца, засяродзіцца. Было даволі золка, на гары, дзе месціцца мемарыял, дзьмулі вятры, ганяючы хмары па небе. Магчыма, якраз гэты несупынны рух цёмных хмар і даваў адчуванне надчасавасці, далучанасці да вялікай падзеі мінуўшчыны. Само поле бітвы, недалёка курганы Ягайлы і Вітаўта, адкуль яны кіравалі сваімі шыхтамі.

Пад Дуброўна – такая славянская назва Грунвальда – зніклі слава і магутнасць Тэўтонскага ордэна, самага небяспечнага ворага славян на працягу двух стагоддзяў. Біліся з крыжакамі аб'яднаныя войскі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. З 91 харугвы 40 было з беларускага боку. Вёў іх у бой слаўны Вітаўт. Уласна, ліцвіны першымі і пачалі сечу, у паветры гучаў баявы кліч вояў Вялікага княства «Вільня!». Нашы продкі фактычна вырашылі і канец бітвы, калі пасля ўдалых манеўраў нанеслі апошні ўдар. Варта памятаць слаўную дату – 15 ліпеня 1410 года. Грунвальдская бітва, адна з найвялікшых бітв еўрапейскага Сярэднявечча, – самая важная падзея ў нашай гісторыі з далёкага XV стагоддзя. Вялікую дапамогу ў перамозе аказалі смаленцы і татарская конніца.

Вітаўт валадарыў у Вялікім княстве Літоўскім да самай сваёй смерці ў 1430 годзе. Выдатны гэта быў князь – яго паважалі суседзі, яго баяліся ворагі, княства пры ім цвёрда трымала сваю тэрыторыю і незалежнасць. У панегірычным творы «Пахвала вялікаму князю Вітаўту», напісаным у 20-я гады XV стагоддзя, ёсць такія словы: «Але немагчыма ні расказаць, ні апісаць справы вялікага князя Вітаўта. Каб было магчыма спасцігнуць вышыню неба і глыбіню мора, то можна было б выказаць сілу і храбрасць гэтага слаўнага гаспадара». Аднаго не хапала князю – каралеўскай кароны. Імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Жыгімонт паслаў ужо выробленую карону да Вітаўта, але польскія кіруючыя колы так і не дапусцілі, каб Вялікае княства стала каралеўствам.

Уласна, усё XV стагоддзе прайшло пад знакам змагання нашых продкаў-ліцвінаў за сваю незалежнасць ад Польшчы.

Цвёрда трымаў яе Свідрыгайла, малодшы сын Альгерда, брат караля польскага Ягайлы, які стаў вялікім князем пасля Вітаўта. Ды нядоўга давялося яму княжыць – у 1432 годзе ў выніку змовы супраць Свідрыгайлы вялікім князем становіцца брат Вітаўта Жыгімонт Кейстутавіч. Але і Альгердавіч канчаткова не страціў улады. У той час у гісторыі старабеларускага гаспадарства быў унікальны момант, калі яно падзялілася на княства літоўскае Жыгімонта (землі Заходняй Беларусі) і княства рускае (Усходняя Беларусь), якое трымаў за сабой Свідрыгайла. Каб здабыць поўную ўладу, біліся між сабою. Перамог Жыгімонт Кейстутавіч, але і ён быў забіты ў выніку змовы незадаволеных ім паноў рады ў Троцкім замку ў 1440 годзе.

З гэтага часу больш 50-ці гадоў Вялікім княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім (Жамойція, ці Жмудзь, асноўная тэрыторыя сучаснай Літвы, ужо канчаткова далучана да ВКЛ) кіраваў сын Ягайлы Казімір. Абраны ён быў на княства юнаком, у 14-гадовым узросце. У 1447 годзе Казімір Ягелончык становіцца яшчэ і каралём польскім, тым самым аднаўляецца персанальная унія Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Але нашы продкі цвёрда трымаліся незалежнасці. Казімір увесь час валадарання знаходзіўся між двух агнёў: як кароль польскі вымушаны быў абараняць інтарэсы Польшчы, як вялікі князь – ліцвінскія. А інтарэсы гэтыя былі якраз супрацьлеглыя. Нават змова была вяльможаў княства, каб скінуць Казіміра, але няўдалая. Раўнавага ўсё ж захоўвалася. Адзінае, што з-за міжусобных звадак Казімір адмовіўся ад наступальнай палітыкі ў адносінах да Масквы, каб не ўзвышалася, чаго не хацелі палякі, Вялікае княства Літоўскае. Наступствы такога падыходу мелі потым вырашальныя вынікі для старабеларускага гаспадарства, бо суседнія правіцелі ўмацоўваліся, далучалі да сваіх уладанняў новыя землі. Рукі ў маскоўскага князя Васіля канчаткова развязаліся ў 1480 годзе, калі Маскоўская Русь поўнасцю вызвалілася ад мангола-татарскага іга.

І хоць межы Вялікага княства за Казімірам Ягелончыкам засталіся непарушнымі, бяда ўжо стаяла ля парога. Пасля смерці Казіміра вялікім князем стаў адзін з яго шматлікіх (у шчаслівага бацькі было 6 сыноў і 7 дачок!) сыноў – Аляксандр. Здарылася гэта ў 1492 годзе. І адразу ж усходнія суседзі заваявалі некаторыя землі, падуладныя ВКЛ: былі страчаныя Вя-

земскае княства і вярхоўскія княствы (у вярхоўях ракі Акі). Гэта стала толькі пачаткам адпаведных прэтэнзій на ўсе ўсходнеславянскія землі. Не дапамог і шлюб Аляксандра з маскоўскай князёўнай Аленай Іванаўнай, дачкой Івана III. Ужо ў 1500 годзе пачалася новая вайна, на рацэ Ведрашы каля Дарагабужа маскоўскае войска разбіла раць ВКЛ, у палон трапіў літоўскі гетман Канстанцін Астрожскі. А з поўдня Бярэсце і Камянец аблажылі крымскія татары.

Не толькі палітычнай гісторыяй адметнае XV стагоддзе. Жыццё ішло сваёю хадой. Атрымалі магдэбургскае права Слуцак, Гародня, Полацак, Менск, Браслаў. У 70-х гадах пабудаваны касцёл у Ішкальдзі (цяпер Баранавіцкі раён), першы мураваны каталіцкі храм на Беларусі. Гэты помнік готыкі і сёння радуе вока гарманічнасцю сваіх формаў. Напрыканцы веку паўстала Сынковіцкая царква абарончага тыпу, адметны уклад беларускіх дойлідаў у архітэктурную скарбонку Еўропы. Шчаслівыя мы, што цудоўны помнік захаваўся. У 1468 годзе Казімірам выдадзены на старабеларускай мове «Судзебнік» – першы збор законаў. Праваслаўная царква працяглы час была незалежнай ад маскоўскага мітрапаліта, падпарадкоўвалася непасрэдна канстанцінопальскаму патрыярху.

У старабеларускім гаспадарстве склалася сваё летапісанне. Гэта «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», дзе ёсць згаданая «Пахвала Вітаўту», беларуска-літоўскі летапіс, Радзівілаўскі летапіс, летапіс Аўрамкі, «Гісторыя Польшчы» Я. Длугаша, дзе шмат старонак прысвечана і нашай гісторыі. Важнейшыя помнікі, з якіх мы чэрпаем веды па мінуўшчыне.

У пісьмовых крыніцах у 1494 годзе ўпершыню згадваецца Косава, горад, дзе я нарадзіўся. А ці задумваліся, цікавіліся вы, колькі гадоў, стагоддзяў існуе ваша вёска, пасёлак, горад?

XVI СТАГОДДЗЕ

# ЗОЛАТА СОНЦА МАЛАДЗІКОВАГА

Стагоддзе ўяўляецца мне літаральна набрынялым падзеямі, датамі, асобамі. Гэта сапраўды залаты век старабеларускага гаспадарства – Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Адно імя Францішка Скарыны з слаўнага горада Полацка робіць нам вялікі гонар. Першадрукар, вучоны, асветнік, у навуках лекарскіх доктар, ён паклаў свае творчыя сілы на алтар служэння айчыне і людзям простым. 6 жніўня 1517 года ў Празе выйшла з друку першая кніга перакладу Бібліі, што стала пачаткам беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Усяго да 1519 года Скарынам былі выдадзены 23 кнігі Старога Запавету. Раней за пераклад Скарыны ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе выйшла толькі чэшская Біблія (1488 г.). У суседняй Масковіі першая друкаваная кніга з'явілася ў 1564 годзе. Гэта «Апостал», выдадзены нашымі землякамі Іванам Федаровічам (Фёдаравым) і Пятром Мсціслаўцам.

Пасля Прагі Скарына стварыў друкарню ў Вільні, нашай тагачаснай сталіцы. У 1522 годзе там выходзіць «Малая падарожная кніжыца», а праз тры гады «Апостал». Тады ж, у пачатку 20-х, Скарынаў сучаснік і суайчыннік Мікола Гусоўскі напісаў сваю знакамітую паэму «Песня пра зубра» – гімн прыгажосці роднай зямлі. Твор быў выдадзены ў Кракаве ў 1523 годзе. З іншых выданняў варта адзначыць «Катэхізіс» асветніка і тэолага Сымона Буднага, выдрукаваны ў Нясвіжскай друкарні на старабеларускай мове ў 1562 годзе, а таксама «Евангелле» Васіля Цяпінскага (1580 г.). Акрамя Вільні, друкарні існавалі ў Бярэсці, Нясвіжы, Лоску, Любчы, Заблудаве. Працягвалася беларускае летапісанне – у 20-я гады створана Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага, пазней – Хроніка Быхаўца, Баркулабаўская хроніка.

Як і раней, так і ў XVI стагоддзі не абыходзілі нашы землі войны. У 1506 годзе беларускае войска пад зверхнасцю Міхаіла Глінскага пад Клецкам ушчэнт разбіла татараў, пасля гэтага буйныя напады качэўнікаў на Беларусь фактычна спыніліся. Але працягваліся войны з суседняй мацнеючай Масковіяй. 1506–1508 гг., 1512–1522 гг., 1534–1537 гг., нарэшце Лівонская (Інфлянцкая) вайна 1558–1583 гадоў, якую вёў маскоўскі цар

Іван Жахлівы, — самая спустошальная для Беларусі. Той, ініцыятар, беспадстаўна лічыў усе ўсходнеславянскія землі сваёй вотчынай. Нашы продкі годна баранілі межы Айчыны. Як, скажам, у бітве пад Оршай 8 верасня 1514 года, калі 35-ці тысячнае войска пад зверхнасцю гетмана найвышэйшага Канстанціна Астрожскага разграміла 80-ці тысячнае войска суседніх ваяводаў. Ці згадаць вызваленчыя паходы 1579—1581 гадоў Стэфана Баторыя, мабыць, самага мужнага і ваяўнічага вялікага князя літоўскага і караля польскага. У 1579 годзе ён вызваліў Полацк, які амаль 17 гадоў быў пад уладаю цара, разрабаваны і спустошаны. За гэты час, па сведчаннях пісьмовых крыніц, дзе каля горада былі нівы, там вырас лес. Усе войны заканчваліся перамір'ем ці нават «вечным мірам», але гэты мір кожны раз трываў нядоўга.

Першыя тры абарончыя войны прыпалі на час уладарання ў старабеларускай дзяржаве Жыгімонта I Старога (1506—1548 гг.), які як кароль польскі і вялікі князь літоўскі вымушаны быў бараніць інтарэсы і адной, і другой краіны. Тым не менш, палітычнае збліжэнне Польшчы і Вялікага княства ішло сваім ходам. І завяршылася яно ў час княжання (1548—1572 гг.) Жыгімонта II Аўгуста, апошняга з дынастыі Ягелонаў, Люблінскай уніяй 1569 года. Да гэтага, нягледзячы на фактычную перснальную унію з часоў Ягайлы, Вялікае княства Літоўскае захоўвала сваю незалежнасць ад Польшчы, хоць дзесяць разоў пасля Крэўскай уніі пытанне больш цеснага аб'яднання двух дзяржаў замацоўвалася ў розных пагадненнях.

Але ў 60-я гады XVI стагоддзя польскі сацыяльны і палітычны ўплыў ды агрэсіўны націск з усходу вымусілі пайсці на трывалае збліжэнне, паставілі ў безвыходнае становішча беларускіх магнатаў і шляхту. Згодна з Люблінскай уніяй ствараласся федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая (Польшча і ВКЛ), дзе караля і вялікага князя выбірала шляхта абодвух народаў, дзе існаваў агульны сойм. Але суверэнітэт захоўваўся, кожная дзяржава мела сваю адміністрацыю, войска, скарб, грошы, суды, законы, дзяржаўную мову, якой у Вялікім княстве Літоўскім была беларуская.

Паабяцаў захоўваць самастойнасць княства Стэфан Баторый, які падчас кіравання (1575—1586гг.) сваёю рэзідэнцыяй абраў Гародню. Пры ім быў утвораны Галоўны літоўскі трыбунал – найвышэйшы судовы орган. Зацвердзіў сваім прывілеем Ста-

тут Вялікага княства Літоўскага 1588 года новы кароль і вялікі князь Жыгімонт III Ваза. А там наўпрост сказана, што замежнікам (у тым ліку і палякам) не дазваляецца займаць службовыя пасады ў ВКЛ. Заўважым, што гэта быў трэці Статут, першыя два прынятыя ў 1529 і 1566 гадах. Статут 1588 года, падрыхтаваны канцлерам Астафіем Валовічам і тады яшчэ падканцлерам Львом Сапегам, які напісаў выдатную прадмову, з'яўляецца выключным помнікам беларускага пісьменства і юрыдычнай думкі. Гэта адзін з першых такіх поўных збораў законаў у Еўропе. І дзейнічаў ён на Беларусі ажно да 1840 года.

У Статуце роля беларускай мовы як дзяржаўнай замацавана заканадаўча: «А писар земский маеть по-руску литерами и словы рускими вси листы, выписы и позвы писати, а не иншым езыком и словы». Тут жа знаходзім пералік ваяводстваў і паветаў ВКЛ на той час. Дык вось, з 22-х тэрытарыяльных адзінак 18 беларускіх: Вільня, Ашмяны, Ліда, Браслаў, Трокі, Гародня, Полацк, Навагародак, Ваўкавыск, Слонім, Віцебск, Орша, Бярэсце, Пінск, Мсціслаў, Менск, Мазыр, Рэчыца. Яскравае сведчанне беларускага характару Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, дзе першыя два складнікі (ліцвіны і русіны) адносіліся да сучаснай Беларусі, і толькі апошні (жамойцкае) – да сучаснай Летувы.

Кнігадрукаванне, летапісанне, законы... Культурныя здабыткі старабеларускага гаспадарства эпохі Адраджэння гэтым не вычэрпваюцца. Пабудавана царква абарончага тыпу ў Маламажэйкаве. Як і падобныя храмы ў Сынковічах і Супраслі – гэта сапраўдныя перліны нашага дойлідства. Тады ж, на пачатку стагоддзя, паўстаў замак у Міры, які і сёння сваім адметным выглядам далучае нас да тых далёкіх часоў. Як і Нясвіжскі замак, рэканструяваны ў 80-х гадах у палаца-замкавы комплекс славутым італьянскім архітэктарам Янам Марыяй Бернардоні. Паводле яго праекту пабудаваны ў Нясвіжы і цудоўны фарны касцёл. У 1541 годзе створаны паляўнічы заказнік Белавежская пушча – першы на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. На Беларусі пачалі дзейнічаць першыя бібліятэкі – у Полацку, Слуцку, Менску, Магілёве.

Шырылася адукацыя. У 1570 годзе ў Вільні заснаваны іезуіцкі калегіум, які потым рэарганізаваны ў акадэмію. У 1579 годзе прывілеем Стэфана Баторыя з яе паўстаў Віленскі уні-

версітэт – першы ва Усходняй Еўропе. Іезуіцкія калегіумы былі заснаваны таксама ў Полацку, Нясвіжы, потым у Бабруйску, Бярэсці, Менску, Гародні ды іншых гарадах. Неслі асвету і арыянскія (рэфармацкія) школы – у Іўі (акадэмія), Клецку, Любчы, Нясвіжы, Наваградку. У канцы стагоддзя сталі працаваць школы новастворанных праваслаўных брацтваў – у Менску, Магілёве, Вільні, Бярэсці, Гародні.

З апошняга асабліва яскрава відаць шматканфесійнасць старабеларускага гаспадарства, бо кожная хрысціянская плынь праз свае школы змагалася за вернікаў. Рэфармацыя, якая прыйшла з Заходняй Еўропы на Беларусь яшчэ пры жыцці яе заснавальнікаў і ідэолагаў Лютэра і Кальвіна, шырока падтрымлівалася беларускімі магнатамі, найперш Радзівіламі. Але потым пратэстанцкі рух пайшоў на спад пад контррэфармацыйным уціскам баявога атрада каталіцызму – іезуітаў. Варожым пратэстантызм быў і для праваслаўнай царквы, якая перажывала не лепшыя часы. Трэба было неяк уладкаваць царкоўныя справы ў дзяржаве, таму ў 1596 годзе ў Бярэсці прымаецца царкоўная унія, сутнасць якой была ў тым, што праваслаўныя іерархі Вялікага княства прызнавалі зверхнасць Папы Рымскага, але ўсходнія абрады ў набажэнствах захоўваліся. Магчыма, гэта быў цікавы крок, каб больш адасобіцца ад суседа-патрыярха, які ўсіх праваслаўных вернікаў ВКЛ лічыў сваёю паствою. Але на той час унія прынесла не згоду, а разлад, бо праваслаўная большасць старабеларускага гаспадарства не жадала здраджваць веры продкаў, якая існавала на нашых землях ужо шэсць стагоддзяў.

Хочацца яшчэ нагадаць, што герб горада Мінска – Унебаўзяцце Маці Божай – таксама з XVI стагоддзя. Нададзены ён быў гораду ў 1591 годзе.

XVII СТАГОДДЗЕ
# ЧАС БЕЛАРУСКАЙ СМУТЫ

XVII стагоддзе ўвасабляецца для мяне ў постаці Афанасія Філіповіча – барацьбіта за праваслаўную веру, пакутніка, аднаго са святых, што ў зямлі беларускай заззялі. Нарадзіўся ён напрыканцы папярэдняга стагоддзя, у 30-ць гадоў стаў манахам, апошнія восем гадоў жыцця быў ігуменам брэсцкага Сімяонаўскага манастыра. Забіты польскімі гайдукамі ў 1648 годзе, калі на Украіне ўспыхнула паўстанне Багдана Хмяльніцкага. Пакінуў пасля сябе «Дыярыуш» – выдатны помнік нашай старажытнай літаратуры, з якога паўстае яскравая карціна міжканфесійнай калатнечы ў Вялікім княстве Літоўскім пасля ўвядзення царкоўнай уніі. Праваслаўная царква на Беларусі была пастаўлена фактычна па-за законам. Да прыкладу, у тым жа Бярэсці да 1632 года ў праваслаўных забралі ўсё – 60 цэркваў і 2 манастыры. Гвалтоўнае ўвядзенне уніі выклікала адпаведную рэакцыю народа, згадаць хоць бы забойства ў Віцебску ў 1623 годзе уніяцкага епіскапа Іасафата Кунцэвіча. Новы кароль і вялікі князь літоўскі Уладзіслаў Ваза (правіў з 1632 па 1648 год), каб палепшыць становішча, выдаў у 1632 годзе «Артыкулы супакаення», дзе пацвярджаліся правы праваслаўнай царквы. Але ўжо ў 40-м годзе ён выдае новы прывілей для падтрымкі уніяцкай справы. Так усё XVII стагоддзе творчыя сілы народа траціліся на непатрэбную грамадзянскую рэлігійную барацьбу. Паскорыла унія і пераход беларускай шляхты ў каталіцтва, адрыў яе ад народа.

Афанасій Філіповіч спрычыніўся і да палітычнага боку жыцця старабеларускага гаспадарства. Да таго, як прыняць манаства, ён служыў у канцлера Льва Сапегі выхавацелем «царэвіча Дзмітравіча», быццам бы сына Марыны Мнішак. Гэта быў адгалосак смутнага часу ў Маскоўскай дзяржаве. Рэч Паспалітая мела непасрэднае дачыненне да расійскага безуладдзя (хросным бацькам смуты лічаць Льва Сапегу). Былі планы далучыць Масковію да федэрацыі Кароны польскай і ВКЛ з адзіным гаспадаром на чале. Тут ужо нашы продкі ці не ўпершыню парушылі дамову аб міры. У 1604 годзе пачалася інтэрвенцыя ў межы Расійскай дзяржавы. Сапраўдная вайна пачалася ў 1609 годзе, а праз год беларуска-літоўскія і польскія войскі занялі Маскву. Рускія баяры абралі на маскоўскі трон 15-гадовага Уладзіслава, сына караля і вялікага князя Жыгімонта III Вазы. Але тытул «цара маскоўскага і ўсяе Русі» быў чыста намінальным, бацька так і не пусціў яго ў Маскву.

Вайна скончылася Дзявулінскім перамір'ем у 1618 годзе, ВКЛ вярнула сабе шмат гарадоў і Смаленскую зямлю, Уладзіслаў так і лічыўся царом. І толькі пасля вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—1634 гадоў, якая завяршылася Палянаўскім мірам, тытул маскоўскага гаспадара быў адкуплены рускімі за немалую колькасць золата.

З пачатку стагоддзя Рэч Паспалітая ваявала са Швецыяй за панаванне на Балтыйскім моры. Вайна доўжылася каля 30-ці гадоў. З тых падзей памятная бітва пад Кіргхольмам (недалёка ад Рыгі) у 1605 годзе, калі наш гетман Ян Кароль Хадкевіч з 14-ці тысячным войскам ушчэнт разбіў у тры разы большыя сілы ворага.

Бліжэй да сярэдзіны стагоддзя адгукнулася на Беларусі і ўкраінскае паўстанне казакоў пад зверхнасцю Багдана Хмяльніцкага. Гэта былі масавыя выступленні ў 1648—1651 гадах сялян, казацка-сялянскіх атрадаў і гарадскіх нізоў супраць пануючага класа феадалаў.

Сапраўднай нацыянальнай трагедыяй для Беларусі стала вайна Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гадоў, якую ў савецкай гістарыяграфіі старанна замоўчвалі. Таму ў наш час яна і стала называцца «невядомай». Новы рускі цар Аляксей Міхайлавіч, сын першага з Раманавых Міхаіла Фёдаравіча, разумеў, што хоць Пераяслаўская рада ў студзені 1654 года і зацвердзіла рашэнне пра далучэнне Украіны да Расійскай дзяржавы, але без вайны захаваць такое становішча немагчыма. Не толькі Украіна была прычынай, мэты ставіліся значна больш маштабныя. Царскае самадзяржаўе як своеасаблівы рэванш за «смутны час» пачало захопніцкую вайну за землі Смаленшчыны, Беларусі, Украіны, Літвы і польскі трон.

Адразу ў 1654 годзе быў захоплены Смаленск, з гэтага часу ён ужо назаўсёды адышоў да Расіі. Так была адчынена брама царскаму войску ва ўсю Беларусь. Захоплены Віцебск, Полацк, Магілёў, Гомель, Менск, шмат іншых гарадоў. Нарэшце, у кампанію 1655 года – Гародня, Коўна, Вільня, Трокі. Якраз тады Аляксей Міхайлавіч пачаў тытулаваць сябе царом «усяе Вялікія, Малыя і Белыя Русі». Усяго было ўзята царскімі войскамі больш за 200 гарадоў, мястэчкаў, замкаў. Для параўнання заўважым, што на той час у Беларусі налічвалася больш за 450 паселішчаў.

Польша слаба дапамагала Вялікаму княству. У гэтай вайне фактычна толькі карэннае этнічнае беларускае насельніцтва аба-

раняла гарады і замкі, брала ўдзел у бітвах, гінула і трапляла ў палон. А палон бралі не абы-які – з Беларусі вывозіліся самыя кваліфікаваныя рамеснікі. Дастаткова згадаць беларускіх разьбяроў, якія потым аздобілі цудоўнай разьбой па дрэве царскія палацы ў Каломенскім і ў маскоўскім Крамлі, вырабілі непаўторны іканастас сабора Новадзявочага манастыра. Падчас гэтай вайны пераехаў у Маскву беларускі пісьменнік і асветнік Сімяон Полацкі. Ён выхоўваў царскіх дзяцей, заклаў там падмурак школьнай асветы, пакінуў шмат кніг, трымаў друкарню, дарэчы, толькі другую ў Масковіі, у той час як у Рэчы Паспалітай іх існавала блізу ста сарака. Наш вялікі зямляк, нягледзячы на свае заслугі, так і застаўся чужаніцаю для новых гаспадароў да самай сваёй смерці.

З 1660 года вайна ўступіла ў сваю апошнюю стадыю, набыла характар усенароднай, вызваленчай. Скончылася яна Андрусаўскім перамір'ем 1667 года на 13 гадоў. Вынікі гэтай доўгай і крывавай бойні для Беларусі былі жахлівымі. Насельніцтва скарацілася з 2,9 мільёнаў чалавек да 1,4 мільёна, фактычна мы страцілі кожнага другога жыхара. Асабліва пацярпелі Мсціслаўскае, Віцебскае, Полацкае і Мінскае ваяводствы. Але царскі ўрад не дасягнуў сваіх галоўных мэт, не заваяваў Беларусі. Яна страціла толькі Смаленскую зямлю, адышла да Расіі левабярэжная Украіна з Кіевам. Так скончыўся перыяд, які ўвайшоў у гісторыю Беларусі пад назваю «20-гадовая смута».

Пасля гэтай вайны кароль і вялікі князь Ян II Казімір (брат Уладзіслава) у 1668 годзе адрокся ад трона, які займаў з 1648 года. Каралямі і вялікімі князямі абіраліся потым Міхаіл Вішнявецкі (да 1673 года) і Ян Сабескі, літоўскі палкаводзец (да 1696 года). Войнаў з Масковіяй ужо не было, у 1686 годзе з ёю быў падпісаны «вечны мір» на ўмовах Андрусаўскага замірэння. Царскі ўрад абвясціў сябе патронам праваслаўных у Рэчы Паспалітай. Зразумела, не без патаемных мэт.

Праваслаўным сапраўды нялёгка жылося ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім. Трымалася яно на брацтвах, якія даволі густою сеткаю пакрылі ўсю Беларусь, несучы на сабе культурна-асветныя і нацыянальныя функцыі. Шырылася і унія, станавілася народнай царквой, а не мастком да каталіцызму, як меркавалася яе стваральнікамі. Гэта была процівага каталіцка-польскаму ўплыву, абарона сваёй мовы і існасці. Але польскі ўціск мацнеў, апафеозам гэтага стала забарона ў 1696 годзе ўжывання беларускай мовы ў справаводстве Вялікага княства.

XVIII СТАГОДДЗЕ
# СКОН ВЯЛІКАГА КНЯСТВА

XVIII стагоддзе вяло Рэч Паспалітую, а з ёю і Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, да скону. Для Беларусі яно зноў пачалося вайною, на гэты раз за чужыя інтарэсы. Паўночная вайна 1700—1721 гадоў усчалася паміж Расіяй і Швецыяй за панаванне на Балтыйскім моры. Рэч Паспалітая была саюзніцай Расіі ў гэтым змаганні, таму асноўныя падзеі вайны з 1701 па 1709 гады адбываліся на яе тэрыторыі, пераважна на беларускіх землях. Разбураліся і спальваліся гарады і замкі, руйнаваліся маёнткі шляхты, якая падтрымлівала саюз з Расіяй. Найбольш, як заўсёды, цярпеў народ, яго рабавалі абодва супрацьборчыя бакі. З гэтай вайны ў нашай гісторыі засталася бітва пад Лясной каля Прапойска (цяпер Слаўгарадскі раён), дзе ў 1708 годзе войскі Пятра I разграмілі шведскі корпус. Пасля вядомай Палтаўскай бітвы ў 1709 годзе ваеннныя дзеянні на Беларусі ўжо не вяліся, але вынікі яе для нашай краіны былі проста трагічнымі. Насельніцтва скарацілася з 2,2 да 1,5 мільёнаў чалавек, загінуў кожны трэці жыхар. Асабліва пацярпелі Мсціслаўскае, Віцебскае і Полацкае ваяводствы.

Каралявау у той час Аўгуст II Моцны (1697—1733 гады). Праўда, каралём і вялікім князем у 1706—1709 гадах лічыўся стаўленік шведскага караля Карла XII познанскі ваявода Станіслаў Ляшчынскі. Аўгуст II трымаў вайсковы саюз з Расіяй, абапіраўся на яе ў сваіх намаганнях узмацніць уладу. З гэтага часу пачалося актыўнае ўмяшальніцтва Расіі ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, замацаванае «нямым соймам» 1717 года. Пры дапамозе Расіі пасля смерці Аўгуста II на каралеўскі пасад быў узведзены ягоны сын Аўгуст III. У гады яго праўлення (1733—1764) войнаў не было, але мір не выкарыстаны для ўмацавання дзяржавы. Уласна, каралеўская ўлада была намінальнай, сам кароль і вялікі князь жыў у Дрэздэне, прыязджаючы ў Польшчу толькі на паляванні і соймы. Асноўнымі ж прычынамі ўнутранага і знешняга аслаблення Рэчы Паспалітай былі ўзаемная барацьба паміж магутнымі магнацкімі родамі і палітыка рэлігійнай нецярпімасці.

Уціск цярпела уніяцкая царква, якая за часы свайго існавання стала народнай, нацыянальнай. Вялося яе акаталічванне, уводзіліся адпаведныя дагматы і абрады. А пасля смерці расійскага цара Пятра I польска-каталіцкія колы зноў узяліся выкараняць праваслаўе на беларускіх землях. Асабліва вызначыўся

сойм 1732 года, які перагледзеў усе прывілеі праваслаўнай царквы. Яе святарам забаранялася праводзіць хрэсьбіны, шлюбы і пахаванні без дазволу ксяндзоў і адпаведнай аплаты. Зноў праваслаўныя святыні гвалтоўна пераводзіліся ва уніяцкія. Толькі з 1732 па 1743 гады па Беларускай і Тураўскай епархіях было адабрана 128 манастыроў і храмаў.

Натуральна, усё гэта выклікала нязгоду пераважна некаталіцкага насельніцтва Беларусі. Падтрымкі шукалі ў Маскве. У 1767 годзе ўтварылася Слуцкая канфедэрацыя (саслоўны палітычны саюз для дасягнення пэўнай мэты ў падтрымку ці супраць караля) праваслаўнай і кальвініскай шляхты. Адным з кіраўнікоў яе быў вядомы беларускі царкоўны дзеяч епіскап Георгій Каніскі. Кацярына II прыслала на «дапамогу» 40-тысячнае войска. Гэта вымусіла сойм 1768 года прыняць пастанову аб роўных правах дысідэнтаў (праваслаўных і пратэстантаў) з католікамі. Супраціўнікі такога рашэння стварылі сваю канфедэрацыю. Царскі ўрад прыняў усе меры, каб задушыць канфедэратыўны рух. Асабліва вызначыўся вядомы расійскі палкаводзец А. Сувораў. Якраз ім быў разбіты атрад вялікага гетмана ВКЛ М. Агінскага пад Сталовічамі каля Баранавіч у 1771 годзе. Так стаў магчымым першы падзел Рэчы Паспалітай, які ажыццявілі Расія, Прусія і Аўстрыя. Адбыўся ён у 1772 годзе, да Расійскай імперыі была далучана ўсходняя частка Беларусі. Усе гэтыя дзеі мелі месца ў час праўлення апошняга караля і вялікага князя Станіслава Аўгуста Панятоўскага. На пасад ён быў узведзены ў 1764 годзе пры непасрэднай падтрымцы Кацярыны II, што канчаткова замацавала вырашальны ўплыў Расіі ў Рэчы Паспалітай.

Палітычныя калізіі не спынілі эканамічнае і культурнае жыццё нашай краіны. У Нясвіжы, а потым у Слуцку дзейнічала шаўковая мануфактура, дзе выраблялiся знакамітыя слуцкія паясы. Быў пракапаны Агінскі канал, які злучыў басейны Нёмана і Дняпра. Росквіту дасягнула тэатральнае мастацтва. У Нясвіжы дзейнічаў тэатр Радзівілаў, у Гародні – Тызенгауза, у Слоніме – Агінскага, у Шклове – прыгонны тэатр Зорыча. У Гародні быў закладзены першы батанічны сад, існавала Вышэйшая медыцынская акадэмія, выдавалася першая на Беларусі газета. Развіццю асветы спрыяла ўтвораная ў 70-х гадах Адукацыйная камісія.

Значнай з'явай у жыцці Рэчы Паспалітай стаў Вялікі сойм, які цягнуўся з 1788 па 1792 год і таму празваны Чатырохгадовым. Былі прыняты некаторыя наспелыя рэформы. Але найваж-

нейшым яго вынікам стала прыняцце 3 мая 1791 года Канстытуцыі, даволі прагрэсіўнай для свайго часу. Праўда, для нас гэта азначала канец існавання дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага, старабеларускага гаспадарства, бо Рэч Паспалітая аб'яўлялася унітарнай дзяржавай.

Незадаволеныя абмежаваннем вольнасцяў і правоў магнаты і малазямельная шляхта стварылі Тарговіцкую канфедэрацыю. Падтрымала яе войскамі Кацярына II, якой таксама не падабаліся рэформы. Так наспеў другі падзел Рэчы Паспалітай. Адбыўся ён на пачатку 1793 года. Да Расіі адышла цэнтральная частка Беларусі.

Адказам на пашырэнне ўладанняў самадзяржаўя стала паўстанне 1794 года. Гэта быў нацыянальна-вызваленчы рух супраць царскай акупацыі і прускай інтэрвенцыі за аднаўленне незалежнасці і межаў Рэчы Паспалітай.

Кіраўніком яго быў славуты Тадэвуш Касцюшка, беларус (ліцвін) па паходжанні. Нарадзіўся ён у 1764 годзе ў фальварку Марачоўшчына каля мястэчка Косава (цяпер Івацэвіцкі раён). Ваенную адукацыю атрымаў у Варшаве і Парыжы, змагаўся за незалежнасць ЗША і стаў там нацыянальным героем.

На Беларусі і Літве была створана Найвышэйшая Літоўская рада, якую ачольваў палкоўнік Якуб Ясінскі. Спачатку націск паўстанцаў быў настолькі моцным, што царскія войскі вымушаны былі адступаць. Але потым збройная сіла імперыі ўзяла сваё. Зноў вызначыўся Сувораў, жаўнеры якога разбілі пад Крупчыцамі каля Бярэсця корпус Серакоўскага. Паўстанцы пацярпелі паразу і ў бітве пад Мацяёвіцамі. Сам Касцюшка быў цяжка паранены і трапіў у палон. Цікава, што везлі яго ў Пецярбург пад пільнай аховай і чужым іменем кружным шляхам праз Кіеў, Чарнігаў, Магілёў, Віцебск і Ноўгарад. Паўстанне для яго кіраўніка скончылася Петрапаўлаўскай крэпасцю. Праз два гады імператар Павел I даў Касцюшку амністыю. Зямны шлях легендарнага генерала завяршыўся ў 1817 годзе ў Швейцарыі.

Узяцце восенню 1794 года Варшавы, якую Сувораў заліў крывёю, азначала канец існавання Рэчы Паспалітай як палітычнай сілы. Трэці падзел яе адбыўся восенню 1795 года. Кароль Станіслаў Панятоўскі канчаткова адрокся ад трона. Заходняя частка ВКЛ, а з ёю і ўся Беларусь аказалася ў складзе Расійскай імперыі. Так скончыўся важны этап існавання нашай беларускай дзяржаўнасці – Вялікага княства Літоўскага, гісторыя якога доўжылася звыш паўтысячагоддзя.

XIX СТАГОДДЗЕ
# У ЦЕНІ ДВУХГАЛОВАГА АРЛА

Вобраз стагоддзя паўстае для мяне найперш з малюнкаў Напалеона Орды, без якіх немагчыма ўявіць ніводнае беларускае энцыклапедычнае выданне. Віды вёсак і гарадоў, замкаў, манастыроў і храмаў, палацаў і сядзіб. Беларусь, якая страчвала сваё аблічча. Асабліва кранаюць рамантычным настроем замалёўкі невялікіх шляхецкіх сядзіб і фальваркаў, вырашаных у традыцыях народнага дойлідства. Фальварак Смольгаў, радзіма паэта Уладзіслава Сыракомлі, Убель, дзе нарадзіўся кампазітар Станіслаў Манюшка, Марачоўшчына Тадэвуша Касцюшкі, Міцкевічава Завоссе і Туганавічы яго каханкі Марылі Верашчакі, сядзіба самога Орды. Менавіта небагатыя шляхецкія котлішчы давалі ў XIX стагоддзі выдатных сыноў зямлі беларускай. Мабыць, захавалася тут пасіянарная моц у адрозненне ад магнатаў і багацеяў, што знемагліся ў палітычных гульнях, раскошы і забавах.

Стагоддзе для Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ізноў пачалося з вайны. Гэта была агрэсія Францыі супраць Расіі, якая ў гістарыяграфіі ўсходняга суседа мае назву Айчыннай вайны 1812 года. Для нашай краіны як суб'екта гісторыі гэта хутчэй была вайна грамадзянская. Па меркаваннях даследчыкаў, у царскім войску і на баку Напалеона было прыкладна аднолькава беларусаў. Як заўсёды, найбольш цярпеў просты люд, якога абодва бакі цягнулі ў рэкруты, забіралі правіянт для арміі. Беларусь панесла немалыя матэрыяльныя страты, скарацілася колькасць насельніцтва. Толькі добрыя ўраджаі 1813 і 1814 гадоў далі магчымасць пазбегнуць масавага голаду і эпідэміі.

Жыла, не згасала вялікаліцвінская памяць, не знікала прага да волі, незалежнасці. Праўда, у першай трэці стагоддзя паланізацыя насельніцтва працягвалася. Пры расійскім імператары Аляксандры I, які правіў з 1801 па 1825 гады, вольна дзейнічалі каталіцкая і уніяцкая цэрквы, працягвалі сваю наступальную работу іезуіты – у Полацку яны мелі акадэмію. Практычна з пачатку стагоддзя створана Віленская навучальная акруга, якая ахоплівала ўсю Беларусь. Цэнтр асветы – Віленскі універсітэт. З ім звязана адна з яркіх старонак нашай гісторыі – дзейнасць у 20-я гады таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Гэта быў рух студэнцтва і моладзі за самаўда-

сканаленне, за асвету народа і пазнанне свайго краю. Задоўга да расійскіх дзекабрыстаў тут выспявала думка нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Натуральна, гэта не магло не выклікаць рэакцыі царскіх уладаў. У 1823 годзе маладыя канспіратары былі выкрыты, звыш 100 чалавек арыштавана і кінута ў базыльянскія муры. Найбольшае пакаранне атрымаў Тамаш Зан, які ўсю віну ўзяў на сябе – год турмы і высылка на Урал. Туды ж адпраўлены Ян Чачот і Адам Сузін. З роднай «Літвы» высланы былі ўсяго 20 чалавек.

Якое суквецце імёнаў далі філаматы і філарэты! Адам Міцкевіч – геній паэзіі, Ян Чачот – адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, Ігнат Дамейка – сусветна вядомы вучоны-геолаг, нацыянальны герой Чылі, Юзаф Кавалеўскі – заснавальнік манголазнаўства ў Расіі, рэктар Казанскага універсітэта, той жа Тамаш Зан – паэт, вучоны-геолаг, чалавек-легенда, кумір моладзі на дзесяцігоддзі.

Пасля віленскіх канспіратараў былі ўдзельнікі паўстання 1830–1831 гадоў, якія змагаліся за волю ўжо са зброяй у руках. Паўстанне называюць больш польскім, бо на Беларусі яно не было такім актыўным. Але жаданне змагацца супраць царызму, аднавіць аўтаномію ВКЛ не згасала. Легенда гэтага часу – Эмілія Плятэр, фальклярыстка, паэтка. Яна здолела арганізаваць вялікі партызанскі атрад, які даваў адпор урадавым войскам, атрымала званне капітана. Гэтую дзяўчыну (памерла ў 25 гадоў) параўноўвалі з Жанай д'Арк.

Рэакцыя пасля паўстання была жорсткай. Многія нашы землякі былі сасланы ў Сібір, іншыя вымушаны былі эмігрыраваць. Цар Мікалай І (правіў з 1825 па 1855 год) у 1832 годзе зачыніў Віленскі універсітэт як асяродак вольнадумства. На Полацкім царкоўным саборы ў 1839 годзе скасавана унія. Указамі 1840 года канчаткова спынена дзеянне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года, забаронена выкарыстанне тэрмінаў Беларусь і Літва. Наша краіна стала называцца Паўночна-Заходнім краем. Так пачалася палітыка русіфікацыі, мэтаю якой ставілася знішчэнне адметнасці беларускага народа, выкараннне памяці пра нашую дзяржаўнасць.

Але народ скарыць не так проста, як і вынішчыць яго мову. Выдае фальклорныя зборнікі Ян Чачот, дзе змяшчае і свае беларускія вершы, піша на беларускай мове творы Вінцэнт Дунін-

Марцінкевіч, створана неўміручая паэма «Тарас на Парнасе».

Не змянілася на лепшае для беларусаў і пры цараванні Аляксандра II (1855–1881гг.) Хоць прыгон у Расійскай імперыі быў адменены, жыццё сялян не станавілася лепшым. А нашаму народу прыходзілася трываць яшчэ і жорсткі нацыянальны ўціск. Усё гэта выклікала нацыянальна-вызваленчы выступ супраць царызму – паўстанне 1863–1864 гадоў у Польшчы, Беларусі і Літве. У Паўночна-Заходнім краі гэта быў выразна акрэслены беларускі рух, які узначальваў наш нацыянальны герой Кастусь Каліноўскі. Зразумела, сілы былі няроўныя. Прызначаны Віленскім генерал-губернатарам з надзвычайнымі паўнамоцтвамі Мураўёў задушыў паўстанне. Нездарма ён атрымаў мянушку «вешальнік» – 128 чалавек было пакарана смерцю. На Лукішскай плошчы ў Вільні 22 сакавіка 1864 года прыняў гвалтоўную смерць і кіраўнік паўстання Каліноўскі. Амаль 13 тысяч паўстанцаў адпраўлены на катаргу і пасяленне ў Сібір, у арыштанцкія роты. Маёнткі беларускай шляхты канфіскоўваліся і на выгадных умовах перадаваліся царскім чыноўнікам і генералам. Зачыняліся альбо перабудоўваліся ў цэрквы касцёлы. Адукацыя спрэс несла русіфікацыю.

І ў той жа час адметнасць ліцвінаў-беларусаў прыцягвала ўвагу навукоўцаў, гісторыкаў, збіральнікаў фальклору. У 1870 годзе выдаецца аб'ёмны слоўнік беларускай мовы Івана Насовіча. У 80-я гады ў Пецярбугскім універсітэце ўтвараецца нелегальнае беларускае зямляцтва. Апафеозам падспуднага нацыянальнага абуджэння стала творчасць Францішка Багушэвіча. Ён выдаў лацінкай на беларускай мове два зборнікі вершаў – «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». У прадмове да першай кнігі лічыў мову грунтам існавання нацыі, «нам ад Бога данай», «для нас святой». І гучна клікаў шанаваць родную мову, «каб не ўмерлі». Яго творчасць і грамадская дзейнасць абуджалі нацыянальную свядомасць, яго ідэйная спадчына стала асновай ідэалогіі нацыянальна-вызваленчага руху пачатку новага стагоддзя.

Ужо нарадзіліся Янка Купала, Якуб Колас, Іван і Антон Луцкевічы, Язэп Драздовіч, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Вацлаў Ластоўскі, Усевалад Ігнатоўскі, Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Браніслаў Тарашкевіч і шмат хто іншы, каму ў новым, XX, стагоддзі прадвызначана было лёсам стаць апосталамі беларускага адраджэння.

## XX СТАГОДДЗЕ
# БЕЛАРУСКІ ДОМ

XX стагоддзе ўжо мінула, але мы ўсё яшчэ жывём у ім. Мо таму, што самі адтуль, а хутчэй таму, што яно ўвабрала ў сябе лёсавызначальныя для Беларусі падзеі на яе шляху да аднаўлення дзяржаўнасці. Рух за нацыянальнае адраджэнне немагчыма было спыніць. Асабліва актывізаваўся ён пасля рэвалюцыі 1905 года ў Расійскай імперыі. Знакамі гэтага сталі першыя выступленні ў друку волатаў беларускага духу – верш Янкі Купалы «Мужык» у газеце «Северо-Западный край» 25 мая 1905 года і верш Якуба Коласа «Наш край» у газеце «Наша доля» 14 верасня 1906 года. Так, беларуская мова выйшла з падполля, з сялянскіх хат на шырокі прастор. У Вільні і шмат якіх іншых беларускіх гарадах сталі ладзіцца вечары беларускай нацыянальнай культуры. 23 лістапада 1906 года выйшаў 1-шы нумар газеты «Наша ніва». Гэтаму выданню, што існавала да сярэдзіны 1915 года, наканавана было стаць арганізатарам беларускага жыцця, будзіцелем нацыянальнага адраджэння. «Наша ніва» вырасла ў сапраўды народную газету, тут гартавалася творчая інтэлігенцыя, авангард беларускага руху. Гэта браты Іван і Антон Луцкевічы, Янка Купала і Якуб Колас, Вацлаў Ластоўскі, Максім Багдановіч, Цётка, Максім Гарэцкі – ці ўсіх пералічыш?

Але зноў, як і ў пачатку мінулых стагоддзяў, вайна, цяпер першая сусветная, абрыньваецца на наш край. Яна пачалася 1 жніўня 1914 года, тэрыторыя Беларусі абвешчана на ваенным становішчы. Ізноў ахвяры, бежанцы, ізноў наша краіна пакутавала за геапалітычныя інтарэсы іншых нацый, зараз нямецкай і рускай. З 1915 года лінія фронту рэзала Беларусь па лініі Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага была ў Баранавічах, потым у Магілёве, штаб Заходняга фронту знаходзіўся ў Мінску. Вайна саслабіла Расійскую імперыю, выявіла яе ўнутраныя супярэчнасці і прывяла да краху.

Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі 1917 года вымусіла цара Мікалая II адрачыся ад трона. Паняволеныя нацыі займелі магчымасць вызваліцца з «турмы народаў». Думалі пра свой лёс і беларусы. Колькі ўсялякіх з'ездаў адбылося на працягу гэтага года! Для нас галоўны – Усебеларускі ў Мінску 20 – 31 снежня 1917 года, які сапраўды прадстаўляў увесь беларускі люд. Дэле-

гаты прынялі рэзалюцыю аб праве беларускага народа на самавызначэнне і ўстанаўленне дэмакратычных форм кіравання. Не падабалася гэта бальшавікам, якія пасля кастрычніцкага перавароту ў Расіі адразу захапілі ўладу і ў Мінску – з'езд быў разагнаны. Але выбрана Рада, якая стала кіруючым цэнтрам нацыянальнага руху на Беларусі. Яна, як паўнамоцны орган, 25 сакавіка 1918 года 3-й Устаўной граматай абвясціла пра ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ва ўмовах нямецкай акупацыі БНР не мела магчымасці напоўніцу весці сапраўдную дзяржавастваральную працу. Але, тым не менш, яе афіцыйна прызналі шэраг дзяржаў. Асабліва відавочнымі былі поспехі ў развіцці асветы і культуры. Чамусьці ўсім суседзям і несуседзям замінала імкненне беларусаў жыць сваім жыццём, лёс Беларусі вырашаўся без яе ўдзелу. Так было пры падпісанні Брэсцкага міру 3 сакавіка 1918 года, так было і ў Рызе, дзе 18 сакавіка 1921 года РСФСР і Польшча заключылі мірны дагавор. Ён рэзаў нашую краіну папалам – Заходняя Беларусь адышла да Польшчы.

Тым не менш, савецкая ўлада вымушана была лічыцца з існаваннем Беларускай Народнай Рэспублікі. 30-31 снежня 1918 года шостая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя ў Смаленску аб'явіла сябе I з'ездам кампартыі бальшавікоў Беларусі і 1 студзеня 1919 года аб'вясціла аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь у яе этнаграфічных межах са сталіцаю ў Мінску. Такім чынам, канферэнцыя ўзяла на сябе функцыі ўстаноўчага сходу і парламента Беларусі. Стварэнне ССРБ было тактычным манеўрам бальшавіцкіх уладаў. Пра гэта сведчаць тыя факты, што ўжо праз паўмесяца да РСФСР адышлі тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай губерняў, а 17 лютага 1919 года ўтворана Літоўска-Беларуская рэспубліка ў складзе Віленскай і Мінскай губерняў са сталіцай у Вільні. Але і гэтае ўтварэнне праіснавала нядоўга. Узноўленая па заканчэнні савецка-польскай вайны і заключэнні Рыжскага дагавору, БССР уключала ў сябе толькі 6 паветаў Мінскай губерні з насельніцтвам каля паўтара мільёна чалавек. З 30 снежня 1922 года Беларусь увайшла ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, дзе праз усе гады існавання фактычна мела толькі нацыянальна-культурную аўтаномію, бо ўсё кіравалася з цэнтра.

Жыццё ішло. Нарэшце толькі ў пачатку 20-х гадоў, пасля ўсіх ваенных перетрусаў, льга стала будаваць мірнае жыццё. У 1924 і

1926 гадах адбыліся ўзбуйненні БССР, нам вернута Усходняя Беларусь. З энтузіязмам усяго народа пачаўся працэс беларусізацыі, будаўніцтва нацыянальнага жыцця ва ўсіх сферах. Ды зноў жа нядоўга. Напрыканцы 30-х гадоў усталявалася сталінская дыктатура, але яшчэ з сярэдзіны пачалася барацьба з так званай «нацдэмаўшчынай», абцяжараная калектывізацыяй. З пачатку 30-х сотні тысяч заможных сялян былі раскулачаны і загінулі ў савецкіх канцлагерах альбо вывезены ў Сібір, вынішчаны цвет беларускай навуковай і творчай інтэлігенцыі. Нават з самой кампартыі Беларусі пасля «чысткі» шэрагаў у 1935 годзе выключана 42 працэнты яе членаў. Скончыў жыццё самагубствам першы прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі У. Ігнатоўскі, напэўна, такім жа чынам пайшлі з жыцця былыя кіраўнікі рэспублікі А. Чарвякоў і М. Галадзед. Расстраляны або загінулі ў сталінскіх лагерах навукоўцы і пісьменнікі Ц. Гартны, В. Ластоўскі, М. Гарэцкі, Б. Тарашкевіч, Я. Лёсік, У. Галубок... Спіс ахвяраў бясконцы. Рэпрэсіі цягнуліся праз усе 30-я гады.

Не нашмат лягчэй жылося ў Заходняй Беларусі пад польскай уладай. Яна праводзіла ў дачыненні да беларусаў палітыку прымусовай паланізацыі і асіміляцыі. Адно што калектывізацыі не было, наадварот, сялян рассялялі на хутары. Ды прымус і тэрор не саправаджаўся крывёю, як у БССР, хоць турмы і Бяроза-Картузкі канцлагер былі перапоўнены палітвязнямі. На «крэсах усходніх» вялося актыўнае змаганне з усім беларускім. Паказальны ў гэтым плане разгром Беларускай сялянска-работніцкай грамады, якая дзейнічала ў 1925—1927 гадах і аб'ядноўвала каля 120 тысяч членаў. Ці тое, што з 400 беларускіх школ у 1928 годзе да 1939-га не засталося ніводнай. Былі закрыты 2 настаўніцкія семінарыі, 8 беларускіх гімназій. Жорстка праследавалася беларуская прэса. Да чаго гэта ўсё прывяло б – здагадацца не цяжка. Але адыграў сваю ролю гістарычны фатум.

У 1939 годзе адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з Беларуссю сацыялістычнай. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі 17 верасня быў вынікам тайнай змовы савецкага і германскага рэжымаў пра перадзел сфер уплыву дзвюх вялікіх дзяржаў (вядомы пакт «Молатава – Рыбентропа»). Зноў лёс Беларусі вырашалі без яе, але на гэты раз сталася ў інтарэсах нашай краіны як суб'екта гісторыі: амаль увесь беларускі народ уз'яднаўся ў адно цэлае.

Новая хваля другой сусветнай вайны, якая пачалася 1 верасня 1939 года нападам Германіі на Польшчу, накацілася на

Беларусь 22 чэрвеня 1941 года. З гэтага часу вядзе адлік Вялікая Айчынная вайна, у якой беларусы гераічна змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Чатыры гады пад акупацыяй, найвялікшая па сваіх маштабах партызанская вайна, удзел у баявых дзеяннях Савецкай Арміі да самага Дня Перамогі 9 мая 1945 года забралі з жыцця амаль кожнага трэцяга жыхара рэспублікі. Велізарныя страты. Зруйнаваны і спалены сотні гарадоў і тысячы вёсак, знішчана народная гаспадарка. Беларусь як найбольш пацярпелая ад вайны рэспубліка стала адным з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 27 красавіка 1945 года. Другая сусветная вайна скончана 2 верасня актам аб капітуляцыі Японіі. З гэтай вайны Беларусь выйшла і з тэрытарыяльнымі стратамі – у выніку дагавора паміж СССР і Польшчай да апошняй адышла Беласточчына.

З радасцю ад мірнага жыцця і вялікім энтузіязмам уздымалі беларусы сваю краіну з руін. У Мінску пачалося будаўніцтва цяперашніх гігантаў нашай прамысловасці – аўтамабільнага і трактарнага заводаў, узводзіліся мотавелазавод, падшыпнікавы, радыёзавод. У кастрычніку 1947 года з варот прадпрыемства выйшаў першы аўтамабіль-самазвал «МАЗ-205». Нечуванымі тэмпамі будаваўся фактычна нанова Мінск – сталіца нашай рэспублікі.

Так пачыналася другая палова XX стагоддзя, якая стала найвялікшым мірным перыядам у гісторыі Беларусі. Мы ці не першае пакаленне, якое не зведала жахаў вайны. Але і сёння можна пачуць ад беларуса: «Абы вайны не было». У гэтых словах не толькі боль ад апошняй па часе другой сусветнай, у іх генетычная памяць пра ўсе збройныя ператрусы, якія не міналі нашую краіну за стагоддзі яе існавання. Таму нам так дарагое мірнае жыццё.

Пасля смерці Сталіна ў 1953 годзе пачаўся новы этап у гісторыі краіны, вярталіся з жудасных сталінскіх лагераў ні ў чым не вінаватыя людзі. Потым былі так званыя «хрушчоўская адліга» і «брэжнеўская задуха», калі нельга было пачуць ніводнага праўдзівага слова пра тое, што робіцца ў краіне. У канцы 50-х – пачатку 60-х, калі партыя дакляравала, што праз дваццаць гадоў мы будзем жыць пры камунізме, ішла магутная хваля руйнавання храмаў. Сотні помнікаў дойлідства і знакаў духоўнага жыцця зніклі з беларускай зямлі.

Разам з тым Беларусь перажывала эканамічны ўздым. З аграрнай рэспублікі яна станавілася індустрыяльнай дзяржа-

вай. У канцы 50-х пачалі будавацца новыя гарады – Навапалацк, Салігорск, Светлагорск, Жодзіна, асновай якіх была «вялікая хімія» і машынабудаванне. Буйнейшыя хімічныя прадпрыемствы ўзніклі ў Гродне (азотнатукавы), Гомелі (суперфасфатны), Магілёве («Лаўсан»). Гэта цяпер мы разумеем, як экалагічна небяспечныя такія гіганты, тады ж было ўсведамленне гордасці за масштаб усялякіх сямі- і пяцігадовых планаў ды іх выкананне. Буйнымі тэмпамі развівалася і радыёэлектронная прамысловасць, асноўныя заказы для якой былі ад ваенных. Такім чынам, Беларусь стала велізарным зборачным цэхам Савецкага Саюза, бо сваіх прыродных рэсурсаў для такіх масштабаў прамысловай вытворчасці проста не было. Сёння мы перажываем наступствы гэтай неадпаведнай індустрыялізацыі.

Шырока вялася меліярацыя, згубны характар якой мы адчуваем цяпер. Будаваліся буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, што таксама парушала экалагічную раўнавагу. Гігантаманіяй была прасякнута і манументальная прапаганда 70-х – пачатку 80-х гадоў, прысвечаная ў асноўным апошняй вайне. Створаны мемарыяльныя комплексы «Хатынь», «Брэсцая крэпасць-герой», «Прарыў», «Суражскія вароты». Не забываліся і пра дзеячоў беларускай культуры – у Мінску ўзніклі помнікі Якубу Коласу, Янку Купалу, Максіму Багдановічу, у Полацку – Францішку Скарыне, Сымону Буднаму ў Нясвіжы. На жаль, гэтыя станоўчыя прыклады культурнага жыцця перакрэсліваліся суцэльнай русіфікацыяй, дзе Беларусь ішла наперадзе ўсіх. У нашым краі лжывы тэзіс аб узнікненні новай супольнасці – савецкага народа – атрымліваў найбольш поўнае ўвасабленне. У 1970 годзе цалкам зніклі беларускамоўныя школы ў гарадах, у некалькі разоў паменела іх на вёсцы. На гэты конт маю ўласны досвед – калі ў 1986 годзе аддаваў сына ў школу, ва ўсім тады амаль паўтарамільённым Мінску, сталіцы Беларусі, адшукаўся толькі адзін (!) беларускамоўны клас.

Парадаксальна, рэспубліка мела ўсе атрыбуты дзяржаўнасці – урад, Вярхоўны Савет, сцяг, герб, гімн, народную адукацыю ды ўсё іншае; нават касманаўты з'явіліся свае – Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак, а самастойнасці ў прыняцці рашэнняў не было аніякай. Усё дыктавалася з цэнтра савецкай імперыі. Па-свойму дбалі пра Беларусь і Кірыла Мазураў, які быў першым сакратаром ЦК КПБ у 1956–1965 гадах, і Пётр Машэраў (1965–1980 гг.), але яны ніяк не маглі супрацьстаяць цэнт-

ральнаму апарату, былі складнікамі гэтай сістэмы. Таму не дзіўна, што беларускасць як у рэзервацыю загналі ў літаратуру, мастацтва, фальклор.

Далей так доўжыцца не магло. Каталізатарам распаду сістэмы, пабудаванай на несправядлівасці ды хлусні, стала катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, якая пачалася выбухам 26 красавіка 1986 года. Ужо абвешчаны новым генеральным сакратаром ЦК КПСС Міхаілам Гарбачовым курс на галоснасць і перабудову, а праўду пра Чарнобыль старанна хавалі ад народа ажно тры гады. Праўда ж была ў тым, што найбольш пацярпела ад катастрофы якраз Беларусь. У той ці іншай ступені забруджанай радыёнуклідамі аказалася пятая частка яе тэрыторыі, дзе пражывалі больш чым 2 мільёны чалавек. Бяда гэтая і сёння з намі, хоць народ прыжыўся да яе. Ніхто не сплаціў нам чарнобыльскія даўгі.

У канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў падзеі ў грамадска-палітычным жыцці каціліся, як кола з гары. Рэспублікі Савецкага Саюза аб'яўлялі пра сваю незалежнасць і суверэнітэт, нарэшце самы некалі магутны СССР распаўся ў беларускіх Віскулях 8 снежня 1991 года.

Працэсы здабывання незалежнасці бурна праходзілі і ў нашай рэспубліцы. Каб адчуць гэта, дастаткова хранікальна пералічыць найважнейшыя падзеі. 30 кастрычніка 1988 года на Усходніх могілках і ў Курапатах адбыўся несанкцыянаваны мітынг-рэквіем «Дзяды». 19 лютага 1989 года – мітынг на стадыёне «Дынама» «У падтрымку перабудовы». 24—25 чэрвеня 1989 года на ўстаноўчым з'ездзе ў Вільні ўтварыўся Беларускі народны фронт «Адраджэнне». 30 верасня таго ж года – марш пратэсту «Чарнобыльскі шлях». 26 студзеня 1990 года яшчэ савецкім Вярхоўным Саветам БССР беларуская мова юрыдычна абвешчана дзяржаўнай. 27 ліпеня 1990 года той жа Вярхоўны Савет прыняў «Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР». Пасля няўдалага камуністычнага путчу ў Маскве 25 жніўня 1991 года Дэкларацыі нададзены статус канстытуцыйнага закона. Дзень 27 ліпеня быў аб'яўлены нацыянальным святам і адзначаўся да 1996 года як Дзень незалежнасці. А да гэтага, 10—11 красавіка 1991 года прайшлі маштабныя забастоўка і мітынг рабочых Мінска супраць палітыкі ўрадаў БССР і СССР.

БССР як назва перастала існаваць 19 верасня 1991 года, калі ўжо новы Вярхоўны Савет прыняў адпаведную пастанову. Наша краіна стала называцца Рэспублікай Беларусь. Былі зац-

верджаны герб – старадаўняя «Пагоня» – і бел-чырвона-белы сцяг.

Ад тых імклівых і бурных падзей Беларусь жыве сваім уласным жыццём. Няпростым, нялёгкім, але з надзеяй на будучыню. У 1992 годзе вывелі ядравую зброю з тэрыторыі Беларусі, адбыўся І з'езд беларусаў свету ў ліпені 1993 года, тады ж – візіт Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслава Шушкевіча ў ЗША і наведванне ў адказ Мінска 15 студзеня 1994 года амерыканскім прэзідэнтам Білам Клінтанам.

Найважнейшай падзеяй стала прыняцце 15 сакавіка 1994 года першай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, згодна з якой быў абранны першы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. 14 мая 1995 года і 24 лістапада 1996 года праведзены два рэферэндумы, заменены дзяржаўныя сімвалы, статус дзяржаўнай нададзены і рускай мове, прынята Канстытуцыя з папраўкамі і дапаўненнямі, днём Незалежнасці аб'яўлена дата 3 ліпеня. 26 красавіка 1996 года шматлюдна прайшоў Дзень смутку, прысвечаны 10-й гадавіне Чарнобыльскай трагедыі. У апошнія гады заключана пагадненне аб стварэнні саюза дзвюх дзяржаў – Беларусі і Расіі.

Цяжка выбіваецца наша краіна на сваю каляіну. Праблемы ўсюды: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы, адукацыі, культуры. Збядненне насельніцтва прывяло да катастрафічных наступстваў – пачала зніжацца колькасць жыхароў. На сённяшні дзень былых 10-ці мільёнаў ужо няма. Але ведаючы беларускі народ, верыцца, што мы пераадолеем усе цяжкасці, захаваем няпроста здабытую, калі глянуць на працяг усяго XX стагоддзя, незалежнасць, адродзімся канчаткова як нацыя і ў новым, XXI стагоддзі станем квітнеючай дзяржавай з дастойным узроўнем жыцця для ўсіх людзей. Будучыня – у руках маладых.

# НІВУ ЎЗАРЭ АРАТЫ

## Фрагменты тэкстаў дакументальных фільмаў

Пакліканых шмат – сейбітаў мала. Але толькі імі, абранымі, не рвецца конча праз ліхалецці, недароды і падман крэўная повязь.

* * *

Як мала яшчэ сабралі мы пад сваё крыло духоўнай спадчыны нашай, як далёка адыходзім часам ад запаветаў продкаў, аддаючыся мітусні і прадажнасці веку.

* * *

Без асэнсавання мінулага не згледзець будучыні.

* * *

Старажытнае кірыліцкае пісьмо.

Колькі не ўглядайся ў гэтыя літары, як не складвай з іх словы і сказы, яны застануцца нямымі, пакуль не спазнаеш повязь часоў і падзей, лёсаў людскіх, трывог свету.

* * *

Пачуццё радзімы. Падсвядома жыве яно з першага дня, увайшоўшы курганамі і замчышчамі роднай зямлі, усведамленнем адвечнай цягі беларуса да лепшага жыцця.

* * *

Як часта ў гісторыі нашай жаданне людзьмі звацца ці спраўдзіцца хоць бы ў дзецях перамолвалася жорсткімі жорнамі часу, лжы і знявагі.

* * *

Шляхі праўды як у гісторыі, так і ў жыцці чалавека заўсёды цяжкія.

* * *

Літва. Слова, якое для свядомага беларуса значыць вельмі шмат – Вялікае княства Літоўскае, беларуская сярэднявечная дзяржаўнасць, якую мы так і не можам у поўнай меры адрадзіць да сённяшняга дня.

Але колькі блытаніны з гэтым гістарычным тэрмінам, што і сёння замінае нам уявіць гісторыю айчыны сваёй у яе цэласнасці, незацемненасці і праўдзівасці.

* * *

Чужыя, суседскія гісторыкі навязвалі нам кожны свае міфы, абы толькі згубілі беларусы крэўную повязь з ліцвінамі, што далі сваё імя старажытнабеларускай дзяржаве.

Хто яны, нашы далёкія продкі? – схавана за смугою часу, сплыло вадою.

* * *

Тая, наша, Літва, Масковія. Розныя гэта былі дзяржавы, кожная са сваім гістарычным шляхам. Тэзіс пра спрадвечную еднасць заклалі ў свой час царскія палітыкі, зразумела, для сваіх імперскіх мэт. Каб загрэбсці да сябе.

* * *

Ліцьвінская ідэя.

Расцярушылі мы гісторыю нашу, раскідалі нядбайнасцю сваёй ды гвалтам чужынскім. І дзе цяпер ідэя тая?

* * *

Час збіраць камяні. Час выходзіць сейбітам. Час ісці да сябе і казаць праўду.

* * *

Каб адступілася язычніцтва, ад Кіева па Дняпры і Прыпяці нібыта цудатворным знакам прыплылі ў Тураў каменныя крыжы. Ляцяць стагоддзі, а знак гэты неўміручы.

* * *

Далёка ад нас той складаны час, дзе побач з хрысціянствам існуе і язычніцтва, дзе льецца шмат крыві, дзе закладваюцца падваліны самастойнасці нашай. Далёка дзеі князя Усяслава.

Але ўрок яго зразумелы: для полацкіх князёў ёсць толькі адно поле дзейнасці – Полацкае княства, якое трэба берагчы, шырыць, гартаваць.

* * *

Як нідзе, тут, каля царквы ўсяміласцівага Спаса, што змагла зберагчыся праз усе гістарычныя навалы, востра адчуваеш душою подых стагоддзяў, непарыўную сувязь і зніціванасць сваю з продкамі.

* * *

Доўгія дзесяцігоддзі не чулі сцены полацкай Сафіі ўрачыстай святой літургіі. І толькі свята Тысячагоддзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай царквы на Беларусі адчыніла дзверы малітве.

* * *

Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі. Яны, як і іншыя святыя заступнікі зямлі беларускай, ішлі разам з народам пакручастай дарогай гісторыі.

* * *

Збавення шлях – крыжы на храмах. Але колькі высілкаў трэба, каб яны паўсталі.

* * *

Адзіна правільны шлях – будаваць на камені духоўнасці, веры, а не на пяску нашай змучанай пакутамі веку душы.

* * *

Так і стаяць тры мужы са Старога Запавету. Нават калі браць за адлік Запавет Новы, два тысячагоддзі Святая Троіца існуе грунтам хрысціянскай веры, непахісна трымаючы тайну светабыцця.

* * *

Яшчэ не за нашую памяць, каб засцерагчыся ад няшчасцяў і злых духаў, склаўся звычай ставіць на расстайных дарогах крыжы-абярэгі. Ставілі іх па зароку за адну ноч.

* * *

Каля двух тысячагоддзяў гучаць словы Свяшчэннага Пісання. Гучаць на розных мовах.

І ў Беларусі справа біблескага перакладу мае даўнюю традыцыю.

* * *

Галоўнае – захаваць у беларускім перакладзе духоўнасць, тайную містычную глыбіню і дакладны сэнс Свяшчэннага Пісання.

* * *

Разам з намі шукае дарогу да храма і мова.

* * *

Можна адкупіцца ад грахоў. Але чым адкупіцца за пагрозлівы стан нацыянальнай самасвядомасці, як падняць да ўзроўню святыні роднае слова, з якім нас «літасцівы Бог на свет пусціў»?

* * *

Беларускія вершы Яна Чачота. Вяртанне амаль праз два стагоддзі нематы беларускага літаратурнага слова.

* * *

Настаўнік роднай мовы. Праз такіх рупліўцаў і не занядбаўся дазвання беларускі палетак.

* * *

Натуральны крутабег жыцця – народзіны, хрышчэнне, радзіма, бацька і маці, родная мова, песня, што ідзе ад душы народа.Так бы і круціцца жыццёваму колу, ды няўмольна ўмешваецца гісторыя, і лёс чалавека, уваплецены ў жорсткасць рэчаіснасці, становіцца драматычным.

Мо лёс музы́кі асаблівa, бо як ніхто чуе ён дысгармонію часу, якая ўрываецца ў спрадвечныя рытмы, крышыць усё на сваім шляху, выкручвае заведзены парадак.

* * *

Нядоля людская. На жаль, яна заўсёды з чалавекам. Але з ім жа заўжды і прыгажосць зямлі.

* * *

Дзе тое светлае дзяцінства са спакуснымі яблыкамі, што гарчаць сваёй недаспеласцю? А тая цэркаўка, дзе ўпершыню далучыўся да высокіх напеваў? За якімі туманамі знікла ўсё?

Так і лёс нашай Маці-Беларусі, якой мо ніколі не давалі жыць натуральным жыццём – заваёўвалі, рабавалі, падпарадкоўвалі, вынішчалі нацыянальны дух. Колькі ліха хапілі мы адно ў тым дваццатым стагоддзі!

* * *

Іх было мала. Але яны свядома ішлі ў няроўны бой пад сцягам, дзе былі вышыты словы: «Тым, што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына».

* * *

У віры мітуслівага жыцця бракуе часу згадаць беларускі шлях. Між тым ён і ў нягучных канкрэтных справах, і ў ціхіх развагах філосафа.

* * *

Мы ўсе такія розныя, і шлях у кожнага свой. Але застаюцца агульныя каштоўнасці, якіх нельга страціць. Адна з іх – гэта адчуванне непарыўнасці быцця, повязі мінулага з будучым.

* * *

Ці не спакою ўрэшце захацела сцяжараная блуканнямі і прыгодамі душа ўжо немаладога вучонага?

Ці, на жаль, даказала жыццё, што да справядлівасці людской, на якую спадзяваўся Скарына ў сваіх прадмовах, шлях яшчэ далёкі?

І спраўдзіцца б яму, але ад самага нараджэння да смерці ў душы чалавека змагаюцца дабро са злом, святло з цемрай.

* * *

Няма прарока ў сваёй Айчыне, а ёсць адзінота, апошнія дні на чужыне і непазбыўны сум па роднай зямлі.

* * *

І ўсё ж туга па радзіме – хвароба невылечная.

* * *

Нявольны грэх – растанне з Радзімай, якую любіў шчырай любоўю ўдзячнага сына, кампазітар Мікола Равенскі замольваў да скону дзён сваіх на чужыне. Хоць у чым каяцца было чалавеку, які ўсё жыццё і моц таленту музыкі паклаў на служэнне роднаму краю? І ці яго віна, што стаў выгнанцам, няўгодным на сваёй зямлі?

Гэта доля такая. Ці яго аднаго?

* * *

Ці баязлівасць гэта? Хутчэй, калі сказаць мудрагеліста – ЦІХІ БЕЛАРУСКІ НОНКАНФАРМІЗМ, мацаваны спрадвечным: любоўю да Айчыны, народнай песняй і словам Божым.

* * *

Жыццё на чужыне – без выйсця. Не вярнуцца, не выправіць памылку расстання. Толькі згадкі пра Бацькаўшчыну даюць збавенне.

* * *

Марудна цягнецца дарога дадому. Хочацца ўрэшце згледзець родныя краявіды, супынкі трываць немагчыма. Але якім бы не быў далёкі шлях, усё ж гэта шлях на радзіму.

* * *

Напэўна, гэтая з'ява напоўніцу яшчэ не асэнсавана – шмат якія знакамітыя сыны зямлі беларускай выйшлі з небагатых шляхецкіх сядзібаў і фальваркаў. Мабыць, захавалася тут яшчэ пасіянарная моц у адрозненне ад магнатаў і багацеяў, што знемагліся ў гульнях, раскошах і забавах.

* * *

Зрабі крок – і цябе забярэ іншасвет, адкліча на час з рэчаіснасці. Падтрымка ў зацягнутым міжчассі, калі мы шукаем сябе, свой беларускі шлях, шукаем старую, згубленую Беларусь, каб знайсці новую, якой яшчэ няма.

Зрабі толькі крок – і ўсё гэта стане неад'емна тваім. Але гэта яшчэ і яго.

* * *

Ад родных мясцін атрымліваем мы дабраславенне на свае чалавечыя шляхі. Іх хапае кожнаму.

Для Напалеона Орды дарогі сталі проста наканаваннем жыцця.

* * *

Калі згадваем мінулае, здаецца, што там было ўсё драматычна, нават трагічна, сумна. Пэўна, не – як і ва ўсе часы людзі жылі, радаваліся сонечным дням, музыцыравалі, спявалі. Мо і сам наш герой лічыў сябе шчаслівым чалавекам, добра ўсведамляў значнасць сваёй працы.

* * *

Пяцёра са шматлікай кагорты беларускіх мастакоў, чыя творчасць у сваім росквіце прыпадае на век пазамінулы. Нарадзіла і ўзгадавала іх наша зямля, натхняла на творчасць. І куды б не кідаў іх лёс, повязь з родным краем на ўсё жыццё заставалася непарыўнай.

Перадусім у шлях штурхала жаданне ўдасканаліць свае здольнасці, атрымаць мастацкую адукацыю. У першай трэці XIX стагоддзя гэта можна было зрабіць у Вільні, старажытным асяродку беларускай культуры.

Праўда, самой Беларусі тады няма. Ёсць зямля без голасу – Паўночна-Заходні край.

* * *

Далей Іван Насовіч складае «Алфавітны паказальнік старых беларускіх слоў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі». Праўда, існаванне самастойнай мовы ставілася ў той час пад сумненне, і слова «беларускіх» на тытуле рукапісу закрэслена зусім невыпадкова.

Але, на жаль, час замятае і добрыя справы, і найвысшыя памкненні. Дагэтуль амаль не выдадзеная спадчына нашага славутага земляка, які ўсё жыццё ахвяраваў зямлі беларускай.

* * *

Мастак і ўлада, рэжым і свабода творчасці. Тэма актуальная для любога часу і любой культуры, асабліва ва ўмовах гвалтоўнага ўціску нацыянальнай ідэі, якой гэта культура аплоднена.

* * *

Турма – непазбежны скутак змагання супраць вялікадзяржаўна-шавіністычнай палітыкі.

* * *

Зло нараджае толькі зло. І так бясконца.

* * *

У любы час мастак нясе адказнасць за лёс свайго народа, свайго краю. Кожны ў меру свайго таленту і светаўспрымання выказвае ў творах памкненні свае, імкнучыся знайсці водгук у чалавечай душы.

Можна спрачацца, што стварае чалавека, а што разбурае яго, тым больш, што сёння мы амаль усё ператвараем у прадмет куплі-продажу – як рэч, як хлеб. Але ўсё ж хацелася б спадзявацца, што людзі вернуцца ў храм мастацтва, да вытокаў духоўных як да хлеба надзённага.

* * *

Гуманіст і асветнік, тэолаг і рэлігійны рэфарматар, гісторык і паэт, педагог. Сымон Будны. За словамі энцыклапедычных артыкулаў, за смугою часу, за бронзаю помніка – толькі знак, сімвал. Як адчуць за ўсім гэтым чалавека, які пражыў складанае, поўнае ўнутранага драматызму жыццё?

* * *

Шлях праз Кракаўскі універсітэт быў звычайны для шмат якіх прагных навукі ліцьвінаў. Тут яны былі ўжо каталікамі. Ды і гэтае канфесійнае вызначэнне было не апошняе. Дух рэфармацыі стала трымаўся ў Еўропе.

* * *

Эпоха рэфармацыі. Свабода ад догмаў і традыцый. Імклівы палёт духу. Але згарэлі крылы на сонцы, бо не ўсё падуладна розуму чалавека.

* * *

Контрэфармацыя змяла пратэстантызм на Беларусі. У езуіцкіх кастрах згарэлі няўгодныя кнігі. І Сымона Буднага таксама. Ніводнай не захавалася на роднай зямлі. У ацалелых

за часам кальвінскіх зборах – цяпер праваслаўныя ці каталіцкія храмы. Быццам бы ўсё час расставіў на свае месцы.

Але ізноў чалавечы розум прагне рацыянальнага, ізноў кліча апостальская ніша заняць месца і падштурхнуць чалавека да адкрыцця новых ісцін.

* * *

Чатырыста гадоў аддзяляе нас ад таго часу. Для чалавека – прамежак агромністы. Для Бога, для гісторыі – імгненне. Гэта робіць усіх нас – папярэднікаў і наступнікаў – сучаснікамі.

* * *

Край жывой крынічнай вады, край рэк і азёр, лясоў і сагрэтых любоўю палёў. Беларусь.

* * *

Гістарычны факт адбыўся – мы нядаўна сталі жыць у Рэспубліцы Беларусь са старадаўнім гербам Пагоня і пад бел-чырвона-белым сцягам. Але...

* * *

Сціраецца пыл забыцця са старажытных беларускіх святыняў. Здаецца, перастаём быць Іванамі без роду, без племя?

* * *

Бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоня на будынку былога ЦК КПБ. Раней такога нават нельга было ўявіць.

* * *

Цяпер становіцца відавочным, што мы ўсе розныя, адметныя, што мы ўжо не той шэры безаблічны натоўп, які «дружна будуе камунізм». Час спрыяе праявіцца як асобе кожнаму.

* * *

Як у жыцці мы шукаем надзейныя шляхі, так і ў руху выбіраем магістраль, каб без прыпынкаў напрасткі рухацца да мэты.

* * *

Акурат на такіх людзях, якія любяць Беларусь ды робяць што-кольвек канкрэтнае, і трымаецца ўпэўненасць у яе лепшай долі.

* * *

Чалавеку, які ведае, куды ісці, свет дае дарогу. Праз жыццёвыя нягоды, людскую няўдзячнасць, неспрыяльныя ўмовы.

Шчаслівы той, хто жыве ў суладдзі з сабою, аддадзены любімай справе і пазбавіў сябе цяжкасці крывіць душою.

* * *

Але не ваярскія здольнасці Льва Сапегі – запатрабаванымі аказаліся яго розум дзяржаўнага мужа і цвярозага дыпламата.

* * *

Грамадская прысяга на вернасць беларускаму народу. За ёю чуюцца водгукі слаўнай ваеннай гісторыі нашага старажытнага гаспадарства, да якой годна спрычынілася постаць гетмана найвышэйшага Канстанціна Астрожскага.

* * *

Дух мацуецца памяццю. Вучонаму-археолагу мець яе мо і прасцей, для яго стагоддзі адкрыты ў зрэзах раскопаў. Але і складаней, калі раскоп у Курапатах.

Гэта ўжо не археалогія, гэта палітыка. Трэба мець вялікую адвагу і мужнасць, каб першым сказаць слова, якое сёння з'яўляецца сімвалам сталінскага генацыду на беларускай зямлі.

* * *

Усё-такі жаночае сэрца больш востра адчувае разбуральную моц вайны ва ўсіх яе праявах.

* * *

Занядбаная зямля, пакінутыя хаты, куды больш ніколі не вернуцца людзі. Цяжка нават уявіць сабе такія краявіды напрыканцы цывілізаванага дваццатага стагоддзя.

* * *

Вокны бальніц не вабяць, таму што за імі не цяпло чалавечага жытла, а боль, адчай і надзея абяздоленых.

* * *

Усе спакусы свету, як пісаў Фёдар Дастаеўскі, не варты адзінай слязінкі дзіцяці. Але як цяжка ўвасобіць гэтую ісціну ў жыцці.

* * *

Чарнобыль яшчэ доўга будзе напамінаць пра сябе. Але не менш на здароўі дзяцей адбіваецца і ў цэлым экалагічнае становішча на Беларусі.

Пры савецкай уладзе мы жылі быдта апошні дзень, не думаючы пра сваіх нашчадкаў. Сёння гэта вяртаецца бядою.

* * *

Здабыча карысных выкапняў заўсёды цягне за сабою экалагічныя наступствы, гэта неадваротна. Адзінае, калі мы гаспадары ў сваім доме, выдаткі трэба рабіць найменшымі.

* * *

Сёння, у нашай незалежнай Беларусі, мы павінны быць не толькі шукальнікамі і здабытчыкамі скарбаў, але найперш ахоўнікамі іх. Бо жыць нам сваім жыццём. А жыць ёсць з чым, зусім не бедная наша зямля.

* * *

Бедная зямля ці радовішча скарбаў?

* * *

Мо і не трэба шукаць скарбы ў зямлі? Проста разумна выкарыстаць тое багацце, што ўжо ёсць, што напрацавана нашымі вучонымі ды інжынерамі. Сапраўды, як гавораць, у іншых заўсёды знойдзеш, пашукай спачатку ў сябе.

* * *

Палітыка – для людзей. Для зямлі гэта незразумела, яна аддана чакае цёплых рук сейбіта.

* * *

Дойлідства – ці не самае моцнае па эмацыянальным ўздзеянні мастацтва? Бо з архітэктурай мы сутыкаемся штодзень і штосчас – ад інтэр'ераў кватэр да магутных гарадскіх ансамбляў.

Хочацца, каб наша штучнае асяроддзе ўздзейнічала толькі светла. Таму спрадвечныя няспынныя пошукі гармоніі.

Гэтую гармонію стварае архітэктар. І каб яна ўвасобілася ў праекце, а пасля і ў натуры, трэба яе мець унутры сябе.

* * *

Знакамітыя дубровы на беразе Нёмана. Дрэва гэтае заўсёды пакідае ўражанне магутнасці, веліччы, устойлівасці і непарушнасці. Тут глыбока адчуваеш паяднанасць прыроды і душы, што нараджае прыгажосць, кліча выказаць яе ў слове.

* * *

Абуджаецца гістарычная памяць — усё больш людзей імкнецца прыпасці да духоўных вытокаў. Гэта і дае спадзяванні, што мы ўрэшце перажывём цяжкасці, навядзём парадак у сваім, цяпер ужо сваім, доме і выйдзем на шырокі прасцяг прыстойнага жыцця.

* * *

Сапраўдная веліч народа. Яе грунт – тыя ж якасці, якія складаюць сапраўдную веліч асобных людзей.

* * *

Складана зразумець жыццё чалавека, гэта як наблізіцца да Боскай ідэі яго стварэння. Аднолькава няпроста асэнсаваць гісторыю Айчыны сваёй, такую ж драматычную і пакручастую, як і лёсы лепшых яе сыноў.

* * *

Шлях наш ад хрышчэння да смерці ёсць нямоглая спроба наследаваць зямному ўдзелу Збавіцеля. Цяжка трымаць нам спакусы д'ябла, разлітыя да краёў у рэальным жыцці праз усе часы. Наймацней пераадолець гэта даецца святым.

* * *

Сабор беларускіх святых. У лёсах падзвіжнікаў – адбітак дольніх і горніх шляхоў нашага народа. Неадлучна лёсу Беларусі і постаць прападобнапакутніка Афанасія Брэсцкага.

* * *

Літаратурныя вартасці «Дыярыуша» і сёння не ацэнены як мае быць. Ці не там вытокі дакументалізму, спавядальнасці і вытанчанасці формы сучаснай беларускай прозы?

Для самога Філіповіча пісанні яго – не самамэта. Дзённік душы. Шчырае змаганне за праўду.

* * *

Воляю лёсу ён стаў апошнім беларускамоўным пісьменнікам. Ва ўнутраным разладдзі, нягодах, войнах тануў залаты век старабеларускай дзяржавы. Пісьменства ў нашай мове перарывалася амаль на два стагоддзі.

* * *

На радзіме турботы свае, не вырашыць іх нехта, нават магутны, збоку.

* * *

Штогод на праваслаўны Вялікдзень сыходзіць на Дамавіну Гасподнюю святы ачышчальны агонь. Сведчанне адзінай праўды, аб якой запаветаваў нам Ісус Хрыстос.

Мы чакаем цуда, імкнёмся вярнуць спакусай і нявер'ем страчаную Дабрадаць Гасподнюю. І няхай нам хопіць на гэтае сілы.

* * *

Кроў, крэўнасць, крывічы, Крэва...

Мы ходзім па праху дзядоў сваіх.

Спрадвечнасць слоў гэтых востра адчуваецца тут, на асвечанай гісторыяй крэўскай зямлі.

* * *

Юрава гара, за паганскімі часамі Ярылава, гарадзішча, Крэўскі замак, першы цалкам мураваны ў Вялікім княстве Літоўскім, нашым старадаўнім гаспадарстве, які паўстаў дзеля ўратавання ад крыжацкай навалы.

Вядомыя з летапісаў і хронік падзеі набылі тут асабліваe гучанне пасля смерці ў 1377 годзе вялікага князя Аляксандра.

* * *

Вітаўт. Ягайла. У кожнага з іх, пахрышчаных Крэвам, быў свой шлях, акрэслены гісторыяй.

* * *

Ягайлу чакаў шлюб з дачкой вугорскага караля Людовіка, польскай каралевай Ядвігай. Так пачыналася дынастыя Ягелонаў, якая блізу 200 гадоў давала каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх і сыграла сваю ролю ў еўрапейскай гісторыі.

Вытокам было Крэва, вотчынны замак Ягайлы.

* * *

Пасля кастрычніцкага перавароту 1917-га воляю лёсу з губернскага горада Мінск пачаў станавіцца сталіцай. Немінуча ён мусіў набываць і новы воблік.

Найбольш спрычыніўся да гэтага піцерскі архітэктар, наш зямляк з мястэчка Бельск Іосіф Лангбард. Па ягоных праектах да вайны ўзведзены будынкі, якія вызначылі твар сталіцы і сталі сведкамі гісторыі горада і рэспублікі.

* * *

У паваенныя дзесяцігоддзі людзі верылі ў светлую будучыню. Сваёй стваральнай працай імкнуліся яе наблізіць. Жыццё ішло па планах партыі. У будынках Лангбарда праходзілі з'езды, практычна ўсе «лёсавызначальныя».

* * *

Са сваім з'яўленнем каляровая кінахроніка яскрава выявіла пераважны колер савецкіх часоў – чырвоны. Горад рос, дэманстрацыі рабіліся ўсё больш шматлюднымі. Будынкі Іосіфа Лангбарда таксама мянялі свой колер у нагу з часам.

* * *

Палітычныя хвалі коцяцца, а бераг па-сапраўднаму стваральнага жыцця яшчэ ў тумане. Пасля дзесяцігоддзяў савецкай улады людзям няпроста разабрацца ў цяперашнім вірлівым часе.

* * *

Будынкі Лангбарда жывуць сваім будзённым жыццём. Як сапраўдныя шэдэўры, яны перажылі свой час, і сёння засталіся буйнейшымі грамадскімі пабудовамі Мінска. Што засведчаць яны свету і гораду заўтра?

* * *

Беларускі кінематограф. Яго існаванне ўяўляе сабою значную з'яву ў гісторыі нацыянальнай культуры дваццатага стагоддзя. Яго неацэнны здабытак – экранны вобраз беларускага народа, створаны цягам дзесяцігоддзяў.

Кіно стала неад'емнай часткай гісторыі дзяржавы. Уласна, гэта ёсць сама гісторыя ў мастацкіх вобразах і кадрах кінахронікі.

* * *

За апошняе дзесяцігоддзе створаны своеасаблівы кінапантэон выбітных постацей Беларусі, па-новаму асэнсаваны шмат якія старонкі яе гісторыі.

* * *

Дзякуючы дакументальнаму кіно сёння можна ўявіць у экранных вобразах гістарычны шлях Беларусі. Фільмы з маркай студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» выклікалі непадробную цікавасць у гледачоў, атрымалі шырокі грамадскі розгалас.

* * *

Сотні тысяч кіламетраў кінаплёнкі, металічныя скрынкі, дзе яна захоўваецца. Гэта і ёсць уласна фільмы ў іх матэрыяльным увасабленні, наш скарб.

* * *

Мазыр не зблытаеш ані з якім іншым горадам. Нездарма гэтыя мясціны называюць «беларускай Швейцарыяй». Груды, яры, вуліцы на крутых схілах.

* * *

Праца хлебароба падобна творчасці мастака. Кожную пару года ён дадае свае мазкі на жывое палатно прыроды. І заўсёды карціна атрымліваецца непаўторнай.

* * *

Чарнобыль ды іншыя экалагічныя клопаты, якія назбірала бурнае XX стагоддзе, развязваць ужо нашым дзецям у но-

вым XXI стагоддзі. Як важна сёння, каб яны разумелі ўсю складанасць узаемаадносін чалавека і прыроды.

Здаецца, што прасцей: беражліва адносся да раслiннасці, не крыўдзі братоў нашых меншых.

* * *

Непаўторныя беларускія краявіды. Усёю душою аддацца б прыгажосці роднай прыроды. Але... У кожнага беларуса ўспрыняцце гэта мімаволі азмрочваецца словам «Чарнобыль».

* * *

Найбуйнейшая тэхнагенная катастрофа XX стагоддзя – аварыя на Чарнобыльскай АЭС – найбольш глыбокую рану нанесла Беларусі.

* * *

І ўсё ж узыходзіць і заходзіць сонца, прыцягвае сваёй разнаколернасцю дарога ў неба – вясёлка. Жыццё працягваецца і ў постчарнобыльскую эпоху.

* * *

Заснежыла шляхі зіма, завіхурыла. Зноў брысці па цаліку першапуткам.

* * *

Дзяцінства. Адтуль і адчуванне свабоды, якая па меры ўжывання ў рэчаіснасць усё больш абмяжоўваецца.

* * *

Лёс кожнага чалавека ўвалплецены ў поступ дзяржавы.

Куды вядзе твой шлях, Беларусь?

* * *

Пачатак стагоддзя – незвычайная дата ў жыцці чалавека. Быццам ізноў усё пачынаецца ўпершыню. Але гэта хутчэй псіхалагічнае пачуццё.

* * *

Вольны час нашых дзяцей Гэта заўсёды турбота і для бацькоў, і для грамадства, якое павінна праяўляць клопат аб падрастаючым пакаленні. Востра паўстала яна цяпер ва ўмовах няўстойлівасці жыцця і змены прыярытэтаў. Сыходзіць старое, з'яўляецца новае.

* * *

Картынг. Толькі той, хто сам быў за рулём, здольны зразумець хваляванне і азарт хлапчукоў, якія зліліся са сваімі машынамі.

* * *

Галоўнае – у любых абставінах захоўваць волю да перамогі. Тады яна абавязкова прыйдзе.

Зразумела, нехта сёння прайграў. Але адчайвацца нява́рта. У цябе яшчэ будзе шанец перамагчы.

* * *

Ветразі маленькіх яхт, як крылы матылькоў, трапечуць на ветры, адбіваючы блікі вады. Здаецца, адно імгненне – і ты ўжо пад сапраўдным ветразем закладваеш круты віраж.

* * *

Беларусь – не марская дзяржава. І тысячы нашых цудоўных рэк і азёр не змогуць замяніць марской прасторы.

* * *

Толькі пастаянная работа дае вынік. За кожнай з карцін – часцінка жыцця мастака, часцінка яго душы.

* * *

Зіма для скульптара – гэта магчымасць засяродзіцца, асэнсаваць новыя ідэі, папрацаваць з цудоўным пластычным матэрыялам – глінай, якая так паслухмяная рукам.

А летам – камень, самы цяжкі, але ўдзячны скульптурны матэрыял.

* * *

Маладосць і вясна – паняцці непадзельныя. Хто зможа ўстаяць перад буйным квітненнем прыроды, перад жыццём, якое адвечна адраджаецца?

* * *

Непаўторнай прыгажосцю зямлі немагчыма не захапляцца. Мастак на палатне стварае свой вобраз гэтай прыгажосці, які абавязкова знойдзе водгук у душы гледача.

* * *

Якраз у восеньскім стане прыроды можна знайсці заспакаенне, вызваліцца ад рэчаіснасці. Чалавек не можа жыць на адной ноце, душа ўсё часцей патрабуе спакою, сузірання. Восень больш за ўсё спрыяе гэтаму.

* * *

Мінск рос і будаваўся фенаменальна хутка ўсе пасляваенныя дзесяцігоддзі. Ён набываў новы твар, людзі з энтузіязмам і верай у будучыню ўзводзілі свой горад, абжывалі яго. Фармаваўся і новы цэнтр сталіцы.

* * *

Галоўныя плошчы сталіцы.

Плошча Незалежнасці. Архітэктурна завершана ў канцы 80-х гадоў.

Плошча Перамогі. Самы цэласны і гарманічны ансамбль цэнтра, які склаўся яшчэ ў сярэдзіне 50-х.

Больш за ўсё па часе чакала свайго завяршэння цэнтральная, Кастрычніцкая плошча.

* * *

Кастрычніцкая плошча – месца сустрэчы новага цэнтра сталіцы са старым, Верхнім горадам. Перапляценне стагоддзяў стварае непаўторны вобраз любімага старадаўняга і маладога Мінска.

* * *

Крыжы на званіцах і купалах храмаў. Сімвалы духоўнасці, якая вяртаецца на беларускую зямлю. Выспачкі зноў здабываемай дабрадаці.

* * *

Царкоўны перазвон у першыя дзесяцігоддзі савецкай улады стаў зусім знікаць з нашага жыцця. Апошні праваслаўны храм у сталіцы Беларусі Мінску быў закрыты ў 1937 годзе.

Сёння, гледзячы кадры кінахронікі, дакументальныя сведчанні часу, нельга не здзівіцца, як моцна ўдалося ўбіць у галовы людскія ваяўнічы атэізм, як хутка змаглося разбурыць духоўныя традыцыі продкаў.

* * *

Продкі нашыя любілі і ўмелі будаваць храмы – знакі дабрадаці Гасподняй на дадзенай ім Богам зямлі.

* * *

Архітэктура ва ўсе часы была ўвасабленнем і адлюстраваннем чалавечага жыцця. Немагчыма ўсвядоміць, як шмат культурных каштоўнасцей створана ў лоне царквы.

* * *

Надоўга перарваныя традыцыі храмавага будаўніцтва сталі адраджацца ў канцы 80-х гадоў XX стагоддзя. Запатрабавалася забытая прафесія царкоўнага дойліда.

* * *

Будаўніцтва храма – не самамэта. Гэта сродак духоўнага адраджэння, адраджэння вялікага пласта жыцця і культуры, страчанага і зноў набываемага.

Іканапіс, ганчарства, мастацкая коўка, манументальны роспіс – храм патрабуе сінтэза ўсіх мастацтваў. Можна набыць фабрычныя штампованыя рэчы, але яны не нясуць у сабе цяпло рук і душы майстра-верніка.

* * *

Будаўніцтва цэркваў запатрабавала для жыцця і майстэрства ліцця званоў і пакліканне званароў.

* * *

Царкоўны дабравест паядноўвае ўсе стагоддзі нашай хрысціянскай гісторыі, сцвярджае неадваротнасць духоўнага адраджэння.

Варта акрэслена ўсведамляць, што без гэтага не будзе і адраджэння нацыянальнага. Толькі калі паверыш, што ўсё на зямлі створана промыслам Божым, што чалавеку, вянцу тварэння, трэба жыць у любові, мы зможам дарэшты ўсвядоміць, што беларуская нацыя ўзнікла невыпадкова, што народу нашаму дадзены Госпадам найбольшыя святыні – родная зямля і матчына мова, якія мы павінны берагчы і памнажаць як дар Божы. Толькі тады мы зможам пабудаваць наша жыццё і дабудаваць сваю Беларусь.

* * *

Духоўныя традыцыі немагчыма вынішчыць, як і немагчыма спыніць самое жыццё. Надыдзе час, калі званы дабравесту будуць чуваць па ўсёй Беларусі.

# НА МЯЖЫ СТАРАДАЎНЯЙ ЛІТВЫ

Косава – мястэчка майго маленства, сямі дашкольных гадоў. Тут з’явіўся я на свет у 1953 годзе, які памятны як год смерці «бацькі ўсіх народаў» Сталіна. Але што мне было да таго? Праўда пра сталінскія часы прыйдзе значна пазней, ужо ў сталым узросце. Найпершы і светлы (а ці бываюць іншыя ў маленстве?) успамін – дзіцячы дом, дзе мой бацька працаваў дырэктарам. Жыла наша сям’я ў доме побач, натуральна, што першымі маімі знаёмымі і сябрамі сталі якраз дзетдомаўцы. Крыху падросшы, мы са старэйшым братам рэзаліся з імі ў карты, хаваючыся ад бацькоў. Гулялі ў лапту, што было весела і рухава. Глядзелі дыяфільмы. Мо адтуль у мяне спраўджаная ў жыцці (сямнаццаць гадоў работы ў кіно) любоў да светлага экрана ў цёмнай залі?

Цяпер разумееш, што ў дзетдомаўцаў дзяцінства якраз і не вызначалася бясхмарнасцю. Пасляваенныя бязбацькавічы, беспрытульнікі, бадзяжнікі – колькі іх было на Беларусі, колькі такіх дзетдомаў існавала? Мой зачынілі ў сярэдзіне 60-х, калі ўжо наша сям’я пераехала з Косава ў вёску Даманава таго ж Івацэвіцкага раёна. Дарэчы, у будынку, дзе месціўся дзіцячы дом, у вайну знаходзілася гестапа.

Другой яркай згадкай маленства быў касцёл, які стаяў на другім баку брукаванай вуліцы насупраць дзетдома. Ён здаваўся мне высокім, змрочным, непадступным. Мы любілі лазіць па цвінтары, абыходзіць будыніну з усіх бакоў. Па словах бацькі, касцёл зрэдчас працаваў, але памяць не захавала мяне малога ўнутры храма. Напэўна, каб не парушыць стан містычнага рамантызму, у якім трымала спаруда хлапчука сваёю закінутасцю. Даўно ўжо дрэвы перасталі здавацца высокімі, паменшаў для мяне і горад, святыня цяпер не выдае сягаючай аблокаў. Затое прыйшло ўсведамленне, што храм не можа быць змрочным. Згадаць толькі вузкія стральчатыя вокны з вітражамі на бакавых фасадах, якія ствараюць цудоўнае вясёлкавае асвятленне ўнутры. Святло надае прыгажосць рэчам, а праз пазнан-

не прыгажосці чалавек набліжаецца да пазнання Хрыста – сапраўднага святла, што высвечвае свет.

Троіцкі касцёл у Косаве – адзін з першых на Беларусі культавых помнікаў архітэктуры неаготыкі. Пабудаваны ён у 1878 годзе на ахвяраванні Вандаліна Пуслоўскага і парафіян. Дапамагалі таксама мясцовыя памешчыкі Астрамецкія і Юндзілы. Першы ж касцёл быў узведзены тут у 1526 годзе, праз сто гадоў новы храм заснаваў знакаміты Леў Сапега, якому на той час належала Косава. Будынак быў драўляны, згарэў у 1872 годзе. На гэтым жа месцы і паўстаў мураваны, які і сёння радуе вока гатычным імкненнем у неба.

Ёсць у Косаве і царква ў цэнтры горада. Памятаю, што па нядзелях там было людна, дзень кірмашу, а вось сам храм не адбіўся ў дзіцячай свядомасці. Потым ужо я разабраўся, што гэта звычайны ўзор мураўёўскай архітэктуры рэтраспектыўнарускага стылю. Антонаўская царква паўстала ў 1868 годзе. Добра хоць тое, што яна існавала і не зачынялася.

Самай жа таямнічай казкай маленства быў напаўразбураны палац, які знаходзіўся недалёка ад Косава ў Марачоўшчыне. Агромністае прадстаўнічае збудаванне хвалявала сілуэтам вежаў з гатычнай апрацоўкай, стральчатыя вокны, як у касцёле, зеўралі пустымі праёмамі, адкрытыя скляпенні вабілі залезці і адкрыць для сябе нейкую таямніцу. Сёння цяжка згледзець палац нават у яго вонкавай велічы, — зарос наўкола лесам. Толькі сілуэт цэнтральнага аб'ёму праглядваецца над вершалінамі дрэў.

Палац узвёў у 1838 годзе граф Войцэх Пуслоўскі, апошні ўладальнік Косава. Ёсць меркаванні, што ён здолеў значна памножыць свае багацці падчас руска-французкай вайны 1812 года (вайна заўсёды камусьці нясе прыбытак). Таму і мог дазволіць сабе такое шыкоўнае збудаваннне, якое нагадвала замак-крэпасць: зубчаты парапет, вузкія шчыліны-байніцы, васьміграннныя вежы-вартаўнікі. Праект выканаў варшаўскі архітэктар Францішак Яшчолд. Праўда, готыка тут толькі ў аздабленні, сама аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя захоўвае пануючую на той час класіцыстычную ўраўнаважаную кампазіцыю. Такое вось спалучэнне. У будаўніцтве прымаў удзел таксама архітэктар У. Марконі, роспісы заляў выканаў мастак Ф. Жмурка.

Дзе тыя роспісы? Толькі згадкі пра іх засталіся. Лёс палаца склаўся незайздросна: пасля паўстання 1863—1864 гадоў ён перайшоў у рукі маскоўскай арыстакратыі – князёў Трубяцкіх і Альдэнбурскіх. Урэшце стаў маёмасцю казны. У першую сус-

ветную вайну разрабаваны немцамі, за Польшчай тут знаходзілася староства Косаўскага павету і першая на Беларусі школа пчалярства. Пасля апошняй вайны засталіся толькі велічныя рамантычныя руіны. Гавораць, што замак спалілі савецкія партызаны.

А вось дом, дзе нарадзіўся герой Беларусі, Польшчы, Францыі і Амерыкі Тадэвуш Касцюшка, не захаваўся. Сядзіба месцілася непадалёку ад замка, уласна, гэта і называлася маёнткам Марачоўшчына. Бацька кіраўніка паўстання 1794 года «за вольнасць нашу і вашу» Людвік Касцюшка пераехаў сюды у 1729 годзе, праз адзінаццаць гадоў ажаніўся з Тэкляй Ратомскай і ў іх нарадзілася чацьвёра дзяцей. Апошнім быў якраз Андрэй Тадэвуш Банавентура. Цікава, што нават трайное імя славутага сына Беларусі ёсць адбіткам нашай няпростай гісторыі. Першае – праваслаўнае, другое (Фадзей-Тадэвуш) – уніяцкае, трэцяе – каталіцкае. Адсюль і непаразуменні з датай яго нараджэння. Адны лічаць яе 4 лютага 1746 года згодна запісу аб хрышчэнні ў Косаўскім касцёле. Іншыя называюць 30 лістапада 1745 года на той падставе, што хрысцілі яго спачатку ў праваслаўнай царкве і далі імя ў гонар Св. Андрэя Першазваннага, свята шанавання памяці якога выпадае якраз на гэты дзень. Мне асабіста апошняе здаецца больш верагодным, бо маці Касцюшкі паходзіла з праваслаўна-уніяцкага роду, не адзінымі былі выпадкі, калі дзяцей, раней хрышчаных у царкве, потым паўторна хрысцілі ў касцёле.

У доме Касцюшкі пры Польшчы быў музей, памяць нацыянальнага героя шанавалі. Згарэў будынак перад самым вызваленнем Косава летам 1944 года. Хто яго падпаліў – так і невядома, у народзе ходзіць пагалоска, што і тут без партызанаў не абышлося. Сёння невялікі пагорак, дзе можна яшчэ згледзець радок камянёў ад былога падмурку, абнесены ланцужком, пастаўлены мемарыяльны камень. Расце невялічкае дрэўца глог, якое восенню асыпае на зямлю чырвоныя ягады. Яскравы, на жаль, прыклад нашых адносін да сваёй гісторыі, якой нас зусім не так, як трэба, вучылі ў школе, якой мы па-сапраўднаму не ведалі. І толькі ў апошняе дзесяцігоддзе яна вяртаецца да нас мясцінамі, падзеямі, асобамі. Вяртаецца ва ўсёй велічы і Тадэвуш Касцюшка.

Мой славуты зямляк неаднойчы падкрэсліваў: «Нарадзіўся я ліцвінам». Гэта значыць – беларусам. У той даўні час усе жыхары сучаснай Беларусі як нашчадкі Вялікага княства Літоўска-

га называлі сябе ліцьвінамі. Праўда, у гэтым выпадку мне бачыцца і больш канкрэтны змест. Практычна да Косава даходзіць вялікі лес Літва, што цягнецца ад Слоніма. У Івацэвіцкім жа раёне, паўторым, ёсць і балота Пагоня. Гэта сведчыць, што якраз тут праходзіла паўднёвая мяжа летапіснай Літвы, акрэсленай гісторыкам Міколай Ермаловічам, якая дала назву нашай старабеларускай дзяржаве. Адзначым яшчэ раз: ад земляў у цэнтры Беларусі пайшло Вялікае княства Літоўскае, а зусім не ад сучаснай Летувы, як гэта сцявярджалі царскія гісторыкі, каб Беларусь лічыць «исконно своей». На мяжы вось той, старадаўняй Літвы і ўзнікла мястэчка Косава.

Упершыню Косава згадваецца ў прывілеі вялікага князя Аляксандра аб дараванні гэтага маёнтка маршалку Яну Літавору Храптовічу. Датаваны ён 11 чэрвенем 1494 года. Потым Косава належала Осцікам, Сангушкам, Сапегам, Флемінгам, Чартарыйскім, Пуслоўскім. Шмат цікавых старонак мае гісторыя горада, і ўсе яны сведчаць, што тут заўсёды жыў вольналюбівы ліцвінскі дух. Прыкладаў шмат. Адна з легенд назву Косава звязвае з імем Касы, які быў кавалём і ў часы набегаў татар каваў зброю, якою жыхары біліся з ворагам. Калі людзі ішлі да яго, казалі, што ідуць да Касога, і месца, дзе ён жыў, паступова пачалі называць Косава. Прыгожае паданне, але неспатоленая цікаўнасць у мяне застаецца: а ці ёсць усё-такі сувязь назвы майго горада з краем Косава ў Югаславіі?

Не стаялі ў баку касаўчане падчас паўстання 1863—1864 гадоў. У гэтых мясцінах дзейнічалі атрады Ф. Юндзіла, А. Лянкевіча (Ляндэра). Каля Косава ў той жа Марачоўшчыне адбыўся бой атрада В. Урублеўскага з трыма ротамі рускіх войскаў. На каталіцкіх могілках у горадзе ў 1928 годзе пастаўлены помнік паўстанцам Каліноўскага. А вось Шыбельная гара па дарозе з Косава ў Івацэвічы яшчэ чакае свайго мемарыяльнага знака. Справа ў тым, што ў 1864 годзе ў лесе на гэтай гары царскія карнікі павесілі 20 паўстанцаў. На дрэвах-шыбеніцах людзі прымацавалі абразкі, тым самым увекавечылі памяць змагароў, якія тут жа і былі пахаваны. З часам іконкі ўраслі ў дрэвы, зацяклі смалою, але яшчэ ў канцы 40-х гадоў мінулага стагоддзя іх бачыў мой бацька. Потым лес высеклі, засталася толькі гара.

Вольналюбівы ліцьвінскі дух праявіўся і ў часы першай рускай рэвалюцыі. У кастрычніку 1905 года ў Косаве адбылося выступленне 900 прызыўнікоў. Вялікі натоўп жыхароў прайшоўся па вуліцы з воклічамі «Далоў паліцыю, бі яе!». Было захопле-

на паштовае аддзяленне, растаптаны партрэт цара. У адказ паліцыя адкрыла агонь, забілі і паранілі некалькі чалавек.

Асабліва вызначылася Косава паўстаннем 3 лютага 1927 года супраць разгрому польскімі ўладамі Беларускай сялянска-рабочай грамады. Каля паўтары тысячы месцічаў і сялян з навакольных вёсак выйшлі на дэманстрацыю з лозунгамі «Вызваліць усіх палітычных зняволеных!». Адбыўся мітынг. Паліцыя пачала страляць у дэманстрантаў, шэсць чалавек было забіта, некалькі дзесяткаў паранена. Розгалас пайшоў вялікі, гэта было найбольш буйнае выступленне ў Заходняй Беларусі супраць польскай палітыкі нацыянальнага і сацыяльнага заняволення. А знакаміты Косаўскі бой у апошнюю вайну? У ноч на 3 жніўня 1942 года партызанскімі атрадамі імя Шчорса, імя Дзімітрава ды імя Варашылава пры ўдзеле антыфашысцкага камітэта была падрыхтавана і праведзена смелая аперацыя па разгроме нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Косаве. Пасля гэтага горад на працягу месяца знаходзіўся пад кантролем партызан. Праўда, я так і не магу даўмець глыбіннага сэнсу гэтага бою. Проста партызанам трэба было паказаць акупантам сваю моц, правесці буйную аперацыю. Выбар спынілі на Косаве.

Калі глядзіш сёння на ціхі правінцыйны гарадок, дзе жыве 2700 чалавек, цяжка ўявіць, што ўсё вышэйзгаданае, як і шмат чаго іншага, адбывалася тут. Косава ўжо ў 1949 годзе перастаў быць раённым цэнтрам, ды і ляжаў ён наўзбоч магістральных шляхоў, адпаведна і развіццё горада запаволілася. Што казаць, калі нават насельніцтва не дасягнула даваеннай колькасці (3850 жыхароў). Тлумачэнне гэтаму ёсць – вынішчэнне фашыстамі яўрэяў. Косава было тыповым для Беларусі мястэчкам з пераважна яўрэйскім жыхарствам. Нават сто гадоў таму тут жыло больш людзей. Паводле расійскага перапісу ў горадзе налічвалася 3092 жыхары. З іх праваслаўных – 725, каталікоў – 321, яўрэяў – 2028.

І ўсё ж дух заходнебеларускага гарадка, слаўнага сваёй 500-гадовай гісторыяй, у Косаве захаваўся. Здаецца, вырашана пытанне пра аднаўленне палаца і ўзвядзення нанова сядзібы Касцюшкаў. Думаецца, праз дзясятак гадоў прыток турыстаў дасць новы штуршок жыццю маёй малой радзімы.

# ЗЯМНЫМІ ШЛЯХАМІ ЗБАВІЦЕЛЯ

Дольнія і горнія шляхі беларускага народа. Адбітак іх – у лёсах падзвіжнікаў: Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Афанасія Брэсцкага, Сафіі Слуцкай, дзіцяткі Гаўрыіла Беластоцкага ды ўсіх іншых святых, што ў зямлі беларускай заззялі. Адбітак іх – у матэрыяльных знаках нашай хрысціянскай гісторыі: абразах, крыжах, кнігах, храмах, манастырах, як тых, што ацалелі за віхурамі часу, так і зніклых за меміласэрнасцю стагоддзяў, але не зніклых з гэтым бясследна, дзякуючы волі Госпада, з духоўнага ўжытку. Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр з царквою святога Спаса і Сафійскі сабор у Полацку, Каложская (Барысаглебская) царква ў Гродна, Жыровіцкі манастыр з цудадзейным абразом Божай Маці, касцёл у Ішкальдзі, царква ў Сынковічах, Супрасльскі манастыр, Тураўскае Евангелле ды кнігі Скарыны і Буднага, Еўфрасіннеўскі крыж і каменныя крыжы ў Тураве, крыж на гербе нашым старадаўнім «Пагоня». Шэраг бясконцы, як бясконцае хрысціянства. Знакі любові Гасподняй на беларускай зямлі. Нашыя святыні, да якіх мы павінны імкнуцца, калі хочам быць сапраўднымі сынамі зямлі сваёй. Да якіх мы мусім імкнуцца, каб пакланіцца, малітваю падмацаваць знямоглыя сілы свае, растурзаныя спакусамі імклівага грахоўнага свету. Трэба толькі добрая воля і шчырае жаданне – дабрадаць Гасподняя разліта паўсюль, у любым куточку можна звярнуцца да Бога і ён пачуе нашыя літанні.

Але ёсць месца на зямлі, дзе Дабрадаць адчуваецца найбольш моцна, літаральна наяве. Гэта Святая Зямля, звязаная з зямным жыццём Ісуса Хрыста, куды мы таксама павінны імкнуцца, каб хоць раз у жыцці дакрануцца душою да жыватворных святыняў, дарагіх сэрцу кожнага хрысціяніна. Зямля гэтая была сведкаю Яго дзеяў, прароцтваў, цудаў і Яго апошняй найвысокай ахвяры. Тут увачавідкі ажываюць евангель-

скія падзеі, тут катэгорыя часу не мае сваёй улады. На Святой Зямлі асабліва яскрава прыходзіць асэнсаванне таго, што шлях наш ад хрышчэння да смерці ёсць хоць і нямоглай, але спробай наследаваць зямному ўдзелу Збавіцеля: кожны прымае хрышчэнне, трывае свае спакусы, нясе свой крыж, узыходзіць на сваю Галгофу.

Падсвядомае жаданне трапіць на Святую Зямлю жыло ўва мне заўжды. Ці не з таго моманту, калі баба Маня пахрысціла мяне? Не ў царкве, што ўзлятала на беразе Нёмана сваімі сямю купаламі ў неба і дзе баба спявала ў царкоўным хоры, а ў хаце, таемна, каб не нашкодзіць маім бацькам-настаўнікам. Ці ў той момант нарадзілася яно, калі на печы ў дзедавай хаце ўпершыню чытаў Святое Дабравесце, адкрываючы для сябе дзівосныя мясціны і дзеі Хрыста? А мо з таго часу, як уваходзілі ў свядомасць святыні зямлі беларускай – Фарны касцёл у Нясвіжы, Жыровіцкі манастыр, полацкія храмы? Адказ пакрыты смугою часу. Свядома ж і асэнсавана ўвайшло жаданне гэтае падчас працы ў дакументальным кінематографе. Яшчэ тады, напрыканцы 80-х, блізка ўжо было, ля дзвярэй, калі працавалі над фільмам пра Еўфрасінню Полацкую. Гэта ж факт яе зямнога жыцця – паломніцтва ў Іерусалім. Дык чаму ж і нам, каб паўней выявіць яе постаць, не зрабіць тое ж самае? Але тады надзеям так і не выпала збыцца. І толькі гадоў праз восем, калі здымалі фільм пра Афанасія Брэсцкага (Філіповіча), мне з двума маімі таварышамі-кіношнікамі пашчасціла пабываць на зямлі Ісуса Хрыста. Напраўдзе адчуў цудатворную сілу слоў евангельскіх: «Прасіце, і дасца вам; шукайце, і знойдзеце; стукайцеся, і адчыняць вам; бо кожны, хто просіць, атрымлівае, і, хто шукае, знаходзіць, і хто стукаецца, таму адчыняць».

Так і нам адчыніліся дзверы. Аказалася блізка гэта ад нашай Беларусі. І побач не толькі метафізічна, бо слова Дабравесця заўсёды з намі, але і фізічна: тры гадзіны лёту ад Мінска да Тэль-Авіва, потым каля гадзіны руху аўтобусам – і ты ўжо ў Іерусаліме. Нават і гадзіннік пераводзіць не трэба – часавы пояс Беларусі і Ізраіля аднолькавы. Астатняе ўсё нязвыклае, найперш паўднёвая спякота, якая пасля нашай красавіцкай прахалоды здаецца проста пякельнай. І, натуральна, сам адвечны горад, дзе ўсё дыхае гісторыяй, для нас перадусім гісторыяй хрысціянскай.

Уласна, з вандроўкай, ці ўсё ж хутчэй паломніцтвам, нам пашчасціла ўдвайне, бо трапілі мы на Святую Зямлю акурат на наш праваслаўны Вялікдзень, калі сыходзіць на дамавіну Гасподнюю Святы Дабрадатны агонь. Светлае Уваскрэсенне Хрыстовае – найвялікшае радаснае свята для ўсіх хрысціян, бо сваім уваскрэсеннем пасля пакутніцкай смерці на Крыжы за грахі нашыя і дзеля ўратавання нашага Гасподзь засведчыў любоў да чалавека, адкрыў яму шлях ад смерці да жыцця, ад зямлі да неба, напоўніў сэнсам яго зямное існаванне. Свята гэтае не знікала з жыцця нашага ніколі, нават у самыя бязбожныя часы савецкай улады людзі адзначалі Пасху, фарбавалі велікодныя яйкі, пяклі пасхальныя булкі, віталі шчыра ў гэты дзень адзін другога словамі: «Хрыстос Уваскрос!» і чулі ў адказ: «Сапраўды Уваскрос!». Яно сапраўды было найвялікім, хіба што супернічаць магло святкаванне Новага году, якім удалося ўсё ж падмяніць для народа Нарадзіны Хрыста. Вялікдзень мае глыбокі сакральны сэнс. Праз два тысячагоддзі існавання хрысціянства ў перадвелікодны тыдзень мы ўспамінаем апошнія дні зямнога шляху Ісуса Хрыста, смуткуем разам з Ім перад неадваротнасцю ўкрыжавання, смерці, а на Пасху радуемся Уваскрасенню, самі ўваскрасаем з Госпадам дзеля новага жыцця.

Жыць нам выпала ў праваслаўным рускім Горнім манастыры, што месціцца на маляўнічым схіле гары ў мястэчку Эйн-Карэм, сягоння ўжо частцы Іерусаліма. Гэта і было першым далучэннем да евангельскай гісторыі, бо месца святое для хрысціян, сюды прыходзіла Дзева Марыя да сваёй стрыечнай сястры Елісаветы, будучай маці Іаана Хрысціцеля. З вышыні схіла кожную раніцу любаваліся прыгожай панарамай Эйн-Карэма з сілуэтамі храмаў Наведвання і Св. Іаана Хрысціцеля. Храмы гэтыя ўзведзены на месцы евангельскіх падзей, належаць францысканцам. Амаль штовечара звілістымі шляхамі спускаліся ўніз, каб узяць вады з крыніцы, каля якой, згодна падання, і адбылася сустрэча Марыі і Елісаветы. Гаючая вада нагадвала ваду са святой крыніцы ў Жыровічах.

З Горнега манастыра і ляжалі кожны дзень нашы дарогі да святынь. Першым днём паломніцтва быў Вялікі Чацвер Страснога тыдня. Хто ж не ведае, што ён называецца «чыстым» на ўспамін таго, як Ісус Хрыстос абмыў ногі вучням сваім? У гэты ж дзень пасля Тайнай вячэры Ісус маліўся ў садзе Гефсіманскім,

там жа і быў прададзены Іудай. Гефсіманскі сад знаходзіцца на заходнім схіле Елеонскай гары, аддзеленай ад горада далінай Кедрон. Гара часта згадваецца ў кнігах Новага Запавету, сюды шматкроць прыходзіў Госпадзь са сваімі вучнямі ў начную пару для малітвы і супакаення, гутарак і навучання. У Гефсіманскім садзе, а гэта зусім невялікі кавалачак зямлі, і сёння можна ўбачыць на свае вочы з дзесятак пакручаных часам камлюкаватых аліўных дрэў, узрост якіх хаваецца за смугою стагоддзяў. Калі стаіш там, знікаюць сумненні, што якраз гэтыя дрэвы чулі поўныя душэўных пакут словы малітвы Ісуса перад укрыжаваннем: «Ойча мой! Калі магчыма, хай абміне Мяне чаша гэтая; але не як Я хачу, а як Ты». А зусім недалёка, таксама пад ценем аліў, у перадсмяротнай малітве праліваўся пот пакутніка «як кроплі крыві, што падалі на зямлю».

На Елеонскай гары размешчаны царква Усіх Нацый, храм Успення Дзевы Марыі, царква Слязы Ісуса і храм Марыі Магдаліны, які належыць замежнай рускай праваслаўнай царкве. Усе яны – месца паломніцтва вернікаў-хрысціян. Тут прыходзіць адчуванне, што ты — сам удзельнік евангельскіх падзей. Яно ўзмацняецца, калі ўзыходзіш на самую вяршыню Елеонскай гары. Адсюль адкрываецца непараўнальная цудоўная панарама Святога Горада. Дамінуе ў ёй купал мячэці Амара, храма над скалой, з якой узнёсся на неба Магамет. Гэта напамінак, што Іерусалім ёсць скрыжаваннем трох вялікіх рэлігій – Хрысціянства, Іудаізму, Ісламу, кожная з якіх мае ў горадзе свае найвялікшыя святыні. Для іудзеяў гэта сцяна Плачу, для мусульман – згаданая мячэць Амара, для Хрысціян – Храм Святой Дамавіны. Яго сілуэт таксама добра відаць у панараме старога Іерусаліма.

Для нас шлях да Святой Дамавіны пачаўся ў Вялікую Пятніцу ад будынка Прэторыі. Гэта тут Ісус Хрыстос быў увязнены ў цямніцы, тут адбываўся суд над ім пракуратара Іудзеі Понція Пілата, які абмыў рукі пасля рашэння іудзейскага народу аб укрыжаванні Хрыста, адсюль пачаўся крыжовы шлях Божага Пакутніка на Галгофу. Па вузкай каменнай лесвіцы, дзе двум чалавекам і не размінуцца, спускаемся ў сутарэнне. У суцэльнай скале высечаны пячоры-камеры. Вось вязніца Ісуса, побач турма разбойніка Варравы, якога памілавалі замест Хрыста. Наверсе, на вузкай вуліцы каля Прэторыі, паломнікаў ужо

не злічыць. Хвіліны чакання – і праваслаўныя іерархі выносяць крыж, да якога ўсе побач і ты сам імкнешся дакрануцца. Неўсвядомленае жаданне глыбей далучыцца да дзеі. Пачынаецца шлях, якім ішоў знясілены Хрыстос, згінаючыся пад цяжарам Крыжа. Крыжовы шлях вядзе па вуліцы Смутку альбо Віа Даляроса. Рух няспешны, старажытная вузенька вулка запоўнена людзьмі. Абапал яе шматлікія арабскія шапікі, крамкі, запоўненыя таварам. Але на гэта не звяртаеш увагі, засяроджваешся на сваім, згадваеш словы евангельскія: «І хто не бярэ крыжа свайго і не ідзе следам за Мною, той не варты Мяне».

Крыжовы ход выплывае да Храма Святой Дамавіны Гасподняй, плошча перад уваходнаю брамаю ўмомант запаўняецца людзьмі. Там, унутры храма, месца пакутніцкай смерці Збавіцеля: «І несучы крыж свой, Ён выйшаў на месца, называнае Лобным, па-яўрэйску Галгофа; там укрыжавалі Яго...» Калі чытаеш Святое Дабравесце, цяжка атаясаміць тыхчасовыя падзеі з рэальным месцам, дзе яны адбываліся. У Святым Горадзе ўсё робіцца відавочным – гэта тут, побач, у некалькіх кроках: Галгофа (даслоўна «месца чарапоў»), Пліта памазання, на якой ляжала цела Ісуса, калі Яго знялі з крыжа, і, нарэшце, сама Дамавіна, пячора ў скале, дзе быў пахаваны Хрыстос. Усё гэта ўнутры храма, пад адною страхою. Святая Дамавіна – велічнае і аб'ёмнае збудаванне, практычна гэта лаўра, дзе акрамя галоўных святыняў шмат капліцак, прыдзелаў, што належаць розным хрысціянскім цэрквам.

Другі раз у Святую Дамавіну мы трапляем ужо пад вечар у гэты ж дзень, у пятніцу. Усе пілігрымы ў чаканні галоўнай падзеі велікодных дзён у Іерусаліме – сашэсця Святога дабрадатнага агню на дамавіну Гасподнюю. Цуд адбываецца толькі на праваслаўны Вялікдзень як праява Божай дабрадаці. З году ў год цягам шматлікіх стагоддзяў Гасподзь сведчыць тым самым аб сваёй любові да нас грэшных. Сыходзіць Святы агонь у Вялікую Суботу, але тысячы паломнікаў у храме ўжо з вечара, бо з раніцы трапіць сюды немагчыма. На вячэрні становімся сведкамі вынасу плашчаніцы, палатна, у якое Ісус Хрыстос быў абгорнуты пры пахаванні. Праваслаўныя іерархі з многіх краін Еўропы тройчы абносяць плашчаніцу вакол капліцы Дамавіны Гасподняй, якая называецца Кувукліяй. Мне, як і да крыжа, пашчасціла дакрануцца да яе рукой.

Потым ужо ўсведамляеш, што нашае чаканне Святога агню доўжылася больш шаснаццаці гадзін. Але час там пралятае непрыкметна, тым больш мы вымушаны шукаць месца, каб грунтоўна атабарыцца са сваім кінематаграфічным начыннем. Нарэшце ўсталёўваемся ля падножжа Галгофы і больш ужо нікуды не зрушваемся. Каля Галгофы, у храме Святой Дамавіны ды яшчэ і на Вялікдзень – аб гэтым можна было толькі марыць! Выключнасці стану, хутчэй, не усведамляеш у той момант, як і не ўсведамляеш, што зараз на тваіх вачах адбудзецца цуд. Не адбіцца ад мімалётнай думкі: а ці верыш сам у цуд, ці верыш у сашэсце Святога агню? Так і не знаходзіш пакуль адказу, моцна ўсё ж сядзіць у нас убіты за гады суцэльнага атэізму рацыяналістычны, матэрыяльны пачатак.

Наўкола тысячы людзей. Большасць спрактыкаваныя – сядзяць на прынесеных з сабою раскладанчыках. Сярод паломнікаў самая вялікая колькасць грэкаў і румынаў, у асноўным людзі простыя. Ёсць і з Расіі – пераважна святары, манахі ды манахіні. А з Беларусі на той час толькі мы ўтрох. Гучаць розныя мовы, у звязку з гэтым здаюцца марнымі спрэчкі нашы ўнутраныя: быць ці не быць мове беларускай у святынях Беларусі? Зразумела, быць. Сумненні ў моцы і бязмежнасці Госпада, што Ён можа не зразумець шчырыя словы, звернутыя да Яго ў роднай для чалавека мове, валодаюць толькі тымі, хто не верыць. Нягучнае шматгалоссе ў Святой Дамавіне сведчыць аб несмяротнасці хрысціянства, уздымае над мітуснёю жыцця кожнага з нас у сваіх краінах.

Згадваецца, што нашая назва свята Пасхі «Вялікдзень» – старадаўняя, яе знаходзім ужо ў святіцеля зямлі беларускай Кірылы Тураўскага: «воскресение Христово Велики день нарицается...». Успамінаецца таксама, што да дамавіны Гасподняй тры разы прыходзіла святая апякунка Беларусі Еўфрасіння Полацкая, якая ажыццявіла паломніцтва на Святую Змлю на схіле свайго жыцця. Усведамляеш, што адбывалася тое якраз напрыканцы красавіка, як і зараз, роўна 830 гадоў таму. Пахаваная яна была ў Феадосьеўскім манастыры бліз Іерусаліма. Праўда, сам гэты факт пілігрымкі Еўфрасінні толькі канстатуецца ў нас на Беларусі ў шматлікіх публікацыях пра яе, асэнсавання глыбокага няма, не акцэнтуецца повязь сапраўднага верніка з зямлёю Ісуса Хрыста.

Дабрадатны агонь сыходзіць у перадвялікодную суботу ў адзін і той жа час, пасля гадзіны дня. Атрыманне яго належыць выключна праваслаўнаму Іерусалімскаму Патрыярху. Аднойчы армянам ўдалося аспрэчыць гэтае права, але намаганні іхныя былі марнымі, агонь сышоў не на дамавіну, а на каменную калону ля ўваходнай брамы ў Храм, раскалоў яе. Цяпер гэтая расколіна – прадмет асаблівага шанавання праваслаўных вернікаў.

Працэс з'яўлення Святога агню знаходзіцца пад строгім наглядам грамадзянскіх улад Іерусаліма. Напярэдадні, у Вялікую Пятніцу, у храме тушацца ўсе агні, само памяшканне Кувуклії пільна даследуецца, потым на ўваход накладваецца пячатка. Мы самі яе бачылі. Перад дзеяй Патрыярха аглядаюць, здымаюць адзенне і мітру, ён застаецца ў падрасніку. Толькі пасля здымаюць пячатку, і Уладыка можа зайсці ў Дамавіну. Праз некаторы час, пасля рупнай малітвы, сыходзіць Дабрадатны агонь. Перад гэтым быццам маланкі праблісквають у прасторы храма, тысячы людзей сцішыліся ў чаканні. І вось адбылося! Патрыярх запальвае пучкі свечак (па 33 свечкі ў кожным, па ліку гадоў зямнога жыцця Збавіцеля) і перадае прысутным у храме. Людзі далей перадаюць агонь адзін аднаму сваімі пучкамі, ён разліваецца хваляй; вокамгненна, літаральна праз некалькі хвілін яны гараць ужо ў кожнага, увесь храм свеціцца незямным святлом. Запальваем і мы свае свечкі, я абмываю твар агнём – на працягу першых імгненняў ён не апякае. Усялякія сумненні мінаюць – сапраўдны цуд, які адбыўся на тваіх вачах! Радасць і ўрачыстасць людзей бязмежныя. Усе выходзяць з храма з агнём, здаецца, цэлы стары горад ахінуты дабрадаццю Гасподняй.

Пад моцным уражаннем мы сустракаем Вялікдзень у сваім Горнім манастыры. Аднаго Святога агню даволі было б у гэтай пілігрымцы, але, дзякаваць Богу, у першыя дні Святой Сядміцы нас яшчэ чакаюць дзівосныя сустрэчы з іншымі святынямі Зямлі Ісуса Хрыста, таксама ўражлівыя і незабыўныя. У панядзелак шлях наш ляжыць у старадаўнюю Галілею, да тых мясцін, дзе адбываліся шмат якія евангельскія падзеі. Едзем па Іудзейскай пустэльні, але тут сэнс слова «пустэльня» не спрацоўвае, гэта не пяскі і барханы, а скаліста-пясчаныя горы, практычна без раслліннасці, што маляўніча праплываюць міма.

Бліжэй да Іерусаліма яны пакрыты яшчэ травой і дрэўцамі, у схілы нібы ўціснуты вялізныя камлыгі. Становіцца зразумелым адзін з момантаў спакусы Хрыста: «І прыступіў да яго спакуснік і сказаў: «Калі Ты сын Божы, скажы, каб камяні гэтыя сталі хлябамі». А Ён сказаў яму ў адказ (напісана): «Не хлебам адзіным будзе жыць чалавек, а ўсякім словам, якое сыходзіць з вуснаў Божых». Дык вось, валуны сапраўды выдаюць на выпечаныя хлябы!

Сама Гара спакусы. Памятаеце: «Зноў бярэ Яго дыявал на вельмі высокую гару і паказвае Яму ўсе царствы свету і славу іх, і кажа Яму: «Усё гэта Табе дам, калі ўпаўшы паклонішся мне». Тады кажа яму Ісус: «Адыдзі ад Мяне, сатана, бо напісана: «Госпаду Богу твайму пакланяйся, і Яму аднаму служы». Гэтая суровая скалістая гара быццам навісае над горадам Іерыхонам і далінаю ракі Іярдан. Пасярэдзіне гары прыляпіўся да скал ці вырастае з іх Грэчаскі праваслаўны манастыр. Карціна невыказна маляўнічая. Пачынаем падымацца. Да манастыра яшчэ адносна лёгка, нягледзячы на невыносную гарачыню. Там перадых, малебен у капліцы, якая пазначае месца, дзе Ісус, згодна padання, трымаў пост сорак дзён і сорак начэй. Адбітак ступні Збавіцеля на камені – так, якраз тут ён сядзеў у задуменні. Прыкладваемся і мы да святога каменя. Пасля па камяністай пакручастай сцяжынцы пад'ём на вяршыню, да таго ж мы яшчэ і з нялёгкім кіношным грузам. Хвілінай здаецца, што моцы ісці ўверх больш няма. Ды нямогласць адступае, Гасподзь дае сілы. І вось мы на вяршыні. Руіны храма, які калісьці стаяў тут; наўкола ва ўсе бакі – цудоўная панарама. Сапраўды, усе царствы свету перад табою.

На Гару Сарака дзён, як яе яшчэ называюць, Хрыстос прыйшоў пасля свайго хрышчэння ў рацэ Іярдан ад Іаана Хрысціцеля. Працяглы час едзем уздоўж гэтай нешырокай рэчкі, яна ўнізе, у даліне, за ёй ужо краіна Іярданія. Іудзеі гэтым шляхам не карыстаюцца, бо тут арабская частка Ізраіля, а нас тое абыходзіць, мы проста паломнікі. Нарэшце пад'язджаем да самой ракі, да таго месца, дзе адбывалася хрышчэнне. Гэта побач з Галілейскім морам, куды Іярдан уцякае на поўначы і адкуль выцякае на поўдні, каб потым трапіць у Мёртвае мора. Рэчка нешырокая, берагі аброслыя невысокімі паўднёвымі дрэўцамі кшталту нашай вярбы. Вада літаральна зялёная і здаецца бруд-

наватай. Але ўражанне падманнае, варта набраць яе ў посуд і адразу ўпэўнішся, што гэта не так. Тут нам у нейкім сэнсе пашчасціла, бо разам з намі некалькі святароў. Яны служаць малебен хрышчэння, і мы прымаем яго па-сапраўднаму, пасля малітвы тры разы акунаемся з галавой у воды іярданскія. Адно што відаць, нашая недасведчанасць, бо хрысціцца трэба ў доўгай белай палатнянай кашулі, якая зберагаецца потым да смерці чалавека.

Па дарозе да Іярдана пабывалі яшчэ на гары Фавор, дзе адбывалася Прэабражэнне. Тут, бліжэй да Галілеі, прырода ўжо напоўнена расліннасцю, гара зялёным грудам узвышаецца над раўнінай, добра відаць здалёк. Уражанне такое, быццам сапраўды з яе вяршыні да сіняга неба рукой падаць. Потым быў Назарэт, горад Дабравешчання. Над крыніцаю, дзе, згодна апакрыфічным паданням, арханёл Гаўрыіл даў вестку Марыі аб будучым зачацці, калі яна ішла за вадою, узвышаецца храм у гонар Св. Гаўрыіла. У царкве не рэкамендуецца браць ваду з фантана Дзевы Марыі, але некаторыя з нашых пілігрымаў не звярталі на гэта ўвагі. Напраўду, «вера твая ўратавала цябе». У гэтым храме XVIII стагоддзя выклікае захапленне бясцэнны іканастас з цудоўнымі абразамі.

Такім жа паўднёвым мястэчкам з маляўнічымі вулкамі і мітуслівым гандлем паўстала для нас і Кана Галілейская. Цуд на вяселлі ў Кане, калі Ісус ператварыў ваду ў віно, мае першаступенную ролю ў тэкстах Дабравесця, бо размова ідзе якраз аб першым цудзе Хрыста ў Галілеі пасля Яго посту на Гары спакусы. Зразумела, што і мы набылі шлюбнага віна і асвяцілі яго ў Царкве Цуда ў гліняным збане, з якога, згодна падання, налівалі створанае віно на шлюбным застоллі. Ужо дома выпілі мы яго з жонкай нетаропка, яшчэ раз мацуючы наш шлюб.

І нарэшце – Галілейскае мора ці, па-іншаму, Ціверыядскае возера, берагі якога былі сведкамі асноўных евангельскіх даіерусалімскіх падзей. Тут Ісус Хрыстос знайшоў усіх сваіх дванаццаць вучняў, якія былі рыбарамі, тут Ён накарміў тысячы людзей некалькімі рыбамі і хлябамі, тут гучала Яго Нагорная казань, адбывалася пазбаўленне людзей ад немачы. Мы аб'ехалі возера вакол па ўсім перыметры. Яно незвычайна прыгожае, бо нават я, патрыятычны прыхільнік Нарачы ды іншых беларускіх азёр, быў у шчырым захапленні. Сіне-зеленаватая

вада, сіняе неба без аніводнага воблачка, маляўнічыя зялёныя берагі з крапінамі селішчаў. Ужо на сыходзе дня мы былі ў Ціверыядзе, любаваліся прадвячэрне-спакойным возерам. Матушка, якая суправаджала нас, адзначыла, што калі-нікалі там, дзе Ісус ішоў па вадзе да сваіх вучняў, бачна светлая палоска на воднай паверхні. «А ў чацвертую варту ночы пайшоў да іх Ісус, ідучы па моры». Не ведаю як іншым, а мне раптам адкрыўся гэты светлы след ад берага ў далячынь возера. Гэта было як азарэнне – якраз тут ішоў Ён па вадзе як пасуху, акурат гэты светлы след не згасае праз морак стагоддзяў! Амаль адразу прыйшло ўсведамленне, што гэта самае моцнае эмацыянальнае ўражанне маё на Святой Зямлі. Я бачыў светлы след! Тут ужо сумненняў у пасланым знаку, цудзе не было аніякіх.

І як адхланне ад узрушэння, душэўнага ўсплеску – наведванне адзінокага грэчаскага манастыра на беразе Галілейскага мора, ужо ў самым сапраўдным мяккім змроку ночы. На гэтым месцы Ісус сустрэў восем сваіх вучняў, таму храм мае восем купалаў, што зусім нехарактэрна для праваслаўнага канону. Паманіўшыся ў царкве, я наадзіноце выйшаў па кладках да возера. Далёка, на супрацьлеглым беразе свяціліся груды вугельчыкаў – знакі жытла чалавечага, у змроку ціха паплюхвала вада аб прыбярэжныя камяні, каля ліхтара шапацела машкара. Якраз і патрэбная была ў гэты час адзінота. Убачаны светлы след быў са мною, напаўняў маю істоту дабрадаццю. На душы было так добра і светла, быццам ты сапраўды знаходзішся на райскай зямлі.

Наступным днём, у аўторак, наш шлях зноў ляжаў да Іудзейскай пустэльні, да горных праваслаўных манастыроў. Адзінае, з-за напоўненасці велікодных дзён мы не змаглі трапіць у Віфлеем. А ў сераду, напярэдадні ад'езду, развітваліся з Іерусалімам, але ўжо не з акна аўтобуса. Абышлі ўсю Елеонскую гару, любаваліся панарамай Святога Горада. Зноў прыйшлі да Святой Дамавіны, каб ужо немітусліва, у спакойным стане пакланіцца хрысціянскім святыням. На Галгофе дакранаемся да скалы, дзе срэбным колцам пазначана месца мацавання Крыжа Гасподняга, прыпадаем да Пліты памазання, потым пачаргова, бо ў самой Дамавіне месціцца не больш двух чалавек, уваходзім у пячору, дзе быў пахаваны Хрыстос. Усё гэта застаецца ў душы і сэрцы ўжо назаўсёды, усё гэтае прывязеш з сабою ў родную Бе-

ларусь. Як прывязём мы і зняты на кінаплёнку момант сашэсця Святога Дабрадатнага агню. У напаўцёмным кадры з'яўляецца агонь, і ўжо праз хвіліны на тваіх вачах усё напаўняецца незямным святлом. Знак любові Госпада да нас, людзей, запрашэнне адкрыць душу да дна насустрач гэтаму ўсёпранікальнаму святлу.

# БЕЛАРУСКІ ХРАМ,
альбо Крокі па з'яднанні нацыі

За мітуснёю часу і няўцямнасцю рэальнага беларускага быцця 2000-годдзе Нараджэння Хрыстовага, адпаведна і змена вякоў, прайшлі ў нас дзяжурна, без узнёсласці. Бачна жаданне нешта ў гэтым кантэксце асэнсаваць, азірнуцца назад, глянуць наперад, але ўсё неяк дыскрэтна і несістэмна.

Між тым, гэтая найсветлая падзея была і ёсць добраю нагодаю глыбей асэнсаваць крыжовы беларускі шлях. Каб не толькі чалавек як экзістэнцыйная духоўная сутнасць задумваўся, з якімі здабыткамі сустракае ён дату Дабрадаці, але і для краіны Беларусь як сукупнасці ўсіх нас, грэшных, больш акрэслена вызначыцца, з якім духоўным набыткам прайшла яна праз браму новага тысячагоддзя хрысціянства. Усвядомім канчальна – без духоўнага адраджэння не будзе і нацыянальнага.

Што да грамадскага жыцця, тут прасцей. Згадаем, колькі слоў сказана, колькі артыкулаў напісана і меркаванняў выказана датычна нацыянальнай ідэі. Ад месіянска-містычнага ўсведамлення маладымі да аспектаў «у межах заканадаўства», як нехта няўклюдна пісаў у «Звяздзе». А пасярэдзіне – грунтоўная, узважаная, гістарычна і філасофскі вывераная канцэпцыя нашага слыннага Уладзіміра Конана. Зразумела, ва ўсіх вызначэннях беларускай ідэі ёсць элемент хрысціянскага шляху. Як элемент неабходны. Ці дастатковы ён? Можа гэта якраз той камень, адкінуты будаўнікамі, што потым ляжа ў кут падмурку? Бо не пакідае надзея і вера, што прыйдзе, запануе ўрэшце царства духу і ўсё ўбачыцца ў Боскім святле.

Нататкі не маюць мэтай грунтоўнае асэнсаванне беларускага шляху як шляху хрысціянскага, на тое трэба філасофскай моцы не аднаго чалавека. Ды і ў грэх агульшчыны ўпадаць жадання няма, яго часам аж зашмат у нашых прыватных імпрэсіях. Мэта якраз – пазначыць канкрэтныя крокі, якія да духоўнага

набытку нацыі будуць, на мой погляд, на пачатку новага тысячагоддзя хрысціянства значным даважкам, беларускім па сваёй сутнасці.

Папярэдзе варта адзначыць, што выраз «беларускі Храм» ужываецца тут упоравень з іншымі асноўнымі дэфініцыямі нацыянальнай ідэі – «беларускі Шлях» і «беларускі Дом». Пры тым кожная з іх не выключае астатнія, яны суіснуюць у адзінстве. Успомнім Уладзіміра Караткевіча: «Гэты край – Твой дом і сабор...» («На Беларусі Бог жыве»). Хаця зразумела, што кожная мае сваю адметнасць, сваю грань: шлях – гісторыя, дом – дзяржава, храм – узвышэнне духу.

Беларускі шлях у афіцыйнай ідэалогіі сёння занядбаны – гісторыя і традыцыі быдта і не патрэбныя, нацыянальныя сімвалы адпрэчаныя. Няма і жадання дабудаваць свой беларускі Дом – хутчэй ёсць незразумелае імкненне прадаць «участак» «пры захаванні суверэнітэту» (?). Легітымным з гэтага гледзішча застаецца толькі беларускі Храм, бо часам чуваць дэкларацыі, што дзяржаўная ідэалогія грунтуецца на хрысціянскіх каштоўнасцях. Пакінем фарысейства на сумленні тых, хто яго чыніць. Самі ж скарыстаемся з гэтай магчымасці, не адкідваючы іншых форм змагання за Беларусь, за нацыянальную ідэю.

У слове «змаганне» — ключ да тлумачэння падзагалоўка. Сёння акурат дзякуючы ўладзе нацыя раз'яднана, фактычна ідзе ціхая неаб'яўленая вайна. Супольнасць расколата на часткі, людзі трымаюцца сваіх амбіцый, партый, рухаў ці нейтралітэту, ці сваёй апатыі, ці слугавання ўладзе і абслугоўвання яе. Сумоўя не атрымліваецца. Працягваецца таксама нябачнае вокам супрацьстаянне хрысціянскіх канфесій, асабліва галоўных з іх – праваслаўнай і каталіцкай. Кожная змагаецца за вернікаў, за пашырэнне свайго ўплыву. Пры тым у большасці (станоўчыя для беларускасці выключэнні не адкідваюцца) касцёл так і застаецца спаланізаваным, а царква – зрусіфікаванай. І калі ў праваслаўных ёсць хоць нейкі аргумент – маўляў, зрусіфікавана ўсё дзяржаўнае і грамадскае жыццё, то ў касцёла і таго няма, сёння азначэнне «каталік – гэта паляк» выглядае анахранізмам. Дарэчы, праваслаўны беларус ніколі не назаве сябе рускім. Даўнавата вычытаў у артыкуле Анатоля Сідарэвіча, што з 1,5 мільёнаў беларускіх католікаў толькі каля 200 тысяч з'яўляюцца этнічнымі палякамі. З другога боку, не раз прайшла інфармацыя, што каля

80 працэнтаў з усёй колькасці вернікаў на Беларусі прытрымліваюцца праваслаўя.

Ды справа не ў лічбах. Справа ў гістарычнай традыцыі мірнага суіснавання на беларускіх землях розных канфесій на падставе ўзаемнай цярпімасці. Не заўсёды талерантнасць трывала паслядоўна, але ў параўнанні з краінамі Еўропы, дзе гарэлі кастры інквізіцыі ды магчымымі былі варфаламееўскія ночы, наш вопыт сапраўды ўнікальны і сёння цікавы для свету. Зрэшты, пра гэта трэба асобна гаварыць.

Прапануецца канкрэтны крок, які б вонкава замацоўваў і выяўляў такую нашу адметнасць. Ёсць ідэя ўзвесці ў Мінску беларускі Храм хрысціянскіх канфесій. Назва гаворыць сама за сябе. Галоўны сабор краіны аднолькава належаў бы вернікам усіх плыняў хрысціянства, якія ёсць на Беларусі. Стаў бы агульнацыянальнай святыняй. Для гэтага патрабуецца зусім няшмат – добрая воля царкоўных іерархаў, жаданне прыйсці да згоды. Народ супраць не будзе. Ды яшчэ разуменне і падтрымка дзяржавы. На пачатку новага веку быў бы знак нашага пакаяння за міжхрысціянскія звады, гвалты ды ўціскі, знак паяднання нацыі на грунце хрысціянскіх каштоўнасцей.

Запомніўся дзядзька ў праваслаўнай царкве ў Слоніме, які даглядаў храм. Сам праваслаўны, жонка каталічка. І ніхто з іх не збіраецца мяняць веру. Тыповая беларуская сітуацыя. Ёсць такія выпадкі і ў маёй немалой сям'і. Не магу асуджаць стрыечнага брата, католіка па маці і праваслаўнага па бацьку, які выбраў уніяцтва. Хоць сам да ўніяцтва стаўлюся толькі як да гістарычнага факту, што мае часавыя рамкі ў існаванні нашай Бацькаўшчыны, не болей. Як не кінуся ў змаганне за стрыечага пляменніка, які падлеткам перайшоў у каталіцтва. Па-жыццёваму зразумела – прывабілі хлопца з небагатай сям'і, але ж застаўся ён хрысціянінам, значыць, не пойдзе па шляху зла. Ці не гэта галоўнае?

Калі прыйшла думка не толькі вобразна, але і рэальна пабудаваць беларускі Храм, згадалася Царква ўсіх нацый у Іерусаліме, адна з самых цудоўных славутасцяў вечнага горада. А сам Храм Дамавіны Гасподняй у Святой Зямлі? Найвялікшая святыня для хрысціян усяго свету, дзе ёсць месца кожнаму адгалінаванню хрысціянства. Потым даведаўся, што ў Нью-Йорку ёсць сабор Святога Яна, пабудаваны для ўсіх канфесій. У

гэтым храме, узведзеным у сярэднявечным стылі, час ад часу асвячаюцца шлюбы, ладзяцца шэсці ды іншыя дзеі. Як важна адчуць, што мы ўсе хрысціяне, незалежна ад канфесіі, што шляхі хоць і адрозныя, але мэта адна – спазнаць Царства нябеснага.

На заўвагі, ці не завысока ўзяў, выкажу меркаванне, што мы на Беларусі далёка яшчэ не пазбавіліся комплексу правінцыйнасці. Каталіцызм – толькі польскі, праваслаўе – толькі расійскае. Гэтая сітуацыя зразумелая і апраўданая, але трэба ўздымацца духам, верыць у свае сілы. Скажу больш канкрэтна аб праваслаўнай канфесіі. Сапраўды, мы занядбалі свае традыцыі, зацыкліліся на Расіі, быццам іншага і няма. Яшчэ вісіць мо і не жалезная, але заслона, якую адхіліць не стае добрай волі, а то і проста матэрыяльных магчымасцей. Апошняе згадваю, бо сёння ўсяго тры гадзіны лёту – і ты на Святой Зямлі, куды павінен імкнуцца кожны, каб душою дакрануцца да святынь, звязаных з зямным удзелам Збавіцеля, тым самым умацаваць дух для змагання са спакусамі і цёмнымі сіламі як унутры сябе, так і вонкі. Зусім невыпадкова святая апякунка зямлі беларускай Еўфрасіння Полацкая на схіле свайго зямнога існавання зрабіла паломніцтва ў Іерусалім. Мы проста канстатуем гэты факт, не вельмі ўсведамляючы глыбіннасці яго.

Асабліва яскрава разумеецца гэта там. Тым больш, калі трапляеш на Святую Зямлю якраз на праваслаўны Вялікдзень, як пашчасціла мне з таварышамі-калегамі. Калі гадзін шаснаццаць у Храме Дамавіны Гасподняй чакаеш сашэсця Святога агню, унутраныя нашы беларускія звадкі ўвачавідкі драбнеюць. Ты бачыш карціну ўсяленскага Праваслаўя, бо побач прадстаўнікі ўсіх праваслаўных народаў. Найбольш грэкаў і румынаў, людзей звычайных, простых. Якраз ці не найменей паломнікаў з Расіі, сярод якіх шмат святароў. А ўжо з Беларусі і наогул толькі мы ўтрох – напалову пілігрымы, напалову працаўнікі з кінематаграфічным начыннем. Але па душы – сапраўдныя паломнікі, тры праваслаўныя беларускія хлопцы.

Мізэрнымі здаюцца і нашы зацятыя спрэчкі пра мову ў святынях, калі наўкола сапраўднае шматгалоссе, калі чуеш эмацыянальную гаворку арабаў-хрысціян, нават з воклічамі (у храме, ды якім!) у прадчуванні вышэйшай дабрадаці – сашэсця Святога агню. Няўжо Гасподзь не разумее слоў тваіх на роднай мове, шчыра звернутых да Яго? Няўжо ёсць грэх сумнення ў

моцы і бязмежнасці Яго? Калі ж адысці ад эмоцый, то існаванне нацый даўно абгрунтавана Святым Пісаннем і ў багаслоўі. Як і галоўная адметнасць народа – яго мова. Згадайма толькі, што першым Божым дарам народжанай царквы было якраз зыходжанне Святога Духа і дар моў. Так што пакінем сумненні, папрокі і аргументы з абодвух бакоў, а супольна, саборна даробім справу, пачатую Францішкам Скарынам.

Як у беларускім Храме хрысціянскіх канфесій будзе ісці царкоўнае жыццё – па днях, па часе, ці на вялікія святы супольна – гэта ўжо пытанні тэхнічныя і вырашальныя. Абавязковая і неабходная ўмова – набажэнствы на беларускай мове. Практычна гатовыя да гэтага праваслаўная, каталіцкая цэрквы, пра нашых нешматлікіх уніятаў і сумневу няма. Цяжэй сказаць з-за браку інфармацыі аб пратэстанцкіх плынях. Так само сабою развяжацца моўнае пытанне – галоўны беларускі сабор будзе прыкладам іншым прыходам, у гэтым будзе відаць праяўленне палітыкі і добрай волі царкоўнай іерархіі Беларусі.

Храм павінен быць адчынены заўсёды, каб кожны чалавек у любы час змог зайсці, далучыцца да галоўнай святыні. Тут будуць ісці набажэнствы, хрышчэнне, асвячэнне шлюбу, адпяванне, словам – звычайнае жыццё храма. Архітэктурны воблік бачыцца на грунце традыцый культавага дойлідства Беларусі. Асабіста мне як вобраз згадваюцца адразу Сынковіцкая царква і Брацкі Богаяўленскі сабор у Магілёве (які, на жаль, не захаваўся). Ва ўнутраным аздабленні – роспісы, абразы беларускіх святых, копіі ўсіх цудатворных абразоў, шанаваных беларускімі вернікамі. А мо і шукаць не трэба? Храмам хрысціянскіх канфесій можа стаць адноўленая Свята-Духава царква на пляцы Волі ў Верхнім горадзе, шэдэўр беларускай архітэктуры. Храм у свой час быў непазнавальна перабудаваны ў псеўдарускім стылі і як Петрапаўлаўскі кафедральны сабор існаваў да 1936 года, пакуль яго не ўзарвалі бальшавікі.

Як не згадаць тут цынізм савецкай бязбожнай сістэмы – на месцы святыні паставілі піўніцу «Ясень», дзе мы студэнтамі ў першай палове 70-х ды і пазней пілі піва, а то і прынесеныя з сабою віно ці гарэлку. Не ведалі поста, што робім брыдкую справу на святым месцы. У гэтым шэрагу і бар у Чырвоным касцёле (калі там быў Дом кіно), дзе спіртное таксама лілося ракою. Каяцца і каяцца нам за ўсё гэтае. Нават калі і не

былі непасрэднымі злачынцамі, а толькі міжвольнымі саўдзельнікамі. Даруй, Госпадзі! Праўда, сёння месца Свята-Духавай царквы ў Верхнім горадзе агароджана. Надзея на яе адраджэнне застаецца.

Будаваць храм трэба ўсёй грамадою, агульнымі высілкамі. Хацелася б, каб гэта стала агульнанацыянальнай справай, справай з'яднання. Калі не будзе браку інфармацыі (згадайма будаўніцтва храма Хрыста Збаўцы ў Маскве), то ўсе прымуць да душы такую ідэю. Так, прынамсі, здаецца. Падаецца, што і дзяржава не застанецца старонняй назіральніцай.

Другі канкрэтны крок у накірунку беларускага Храма – укласці і выдаць «Духоўную энцыклапедыю Беларусі». Агульная духоўная спадчына – яшчэ адзін сродак з'яднання. Тут мо і прасцей, шмат напрацавана і па постацях, і па кнігадрукаванні, і па культавым дойлідстве. Але і даволі яшчэ трэба дарабіць. У такой энцыклапедыі павінны быць пазначаны ўсе нашыя святыні, нават даўно зніклыя, калі хоць якія звесткі пра іх захаваліся. Патрэбны агульныя намаганні прадстаўнікоў духавенства і беларускіх навукоўцаў. Часовы творчы калектыў. Чуў такі выраз: «Энцыклапедыя стварыла Францыю». Нешта падобнае магло быць і ў нас – як хораша і плённа пачыналі! А зараз чарговы том энцыклапедыі выходзіць рады ў гады.

Зразумела, гэтыя два праекты маштабныя, працаёмкія і нятанныя, ажыццявіць іх у кароткі час не выпадае. Добра было б хоць камень у падмурак закласці на пачатку новага веку хрысціянства.

А вось трэцяя ідэя, трэці крок рэальны сёння. Згадваючы даўнюю нашу народную хрысціянскую традыцыю, прапануецца паставіць на межах Беларусі крыжы-абярэгі. Толькі не трэба ўспрымаць літаральна, не па ўсёй мяжы, а на вылетных магістралях, ля вялікіх дарог. Калі кінуць вокам на карту Беларусі, такіх кропак будзе каля дваццаці.

Звычай узводзіць крыжы на ростанях склаўся даўно, не за нашую памяць, каб засцерагчыся ад няшчасцяў і злых духаў ды ў крызісных сітуацыях – хваробы, войны, эпідэміі. Ставілі іх па зароку за адну ноч. А чым сёння не крызісная сітуацыя, нават не згадваючы былыя дзесяцігоддзі бязбожнай улады? Ці не кожны дзень можна прачытаць у друку пра наркотыкі, нелегальную эміграцыю, нечуваныя злачынствы. Здаецца, калючым

дротам адгарадзіў бы сваю Беларусь ад жорсткага свету. Хоць разумееш, што гэта нерэальна ды непатрэбна ў той час, як бачныя межы ў Еўропе знікаюць. Хай будуць празрыстымі яны і ў нас, але для харошых людзей, што едуць са светлымі намерамі і добрай воляй. Такім крыж ля дарогі будзе якраз прыветным знакам. Нам жа як гаспадарам такая акцыя – яшчэ адзін сродак з'яднання, знак узвышэння духу. Форма крыжа павінна задавальняць усе хрысціянскія канфесіі, такою бачыцца патрыяршы крыж, як на старадаўнім гербе нашым Пагоня.

Рабіць усё трэба згодна традыцыі – вырабляць крыж за адну ноч, за ноч жа напрасці кудзелі і выткаць аброчныя тканіны для ўпрыгажэння – ахвяравальныя дары (антрапеі) дададуць духоўнай моцы. Акцыя была б вельмі дарэчы 27 верасня, на свята Узвіжання Пачэснага і Жыццятворнага Крыжа. Ва ўсіх месцах у адзін дзень. Веру, адразу стане ўтульней на Беларусі, якая стаіць на сямі еўрапейскіх вятрах. Крыж – знак Божай любові, бо якраз любоў да чалавека, які гіне ў грахах, прывяла Сына Божага на крыж. Цяплей стане на душы ад таго, што шляхі нашыя пазначаны знакамі любові, засцярогі і заступніцтва. Дык шукайма супольна дабрадаці Гасподняй, і тады беларуская нацыя, як пакліканая і прызнаная Богам адметная сябрына людская, ніколі не загіне. Будуйма беларускі Храм!

# ЗВАНЫ ДАБРАВЕСТУ

Калі апошні раз перазвон дабравеста на вялікія хрысціянскія святы быў чуцён над усім Мінскам? Здаецца, гэта XVIII стагоддзе, асабліва яго апошняя чвэрць. Горад выкараскаўся з войнаў і пажараў, увесь цэнтр яго забудаваны храмамі, манастырамі, кляштарамі, а самое места яшчэ зусім невялікае. Не так ужо ў XIX, у складзе Расійскай імперыі. Пазачыняныя шмат якія каталіцкія кляштары, асабліва пасля паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гадоў. Некаторыя з іх, як жаночы бернардзінскі, пераўтвараліся на пэўны час у вязніцы. Адно з пэўнасцю можна сказаць, калі ў мінулым XX зусім прапаў голас царкоўнага звону. Апошні праваслаўны храм у сталіцы Беларусі быў зачынены ў 1937 годзе – царква Марыі Магдаліны на Старажоўцы.

У свой час даводзілася бачыць шмат кінахронікі першых дзесяцігоддзяў савецкай улады, у тым ліку і той, дзе відаць здзек над святынямі, дзе сцягваюцца крыжы, купалы, званы, крышацца абразы, дзе ў кадры ўзрываюцца храмы. Гэтыя дакументальныя сведчанні часу заўсёды выклікаюць роспач і своеасаблівае здзіўленне: як моцна ўдалося ўбіць у галавы людзей ваяўнічы атэізм, як хутка ўдалося парушыць духоўныя традыцыі дзядоў!

А продкі нашыя любілі і ўмелі будаваць храмы – знакі дабрадаці Гасподняй на дадзенай ім Богам зямлі. Згадвалі Мінск з яго дзесяткамі культавых пабудоў. А вось яшчэ прыклад – толькі ў Навагрудскім павеце ў XVI стагоддзі налічвалася каля шасцісот мураваных храмаў. Нават рэшткі былой велічы, якія цудам захаваліся, уражваюць і сёння – згадайма шэдэўры сусветнага дойлідства Міхайлаўскую царкву ў Сынковічах Зэльвенскага раёна і царкву Нараджэння Багародзіцы ў Мураванцы недалёка ад Шчучына.

Духоўныя традыцыі немагчыма перарваць дарэшты. Вера жыла ў беларускім народзе, нягледзячы на ўсю бязбожнасць

савецкай улады. У Мінску званы абудзіліся падчас апошняй вайны мінулага стагоддзя. Царква Аляксандра Неўскага на ваенных могілках больш ужо не зачынялася, была напамінам аб неадваротнасці духоўнага адраджэння. Потым стаў дзейнічаць Свята-Духаў кафедральны сабор, які размясціўся ў былым кляштары бернардзінак. Так і прыйшлі мы да перабудовы, а пасля і незалежнасці Беларусі з двума храмамі на ўвесь тады ўжо амаль паўтарамільённы стольны Мінск. Няшмат хто мог пачуць царкоўны звон.

Подых свабоды, духоўнай разняволенасці канца 80-х паклікаў да жыцця надоўга перарваныя традыцыі храмавага будаўніцтва. Гэта было зусім няпроста. І не толькі таму, што ўсе семдзесят гадоў шляху да камунізму новыя цэрквы не будаваліся. Уласна беларуская традыцыя перарвалася значна раней, практычна з часу гвалтоўнага ўключэння нашых земляў у склад Расійскай імперыі. Як адрадзіць традыцыі? Тут і сёння шмат праблем, неакрэсленасці, пошукаў. А тады? Запатрабавалася забытая прафесія царкоўнага дойліда. Адным з першых стаў архітэктар Мікалай Дзятко, мой таварыш і былы аднакурснік.

Нязведаныя шляхі Гасподнія. Мікалай вырас не ў набожнай сям'і, да веры прыйшоў і пахрысціўся ўжо ў свядомым узросце, пасля інстытута. Але тады не мог уявіць, што пашчасціць праектаваць храмы, манастыры. Пачалося ж усё проста – трапіў на аўдыенцыю да ўладыкі Філарэта, выказаў сваё жаданне спрычыніцца да царкоўнага дойлідства. І адчуў на ўласным досведзе моц слоў евангельскіх: грукайцеся — і вам адчынена будзе. Неўзабаве прыйшла прапанова. Першай работай Мікалая Дзятко стаў праект кафедральнага сабора ў Пінску. Апошні раз я там быў, калі храм будаваўся. Хацелася б сёння зірнуць, як ён выглядае ў закончаным выглядзе.

А вось усё астатняе адбывалася на вачах. Архітэктар Мікалай Дзятко спрычыніўся да самых значных царкоўных навабудаў у сталічным Мінску. Комплекс на Прытыцкага – вялікі сабор у гонар абраза «Усіх смуткуючых радасце» (дабудоўваецца), званіца, храм у гонар Еўфрасінні Полацкай. Апошні даўно дзейнічае. Без гэтага духоўнага цэнтра ўжо немагчыма ўявіць архітэктурны краявід заходняй часткі горада.

З тэмай непазбыўнага беларускага болю – Чарнобылем – звязана і будаўніцтва капліцы ў гонар абраза «Зысканне загі-

нулых» на вуліцы Карастаянавай, каля вядомай плошчы Бангалор. Тут гісторыя ўвогуле цудадзейная. Адной верніцы-бабульцы прымроіўся ноччу сон-відзеж: трэба збудаваць царкву ў памяць пра ахвяры Чарнобыля на Ваганькаўскіх могілках у Маскве. Пайшла яна да ўладыкі Філарэта, той даў дабраславенне на будаўніцтва, але не ў Маскве, а ў Мінску. Так жанчына сілаю духу пабудавала капліцу. Праект зрабіў архітэктар Дзятко, асноўны цяжар будаўніцтва ўзяла на сябе грамадская арганізацыя пры МУС «Шчыт Чарнобыля». Звычайна ў Мікалая аб'ёмнапрасторавае вырашэнне храмаў спакойнае, ураўнаважанае, тут жа кампазіцыйны палёт закамараў уверх трывожыць, напамінае пра агонь Чарнобыля. Цяпер капліца жыве як прыходскі храм. Зайдзіце сюды, далучыце свой голас да агульнай малітвы, каб больш не паўтарылася такая трагедыя для нашай зямлі.

Па праекце Мікалая Дзятко будуецца храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы на праспекце Машэрава, каля гаючай крыніцы. Адзначым, што не заўсёды адносіны аўтара праекта і заказчыка складваюцца найлепшым чынам, без мірскіх калізій не абыходзіцца і тут. Але галоўнае – храмы будуюцца, з'яўляюцца новыя асяродкі духоўнасці, што абавязкова дасць плён.

Мы з Мікалаем неаднойчы абмяркоўвалі, нават спрачаліся, што ёсць беларускі храм, якім ён павінен быць. Зрэшты, гэта тэма асобнай гаворкі. Але прызнаюся, большасць царкоўных новабудаў нагадвае мне расійскія ўзоры, а хочацца свайго, беларускага, адметнага. З іншага боку, грунтуецца гэта, і ў Дзятко таксама, на візантыйскіх традыцыях, адкуль і пайшла праваслаўная архітэктура. І ўсё ж, былі ў нашым царкоўным дойлідстве адметнасці з самага пачатку, з пакрытага смугою часу XI стагоддзя. Проста сапраўды, уласна беларуская традыцыя ў гэтым накірунку перарвалася, як адзначалася, ужо ў XIX стагоддзі. Яшчэ і такое меркаванне: калі мы, літаратары, мастакі, таксама кампазітары і пры савецкай уладзе як маглі працягвалі жыць у беларускай культурнай традыцыі, то пра архітэктараў сказаць гэта больш складана па розных прычынах. Згадайце хоць бы аднаго беларускага савецкага архітэктара? Хіба што Іосіф Лангбард з яго манументальнымі будынкамі, якія зрабілі Мінск сталіцай. А так... Безаблічнасць праявілася найбольш яскрава.

Нешта падобнае ёсць і ў сённяшнім храмавым будаўніцтве. Уласна, і сам Мікалай Дзятко гаворыць, што гэта не ён будуе

цэрквы, а народ, што такая запатрабаванасць часу, грамадства. Сапраўды, наша супольнасць і яе жыццядзейнасць у цяперашні момант нясе адбітак сярэднявечча (як ладу жыцця, як стылю), калі асобны чалавек хаваў сваё «я» за «мы», калі баяўся праявіць сваю індывідуальнасць (каб не вытыркнуцца), калі нават насіў бараду, каб схаваць сваю адметнасць і не вылучацца з агульнай масы (выняткі палёту духу не аспрэчваюцца!). А Беларусі сёння патрэбны якраз творца рэнесанснага тыпу, які не ідзе за масай, а вядзе яе за сабою, творыць па свабоднай волі, якую даў нам Усявышні. Толькі дзе ж умовы для гэтага? Усё зразумела, але шукайма найперш іх у сабе, імкнучыся да разняволенасці духу, любові, творчага палёту.

Як не разважай, неаспрэчна адно: усе новыя храмавыя пабудовы ёсць здабыткамі беларускай архітэктуры. Стане такім і ансамбль Свята-Елізавецінскага манастыра ў Навінках, над якім працуе цяпер Мікалай Дзятко. Дабудоўваецца манастырскі комплекс з царквою ў гонар абраза Маці Божай «Дзяржаўная», дзе ёсць прыдзел свяціцеля Мікалая. Побач, ужо за межамі манастыра, узводзіцца вялікі прыходскі храм.

Калі мы з Мікалаем хадзілі па будоўлі, дзе пакуль сплялося і ўласна манастырскае, і будаўнічае жыццё, ці не ўпершыню ўзнікла лёгкае шкадаванне, што калісьці павярнуў свой шлях з архітэктуры на літаратуру. Па-светламу пазайдросціў свайму таварышу, які ў гэтым знешне хаатычным, але ўнутрана ўпарадкаваным руху быў сваім чалавекам, далучаным да неспазнаваемага праяўлення дабрадаці Гасподняй. Ды кожнаму сваё. Цікава было прайсціся паверхам, дзе даводзіліся да ладу невялікія келлі. Гэтае слова выклікае найперш вобразы пакояў са зводамі, мігценнем свечак. А тут – звычайныя на выгляд гатэльныя нумаркі. Але не форма галоўнае, а дух. Калі ў келлях стануць жыць манашкі, ты ўжо ніколі не трапіш туды, як сёння не трапіш на заселены паверх. Не для мірскога вока манаскае жыццё, не нашым розумам адужаць свядомую аскезу.

Першы ў сталіцы манастыр узнік з сястрынства, якое апекавалася над дзяцьмі з суседняй псіхіятрычнай лякарні. Ігумення – матушка Еўфрасіння. Духоўнік манастыра – айцец Андрэй, высілкамі якога, уласна, і паўстала абіцель. Вера і справы дапамагаюць знаходзіць патрэбныя сродкі. Звярніце ўвагу – ва ўсіх буйнейшых гандлёвых цэнтрах Мінска ёсць прылаўкі,

дзе гандлююць духоўнай літаратурай, абразамі, царкоўным начыннем. Сёстры стаяць у падземных пераходах, збіраюць ахвяраванні. Гэта ўсё Свята-Елізавецінскі манастыр, так ён і будуецца.

Заўважым, што прылаўкі выраблены ў манастыры, у сваёй сталярнай майстэрні. Але гэта прыкладное, так бы мовіць. Як прыкладная па форме і дапаможная гаспадарка манастыра пад Мінскам. Узялі зямлю і закінутую калгасную ферму – гадуюць жывёлу і птушку, вырошчваюць гародніну. Маюць трактар і нават камбайн. Працуюць тут у асноўным былыя алкаголікі, наркаманы, былыя злачынцы, тыя, хто не згубіў надзеі выцерабіцца на правільны шлях. Зразумела, хапае ўсялякіх калізій жыццёвых і бытавых, але хто дасць прытулак абяздоленым духам, як не святы прытулак? Для царквы кожны чалавек – каштоўнасць.

Працуе пры манастыры нядзельная школа. Ёсць майстэрня іканапісу, керамікі, дзе вырабляюцца лампадкі, падсвечнікі, малая пластыка. Нават свая кузня разгортваецца. А пакуль жыранодль (адразу згадваецца Паўлюк Багрым) для прыдзела свяціцеля Мікалая выкаваў Аляксандр Турко, майстар з Нясвіжа. Калі глядзіш на гэты мастацкі выраб, адчуваеш цяпло рук і душы стваральніка. Непараўнальна з адстароненасцю заводскіх штампаваных рэчаў. Убачанае прыводзіць да думкі, што будаўніцтва храмаў і манастыроў – не самамэта, а сродак духоўнага адраджэння, узнаўленне цэлага пласта жыцця і культуры, страчанага і зноў здабываемага. Храм патрабуе сінтэзу ўсіх мастацтваў. І няхай шэдэўры іканапісу, манументальнага жывапісу, кавальства, залатога шыцця, ганчарства яшчэ наперадзе, бо няпроста зноў выйсці на дарогу высокага духоўнага мастацтва, з якой нас прымушалі збочыць. Але яны абавязкова будуць.

У гэтым шэрагу майстэрства ліцця званоў і прафесія званара. Раней званы прывозілі з Расіі. Цяпер у нас ёсць свае майстры з фірмы «Выдатнае ліццё». Пачыналі з малога. Пасля здолелі адліць паўтонны саборны звон для Свята-Петрапаўлаўскага храма сталіцы. А нядаўна даведаўся, што ёсць ужо цар-звон вагою ў адну тону. Каб гучалі гэтыя веснікі дабравеста як належыць, пры згаданым прыходзе на Прытыцкага працуе школа званароў, якой кіруе Аляксандр Маліноўскі. Вывучацца маладыя, раз'едуцца па Беларусі – і галасы званоў будуць чуваць

усё мацней, усё акрэсленей, сцвярджаючы неадваротнасць духоўнага адраджэння.

Трэба нарэшце зразумець, што без духоўнага не будзе і адраджэння нацыянальнага. Толькі з вераю, што ўсё на на зямлі створана промыслам Божым, а чалавеку, вянцу тварэння, трэба жыць у любові, мы зможам дарэшты ўсвядоміць, што беларуская нацыя стварылася невыпадкова, што народу нашаму дадзена найбольшая святыня – родная зямля, якую мы, як і мову, павінны берагчы і множыць як дар Божы. Толькі тады зможам давесці да ладу нашае жыццё і дабудаваць сваю Беларусь.

Духоўнае жыццё немагчыма знішчыць, як немагчыма спыніць існаванне чалавека. Будзем спадзявацца, што прыйдзе час, калі званы дабравеста на вялікія царкоўныя святы будуць чуваць па ўсяму Мінску. І па ўсёй краіне. Пад дабрадатны перазвон народзіцца ў нашай зямлі чалавек, які праславіць, наследуючы традыцыі продкаў, Беларусь ва ўсіх землях.

# НОНКАНФАРМІЗМ МІКОЛЫ РАВЕНСКАГА

Ціхі беларускі нонканфармізм... Гэтае азначэнне, якое падалося не пазбаўленым філасофскага сэнсу, прыйшло якраз падчас працы над дакументальным фільмам пра Міколу Равенскага (1886–1953 гг.). Уявілася, як ён стаіць са скрыпічным футаралам пад пахаю ў калідоры гарадское ўправы (1941 год) наймацца за скрыпача ў арганізаваны аркестр опернага тэатра. Управу стварылі акупанты, але не немцам прадавацца прыйшоў кампазітар, а знайсці працу, каб льга было выжыць у цяжкую гадзіну, каб прадоўжыць служэнне беларускай музыцы. Ёй аддадзены быў мастак і да вайны, калі аб'явілі яго нацдэмам (адно што арыштаваць і расстраляць не паспелі), і пасля вайны, калі воляю лёсу закінуты быў на чужыну. Колькі навалаў переражыў ён, як і ўсе беларусы, але не збочыў, застаўся сапраўдным сынам сваёй зямлі. Не ў адкрытым змаганні, не гвалтам (бо ад гвалту беларус стаміўся за стагоддзі сваёй гісторыі), а ціха. Зацята трымаючыся свайго. Адсюль і нонканфармізм якраз беларускі, акурат ціхі.

Адкуль вытокі яго? Як і ва ўсіх нас – у дзяцінстве, дзе з калыскі далучаешся да роднага слова, дзе гарчаць недаспеласцю спакусныя яблыкі, дзе ляціць у неба цэркаўка, праз якую дакранаешся да высокіх напеваў. Беларусі ніколі не давалі спакою. У натуральны крутабег жыцця – народзіны, хрышчэнне, радзіма, бацька і маці, мова, песня, што ідзе ад душы народнай, – заўсёды няўмольна ўмешвалася гісторыя. Лёс чалавека, уваплецены ў жорсткасць рэчаіснасці, быў драматычны. А лёс музыкі асаблівы, бо як ніхто чуе ён дысгармонію часу, што ўрываецца ў спрадвечныя рытмы, крышыць усё на сваім шляху, выкручвае заведзены парадак.

Нарадзіўся Мікола Равенскі 5 (17) снежня 1886 года ў вёсцы Капланцы Ігуменскага павета Менскай губерні. Цяпер Бя-

рэзінскі раён. Усяго на чатыры гады маладзейшы ад нашых песняроў Якуба Коласа і Янкі Купалы. Пра дарэвалюцыйны перыяд жыцця вядома няшмат, адно толькі, што ў 1913—1915 гадах Равенскі вучыўся на рэгенцкіх курсах у Маскве і Пецярбурзе. Пасля працаваў регентам і настаўнікам спеваў у Наваградку, збіраў народныя песні. Ужо тады пра яго можна гаварыць як пра фалькл070рыста, кампазітара і хормайстра. Гая Пікарда лічыць, што ў гэты перыяд напісаная значная частка ягоных твораў.

У Мінск Мікола Равенскі трапляе ў 1919 годзе. Кіруе хорам пры Беларускім рабочым клубе, працуе хормайстрам БДТ, цяперашняга купалаўскага тэатра. У 1921 годзе бярэ ўдзел у фальклорнай экспедыцыі па Случчыне, арганізаванай Інбелкультам. Мінскае каапэрацыйна-выдавецкае таварыства «Адраджэньне» ў 1922 годзе выпускае «Зборнік песень з нотамі» М. Равенскага. Цікавая гісторыя з гэтым спеўнікам. Яго не адшукаеш сённячы нават ў Нацыянальнай бібліятэцы. Скралі зацікаўленыя людзі, калегі. І не толькі самую кнігу, скрадвалі мелодыі, матывы кампазітара, выдаючы іх за свае. Як, напрыклад, «Мой родны кут». Вядома, знік кампазітар пасля вайны, на чужыне аказаўся. Значыць, вораг народа, на Бацькаўшчыне поўнае забвенне. Чаму б не скарыстацца? Аб такіх выпадках ведае дачка кампазітара Вольга Мікалаеўна Аляксеенка. Я не буду тут сцвярджаць безапеляцыйна. Думаецца, што музыказнаўцы ўсё ж павінны сказаць праўду (зборнік увогуле існуе, ёсць у Лондане). А ў Беларусі рарытэтную кніжыцу захаваў пісьменнік Васіль Вітка, а цяпер яна знаходзіцца ў дачкі кампазітара. А наконт плагіяту, то падпісанне твораў можа быць у такім выглядзе: ідэя (напеў, мелодыя) Міколы Равенскага, музыка (апрацоўка, гарманізацыя) – імярэк.

Бог ім суддзя, таленавітага майстра ад гэтага не паменее, хутчэй наадварот. Адно ведаю дакладна, пад нумарам 25 значыцца песня на словы Канстанцыі Буйло «Люблю наш край, старонку гэту», якую цягам шматлікіх дзесяцігоддзяў нам прадстаўлялі як народную. Аўтарка слоў радавалася такому факту, думаецца, што і Равенскі разумеў вышыню адзнакі кампазітарскай працы, калі песня робіцца народнаю.

Таленавітага сялянскага сына (хоць узрост сталы – 37 гадоў) як дзяржаўнага стыпендыята рэспублікі пасылаюць на

вучобу ў Маскву. Цікавы факт: ад ураду БССР атрымоўвае ён пры гэтым у падарунак унікальную скрыпку. Трэба думаць, што інструмент быў старой работы выдатнага майстра. З гэтаю скрыпкаю Мікола Равенскі не расставаўся трыццаць гадоў, да самай смерці. У ліхія гадзіны, на пачатку акупацыі ці на чужыне, яна была яго адзіным найбольшым набыткам-«манаткам». Яскрава ўяўляецца, як у суладдзі з сяброўкай-скрыпкай нараджалася мелодыя неўміручага «Магутнага Божа» на словы Наталлі Арсенневай – родзічкі М. Лермантава. Было тое вясной-летам 1947 года ў далёкім Остэргофене, беларускім лагеры для перамешчаных асоб. Равенскі жыў у адной кватэры з бацькамі Зоры Савёнак (у замужжы Кіпель). У Остэргофене духоўны гімн і прагучаў упершыню.

Але да гэтага шлях быў яшчэ далёкі. Маскоўскі перыяд жыцця кампазітара ахоплівае гады з 1923-га па 1930-ты. Спачатку закончыў музычны тэхнікум імя Стасава, пасля Маскоўскую кансерваторыю. Быў вучнем Міхаіла Іпалітава-Іванова, які ў першай палове 20-х гадоў узначальваў Беларускую песнявую камісію. Жыў Мікола Якаўлевіч на Малой Мікіцкай вуліцы ў будынку прадстаўніцтва БССР. І тут арганізаваў зямляцкі хор. Адсюль і яго шчырыя стасункі з Уладзімірам Дубоўкам, які, трэба меркаваць, жыў таксама ў беларускім будынку. Кампазітара і таленавітага паэта падзялялі чатырнаццаць гадоў розніцы ва ўзросце, але якраз маладзейшы значна паўплываў на творчасць старэйшага, яшчэ больш загартаваў у справе беларушчыны. Равенскі напісаў песні на вершы Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына», «Такая ноч» (адна з найлепшых рэчаў), «Ліпнёвы гімн», які пасля арышту Дубоўкі ў 30-м годзе быў забаронены. Тады ж канфіскаваная была і першая беларуская гістарычная опера «Браніслава», таксама плён супрацоўніцтва з Дубоўкам. Мікола Равенскі першым паклаў на музыку вершы Максіма Багдановіча «Слуцкія ткачыхі», «Завіруха», «Не кувай ты, шэрая зязюля». Ужо ў час вайны напісаў музыку для «Пагоні». З даваеннага плёну яшчэ шматлікія апрацоўкі народных песняў, гістарычная сюіта па матывах аднайменнага верша Буйло «Курган», першая беларуская аперэта «Залёты» на словы Дуніна-Марцінкевіча, песня на словы Цішкі Гартнага «Ах ты Нёман-рака» высокага патрыятычнага гучання. Яна таксама

лічылася народнаю, гучала на радыё, яе здаўна выконваў мікалаеўскі ансамбль «Коласаўскія землякі» майго стрыечнага дзядзькі Міхала.

Пасля Маскоўскай кансерваторыі ў 1930 годзе Мікола Равенскі вяртаецца ў Мінск, выкладае ў музычным тэхнікуме, а пазней у новастворанай Беларускай кансерваторыі. Але ўжо прыклеены да яго ярлык – нацдэм. Найперш за сяброўства і творчае супрацоўніцтва з Уладзімірам Дубоўкам. Ды не толькі. У 1938 годзе арыштаваны і расстраляны ў Курапатах старэйшы брат Антон, які настаўнічаў у Карзюках недалёка ад Мінска. Падчас вучобы Мікола летнія вакацыі праводзіў у брата, ды і потым бываў неаднойчы. Антон Адамовіч, эміграцкі пісьменнік і крытык, называе Антона дзейным беларускім эсэрам. Загінуў у Курапатах і стрыечны брат Аляксандр. Самога Міколу Равенскага ў 1938 годзе выключаюць з Саюзу кампазітараў, знаёмыя сталі адварочвацца. Творца вымушана адыйшоў у цень – дык аб якіх песнях тады можна было гаварыць! Але не каяўся перад рэжымам (за што?), не стаў угоднічаць, як ягоны калега Мікола Шчаглоў, чыя «Кантата аб Сталіне» гучала ў Мінску, Кіеве, Адэсе, Харкаве, Тбілісі. Праўда, у час акупацыі Шчаглоў здаў свой ордэн Пашаны ў гарадскую ўправу, нават прозвішча змяніў, узяў матчына – Кулiковіч. Гэтак iрваў з мінулым. Потым таксама апынуўся ў эміграцыі, шмат зрабіў для беларускай музыкі.

Мікола Равенскі жа ціха і зацята трымаўся нонканфармізму. Як да вайны, так і ў вайну. У той згаданы эпізод у гарадской управе Антон Адамовіч запытаўся ў яго пра лёс «Браніславы». «Дзе там! Нат каб і дахавалася, дык спапялела б цяпер, у гэтай пажэжы й бамбежы, у якой і нядаўна жонка маладая завілася, як дым, і не знайсьці во ніяк...» «А за пару тыдняў, – піша далей Адамовіч, – прыйшоў і адвітвацца – запрасілі на рэгента ў царкву ў калішні Ігумань, нядаўны Чэрвень».

Першая жонка Міколы Якаўлевіча памерла ад родавай гарачкі, пакінуўшы дачку Лёлю (Лену). У час акупацыі дачка была ўжо дарослаю, стала падпольшчыцай пад мянушкай «Сініца». Лёлю арыштавала гестапа, яе расстралялі ў двары Мінскай турмы. Падрастаў унук Барыс.

Перад вайною кампазітар ажаніўся другі раз, яго абранніцай стала ўласная вучаніца Яніна, маладая спявачка. Ад яе на-

радзіліся дзве дачкі, Вольга і Людміла, якая памерла ў дзяцінстве. Яніна з Вольгай пад акупацыяй жылі гаротна, Равенскі не мог іх знайсці, дапамагчы, забраць да сябе ў Ігумен. Зазірнуўшы наперад, адзначым, што кар'ера маладой таленавітай спавачкі ў Яніны Станіславаўны не адбылася па вядомых прычынах – жыццё пад акупацыяй, муж-эмігрант і вораг народа. З цяжкасцю, але выцерабілася на бацькаву сцяжыну дачка Вольга. Скончыла кансерваторыю, спявала ў хоры Віктара Роўды. Дарэчы, калі ансамбль стаў выконваць «Магутны Божа», спачатку не ведала, што ўрачыстую духоўную песню напісаў бацька. Зараз актыўная прапагандыстка творчасці Равенскага, выконвае шмат ягоных твораў.

Час вызвалення, які ішоў, ставіў пытанне: ці зноў вярнуцца ў непрадказальную наступствамі савецкую рэчаіснасць, дзе недабітых нацдэмаў і так званых калабарантаў мусілі «дабіваць», ці сысці на чужыну. Сталася апошняе. Лагеры для перамешчаных асоб Рэгенсбург, Остэргофен, Розэнхайм. Усюды Равенскі стварае ансамблі, кіраваў свецкім і царкоўным хорамі, нястомна падтрымліваў агмень беларушчыны. У 1950 годзе Міколу Равенскага запрашаюць у бэльгійскі Лювен, дзе стала магчымым студыявацца ў мясцовым унівесітэце трыццаці маладым беларусам. Гэта апошняя старонка жыцця кампазітара. У Лювене ён пачынае працаваць з Ансамблем беларускіх студэнтаў, прапагандуе народную музыку. Гэта было адзіным адхланнем немаладога і незваротна хворага майстра ад тугі па радзіме. Можна толькі здзіўляцца, як з выпадковых для музыкі людзей яму ўдалося стварыць высокамастацкі ансамбль, запісы якога пазней выдаваліся ў Бельгіі, Нямеччыне, ЗША і Канадзе. Тут, акрамя дасканальнага пачуцця харавога стылю, патрэбна была надзвычайная ўпартасць і цярплівасць у працы. Але гэта ўдалося! Папулярнасць хору выйшла далёка за межы Бельгіі, беларускую песню слухалі ў Парыжы, Лондане ды іншых кутках Еўропы. Штрышком для характарыстыкі таго часу ёсць словы Равенскага з ліста ў Англію да сваячніцы Таццяны (Тэрэзы) Руткоўскай, дачкі згаданага стрыечнага брата Аляксандра, ад 10 студзеня 1952 года: «...Прыступіў да працы, ў сучасны момант рыхтуемся да напяяньня грамафонных плітак. Маем шэсць пліткаў, на якіх будзе зьмешчана 12 песьняў. Больш пакуль не зможам напець, бо вельмі дорага каш-

туе. Дагаворы з фабрыкай яшчэ не закончаны, за гэтыя пліткі яна патрабуе дзевяцьсто тысячаў, але думаю, пойдзе на ўступкі. А з 20-га бярэм удзел у шэрагу царкоўных службаў у Бруссэлю, дзе адбываецца кожны год так званы «тыдзень агульнай малітвы» па розных касьцелях, за пакутны хрысціянскі Народ за залезнай завесай».

Мне пашчасціла слухаць народныя песні з тых кружэлак. Высокае духоўнае гучанне, адразу адчуваецца класічны прафесіяналізм. Сам не музыказнаўца, таму для ацэнкі творчасці дамо слова калегу Равенскага, таксама кампазітару-эмігранту, музычнаму крытыку і яго таварышу Алесю Карповічу: «Праз усе творы, пры ўсёй іхнай эмацыянальнай разнастайнасьці і шырокім жанравым дыяпазоне, чырвонай ніткаю праходзіць прынцып беларускасьці ў музыцы... Ягоная любасьць да народных мэлёдыяў, імкненьне захаваць усю таямніцу прыгажосьці й багацьця выразу гэтага мэлясу, не пераабцяжыць яго гарманічнымі або тэмбравымі колерамі... Шырокія музычныя палотны, прыймы развіцьця тэматычнага матэр'ялу дазваляюць гаварыць аб імкненьні аўтара сымфанізаваць харавую фактуру, надаць ёй тую лёгіку, эмацыянальную выразнасьць і дынаміку, якія ўласьцівыя вышэйшаму дасягненьню музычнай архітэктонікі – сымфоніі...»

Людзі, якія ведалі Равенскага, адзначалі яго шчырасць, лагоднасць, сардэчнасць, гасціннасць, гатоўнасць кожнаму дапамагчы. Яшчэ адзін чалавечы штрышок з успамінаў. Немановіча (Уладзіміра Цвіркі): «Бывала, пастукаеш да яго: – Гм, – адказваў глыбачэзны бас з-за дзьвярэй. Зпад стала, закіданага нотнай паперай, на вас глядзелі ветлыя шэрыя вочы. – А пропуск ёсць? – пытаўся ён паважна. Пропускам зваў ён жартаўліва віно, што было звычайна люксусам не па студэнцкай кішэні. Гэта ён ведаў, але хоць на жарт, ад «традыцыйнае» формы прывітаньня не адступаў».

Памёр Мікола Равенскі 3 сакавіка 1953 года, пахаваны ў Лювене. У ягоным пакоі на стале ляжаў лісток календара, дзе побач запісаных тэм да песень была зробленая рукою кампазітара малюнкавая кампазіцыя: па-мастацку накрэсленыя альфа і амега, а пасярод – слова «Беларусь». Яшчэ адзін знак нонканфармізму, калі апеляваць да назвы гэтага аповеду. Жыў і тварыў мастак дзеля Беларусі і яе народу, дзеля духоўнай прыгажосці –

таму і песня яго засталася арліна-свабоднаю, крыштальна чыстаю, вечна маладою.

Помнік на магіле зрабіў скульптар Міхась Наўмовіч, беларус-эмігрант, які жыў у Парыжы. Спадчыну падзялілі паміж беларускай абшчынай і пляменніцай кампазітара Таццянай Руткоўскай. Цяжка сёння сабраць усё ў адно. «Завілася як дым», калі скарыстаць словы Міколы Якаўлевіча, і знакамітая скрыпка. Адшукаць бы яе ды вярнуць на Бацькаўшчыну, каб стала нацыянальным набыткам.

У Майсея Сяднёва ёсць верш «Сьмерць музыкі. Памяці Міколы Равенскага» з такімі шчымлівымі радкамі:

Баюся я ўжо – на зямлі зусім
Зьвядуцца песьняры і гордыя музыкі.
Ды што я гавару – чужога места
Завулкі-вуліцы й мяне забудуць,
Дармо, што я хадзіў па іх задумны і натхненны...

Здавалася б, прарочыя словы. Але, дзякаваць Богу, не назаўсёды. Вярнуліся вершы Сяднёва, вярнуўся творамі кампазітар Равенскі. Пачалося гэта з канца 80-ых, калі мы ўсе жылі на эмацыянальным уздыме, узнёслымі спадзяваннямі на новую Беларусь. У выкананні розных калектываў загучаў «Магутны Божа» – неаспрэчны духоўны гімн беларусаў. Нават калі б Мікола Равенскі больш нічога і не напісаў, ён бы адной гэтай урачыстай песняй застаўся ва ўдзячнай памяці нашчадкаў назаўсёды. Былі публікацыі, хоць і нешматлікія. У 1993 годзе на студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» створана дакументальная стужка «Успамін пра Міколу Равенскага», аўтарам сцэнарыя якой выпаў гонар мне быць. Гэты фільм у ліку трох рэжысёра Міхаіла Жданоўскага (яшчэ «Дарога на Курапаты» і «Жаўрукі Беларусі») адзначана годам пазней Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь. Час тады ўжо памяняўся, але да прэмій рукі яшчэ не дайшлі. І вось да 115-й гадавіны з дня нараджэння ў серыі Беларускі Музычны Архіў выпушчаны кампакт-дыск «Магутны Божа» з лепшымі творамі Міколы Равенскага. Стане ён каштоўным набыткам маёй хатняй фанатэкі, як для многіх беларускіх сем'яў. А побач з гэтым аповедам прапаную верш, які нарадзіўся ў мяне ўжо пасля фільма, але называецца аднайменна.

## Успамін пра Міколу Равенскага

Грай ты, скрыпка, нявесела грай –
У няволі так сэрцу маркотна.
Неспадзеўкі пакінуты край
За туманам прапаў незваротна.

Грай ты, скрыпка, нягучна іграй –
Смутак ціхі заўжды на чужыне.
На радзіме бярозавы гай
Разам з ветрам паплача аб сыне.

Грай ты, скрыпка, нядолю іграй –
Ад айчыны лісток адарваны
Лёсабур зваяваў, быдта май,
Знёс у горад юдолі нязнаны.

Грай ты, скрыпка, збавенне іграй –
Як дахаты спяшаюцца коні!
Светлай песні руплівы ратай
Зноў выходзіць на родныя гоні.

Грай ты, скрыпка, прасветлена грай –
До трываць болей лёс свой атрутны.
Адшукаць зацярушаны рай
Дай нам сілы, о Божа Магутны!

# КРЫЖ НА МАГІЛЕ БАБРОЎСКАГА

Шмат яшчэ ў нашай слаўнай мінуўшчыне імёнаў, шырока невядомых люду паспалітаму. Адно з іх – Міхал Баброўскі, святар, тэолаг, вучоны-славіст, арыенталіст, філосаф. Аб ім няма яшчэ грунтоўнага даследвання, між тым постаць гэтая, што стаіць упоравень з асобаю вялікага першадрукара Францішка Скарыны, заслугоўвае нашай пільнай увагі і ўдзячнай памяці. Ён з кагорты нешматлікіх волатаў, якія стаялі ля вытокаў нацыянальнага адраджэння ў першай палове XIX стагоддзя. Гэта былі глухія часы для Беларусі, калі яна вымушана была адаптавацца да існавання ў Расійскай імперыі. Але якраз у гэтых неспрыяльных варунках Баброўскі стаў сапраўдным нацыяналістам у лепшым сэнсе гэтага слова, прысвяціў сябе захаванню і зберажэнню старажытнай культуры беларусаў і ўсяго славянства.

Нарадзіўся Міхал Баброўскі ў 1784 ці 1785 годзе ў вёсцы Вулька Бельскага ваяводства. Цяпер гэта тэрыторыя Польшчы. Бацька яго быў уніяцкім святаром, паходзіў з даўняга беларускага шляхецкага роду. Вучыўся Міхал у Драгічынскай вучэльні піяраў (манаскі ордэн), потым у Беластоцкай гімназіі. У 1812 годзе скончыў Галоўную духоўную семінарыю пры Віленскім універсітэце, стаў святаром. Ужо юнаком пачаў вывучаць старажытныя славянскія рукапісы і старадрукі ў цэрквах і манастырах. З таго часу вера і навука сталі сэнсам яго жыцця. З 1817 года ажно пяць гадоў ён знаходзіўся ў навуковай камандзіроўцы ў Еўропе. Матэрыялы-справаздачы ішлі ва ўніверсітэт з Аўстрыі, Італіі, Францыі, земляў заходніх і паўднёвых славян, лужыцкіх сербаў. Не дзіўна, што ў 1822 годзе ён выкладае філасофію ў Віленскай альма-матэр як прафесар. Успомнім, што якраз тады ва ўніверсітэце дзейнічалі таварыствы філаматаў, філарэтаў, прамяністых, у якіх удзельнічалі Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш

Зан, Ігнат Дамейка. Пасля раскрыцця тайных арганізацый пацярпелі ўсе – і студэнты, і іх выкладчыкі. Калега Баброўскага Ігнат Даніловіч звольнены з працы, а самога Міхала саслалі, праўда, недалёка – у Жыровіцкі базыльянскі манастыр, дзе ён прабыў два гады.

З 1826 года Міхал Баброўскі зноў выкладае ва універсітэце. Пасля паўстання 1830—1831 гадоў у Польшчы, на Беларусі і Літве універсітэт быў зачынены, Баброўскі высланы са сталіцы Паўночна-Заходняга краю, як называлася тады Беларусь. Ссылка была своеасаблівай – ён атрымлівае прыход у правінцыі, у мястэчку Шарашова каля Белавежскай пушчы. Цяпер гэта Пружанскі раён. Расійскае самаўладдзе не любіла разумных, адукаваных і вольналюбівых людзей, якія хацелі лепшай долі для сваёй Айчыны.

Міхал Баброўскі быў сапраўды выбітнай асобай, знаным навукоўцам. Як і Скарына, Баброўскі дасягнуў вышэйшых навуковых ступеняў, быў доктарам тэалогіі і прафесарам. Гэта вучоны еўрапейскага ўзроўню – ён з'яўляўся членам прэстыжных Археалагічнай акадэміі ў Рыме, парыжскага і лонданскага азіяцкіх навуковых таварыстваў, Таварыства гісторыі і старажытнасцей расійскіх пры Маскоўскім універсітэце, камітэта па выпрацоўцы харвацкага правапісу ў Далмацыі.

Баброўскі жыў і працаваў у складаны час, калі Беларусь пасля ціску паланізацыі стала ўсё больш моцна адчуваць націск русіфікацыі. Ён быў прыхільнікам адраджэння самабытнай беларускай культуры, выкарыстання беларускай мовы ў афіцыйным ужытку. Усё жыццё збіраў звесткі пра Францішка Скарыну, наноў адкрыў для беларускай і еўрапейскай навукі гэтае слаўнае імя. Ён адчуў тое сапраўды нацыянальнае, што пакінуў у спадчыну Скарына. Баброўскі меў багатую бібліятэку помнікаў беларускай старадрукаванай літаратуры. Напісаў кнігу «История славянских книгопечатен в Литве», аб якой, хоць і ненадрукаванай, сярод навукоўцаў доўгія гады хадзілі легенды. На жаль, рукапіс за віхурамі часу не захаваўся. Як ніхто да таго часу, ён спрычыніўся да ўзнікнення ў гуманітарных навуках асобнага накірунку – беларусазнаўства. Міхал Баброўскі адкрыў Супрасльскі летапіс, які засведчыў усяму свету, што і на нашых землях было летапісанне. Апублікаваў яго потым Ігнат Даніловіч.

Дарэчы, гэтыя два імёны, Міхала Баброўскага і Ігната Даніловіча, нягледзячы на іх розныя лёсы, звязваюцца для мяне ў адно. Яны былі землякамі, абодва родам з Бельскага павета, амаль равеснікамі, і той, і той – сыны уніяцкіх святароў, абодва скончылі ў 1812 годзе Віленскую альма матэр і былі там потым прафесарамі, кожны пакінуў пасля сябе яркі след у нашай гісторыі. З поўным правам іх можна назваць аднымі з першых творцаў нашага нацыянальнага адраджэння.

Чаму акурат гэты куток беларускай зямлі (зараз, праўда, ужо Польшча) даў нам такія слаўныя постаці? Згадваецца, што Беласточчына пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе адышла да Прусіі і ў такім статусе існавала да 1807 года. Не было ў невялікі адрэзак часу ні польскага, ні расійскага ўціску. Беларуская мова пачувалася вольна, бо для прусакоў яна была далёкай, незразумелай. Беларускі дух і загартаваў будучых вучоных, пачатковая вучоба і сталенне якіх прыпала якраз на тыя гады.

Такія людзі непатрэбныя імперскай Расіі. Міхал Баброўскі апошнія пятнаццаць гадоў быў звычайным святаром, служыў Богу і людзям. Памёр ён у 1848 годзе і пахаваны каля царквы на могілках у амаль ужо родным Шарашове. Стаіць гэтае мястэчка наўзбоч магістральных шляхоў. З цягам часу на драўляным абеліску было ўжо не разабраць, чыя гэта магіла. Толькі старыя жыхары памяталі, што тут ляжыць «нейкі вучоны ці рэвалюцыянер Баброўскі». А ў 1995 годзе, калі царква гарэла, і гэты знак прапаў. Новыя пакаленні жыхароў маглі і забыцца, хто тут пахаваны.

Але так не сталася. Пісьменнік Уладзімір Ягоўдзік, цяпер галоўны рэдактар часопіса «Бярозка», жонка якога родам з гэтых мясцін, у свой час прачытаў даўнюю кнігу «Статистическое описание Гродненской губернии, составленное офицерами генерального штаба». Аўтарам яе быў пляменнік айца Міхала, генерал Павел Баброўскі. У кнізе мелася дакладнае апісанне месца пахавання. З таго часу ўзнікла думка паставіць на магіле новы памятны крыж. Падтрымала ініцыятыву Таварыства беларускай мовы ў асобе Алега Трусава.

І вось на восеньскія Дзяды, задуманае было ажыццёўлена. На Пружаншчыну выехаў сапраўдны дэсант бярозкаўцаў – Уладзімір Ягоўдзік, Алесь Бадак, аўтар гэтых радкоў, а таксама

мастак, сябра рэдакцыйнай рады Уладзімір Вішнеўскі, які вышткаваў шыльду на крыж. Часу мы не трацілі. Наладзілі сустрэчы з юнымі чытачамі ў Пружанскай дзіцячай бібліятэцы, у Шарашоўскай сярэдняй школе. Прайшлі яны цікава і запамінальна. Але галоўнай падзеяй ушанавання памяці Міхала Баброўскага стаў чын узвядзення крыжа. Для жыхароў мястэчка гэта выявілася сапраўднай урачыстасцю, сабралася больш двух сотняў чалавек. Сцяжына ад дарогі да храма была выслана хваінкамі і кветкамі. Дзень выдаўся па-восеньскі пахмурны. Але калі мясцовы святар айцец Мікалай адслужыў каля магілы памінальную службу і асвяціў узведзены дубовы крыж – з-за хмараў выбліснула сонца і высветліла ўсё месца дзейства. Гэта адназначна ўспрымалася як дабрадаць Гасподняя на святую справу.

Шчырыя словы гаварылі і месцічы, і госці. Апошніх было нямала. Акрамя згаданых пісьменнікаў з Мінска, прыехалі берасцейскія літаратары Мікола Пракаповіч, Алесь Каско, Мікола Папека з Брэста, Мікола Антаноўскі з Пружан, бярозкаўскі аўтар з Жабінкі Анатоль Бензярук. Шмат парупіўся дзеля высакароднай справы мясцовы краязнаўца і патрыёт Іван Ляшчынскі, які ўзяў на сябе клопат па вырабе крыжа і ўсёй папярэдняй арганізацыі. Вялікі дзякуй яму.

Цяпер душа ў нас спакойная. Ёсць куды прыехаць і аддаць даніну памяці Міхалу Баброўскаму. Яшчэ адзін знак духоўнага абуджэння паўстаў на беларускай зямлі. І чым больш іх будзе, тым больш мецьмем шансаў стаць вольным і гордым народам.

# ПАД БЕЛАРУСКІМ ВЕТРАМ
## Часопіс «БЯРОЗКА»

Шчаслівая доля ў часопіса «Бярозка» – быць заўсёды юным, маладым. Як і ў першых нумарах, так і сёння тут гучаць галасы дзяцей, бачны іх твары, друкуюцца вершы, апавяданні, нататкі, малюнкі юных аўтараў. А што напісана дарослымі, тое таксама прасякнута непаўторным водарам дзяцінства, з якога ўсе мы родам. Калі азірнуцца назад, «Бярозку» неаспрэчна можна назваць адбітай у слове гісторыяй дзяцінства некалькіх пакаленняў.

Азірнуца ёсць куды. Найстарэйшы беларускі часопіс для дзяцей і падлеткаў мае сталы век, не так даўно ён адзначыў сваё 75-годдзе. Гэта ўжо неад'емная і адметная з'ява беларускай культуры. Ля вытокаў выдання стаялі выдатныя майстры слова Уладзімір Дубоўка і Алесь Якімовіч. Можна зразумець іх хваляванне, тады яшчэ вельмі маладых, калі трымалі ў руках першы нумар «дзіцячай часопісі «Беларускі Піонэр». Адразу ж пабеглі, як цяпер бы сказалі, «наверх», каб паказаць выданне сваім апякунам і настаўнікам. А зацікаўленымі былі не абы-хто, а самі кіраўнікі рэспублікі. Старшыню ЦВК Аляксандра Чарвякова можна назваць нават хросным бацькам часопіса, бо якраз ён прапанаваў тую, першапачатковую назву. Дзень гэты дакументальна зафіксаваны ў гісторыі – 15 снежня 1924 года.

Падзеяй сталася першая гадавіна часопіса. Свае віншаванні прыслалі ўсе вышэйшыя дзяржаўныя структуры, ад ЦВК СССР і ЦВК БССР яно было падпісана арыгінальна: «Старшыня ЦВК беларускі акцябронак і піонэр Алесь Чарвякоў». Радасць і ўзнёслы настрой панавалі тады, яскравы адбітак пад'ёму народнага духу, выкліканага беларусізацыяй. У 1929 годзе з прычыны таго, што з'явілася газета «Піянер Беларусі», выданне атрымала назву «Іскры Ільіча». У час апошняй вайны часопіс не выходзіў, але ўжо з чэрвеня 1945 года яго выпуск аднавіўся. Тады

ж і закрасавала на вокладцы сённяшняя назва, светлая і паэтычная – «Бярозка». Шуміць яна пад беларускім ветрам, ласкаючы слых мілагучным родным словам.

Калі б сабраць падшыўкі часопіса за ўсе гады, атрымалася б цэлая бібліятэка кніжак – змястоўных, цікавых, з густам аформленных лепшымі мастакамі. Тут друкавалі свае творы для дзяцей народныя песняры Якуб Колас і Янка Купала, Змітрок Бядуля – на той час ужо класікі беларускай літаратуры. Хто не ведае хрэстаматыйны верш Купалы «Хлопчык і лётчык»?! Да слова, вельмі любімы першым касманаўтам Юрыем Гагарыным. Дык вось, упершыню ён быў апублікаваны якраз у «Іскрах Ільіча», у ліпеньскім нумары за 1935 год. Твор толькі што быў напісаны, бо пад ім пазначана: «Ляўкі. Аршаншчына. Чэрвень, 1935». З «Бярозкі», з апавядання «Чалавек ідзе!..» пачаўся творчы шлях Янкі Маўра. Стала супрацоўнічалі з часопісам Міхась Лынькоў, Віталь Вольскі, Васіль Вітка, Максім Танк, Васіль Хомчанка, Станіслаў Шушкевіч і многія іншыя празаікі і паэты, чые кніжкі ўвайшлі ў залатую скарбонку нашай дзіцячай літаратуры.

У свой час верш, які потым стаў вядомай песняй, напісаў Анатоль Вялюгін. Ён так і называецца – «Пісьмо часопісу «Бярозка». Удзячна гучаць радкі-прызнанне:

*Лясы вартуюць цішыню,*
*Завеяны да стрэх раён...*
*Я помню, як упершыню*
*Прынёс часопіс паштальён.*
*Пад нізкай столлю, у сучках,*
*За комінам, дзе вязкі траў,*
*Друкарскай фарбы смачны пах,*
*Як водар мора, хвалявау.*

Дарогу ў творчае жыццё часопіс даў Народнаму паэту Беларусі Нілу Гілевічу. Ува ўсе зборы твораў уключае ён свой верш «Бярозка». Бо якраз яна адкрыла будучага паэта, «паклікала ў далячынь», стала адлікам гадоў. Не губляе сувязі з часопісам Народны паэт Рыгор Барадулін. Пэўны час ён быў супрацоўнікам рэдакцыі, з уласцівым яму гумарам прыдумляў рэкламу на запалках: «Стой! Не запальвай папяроску. Ты сыну выпісаў «Бярозку»?», ці нават на пляшках са спіртнымі напоямі: «Цвярозы

ты ці выпіўшы, А наш часопіс выпішы!» Натуральна, за межы рэдакцыйнага пакоя такая рэклама не выходзіла, жартаваць можна было толькі ў пэўных піянерскіх рамках. Шумелі, шумелі над «Бярозкай» ідэалагічныя ветры, зрэшты, як і над усім астатнім нашым жыццём у савецкія часы. Але гэта – наша гісторыя, яе не пераробіш і не выкрэсліш.

Галоўнае ж заставалася праз усе гады – часопіс спрыяў выхаванню асобы дзіцяці, вучыў любіць сваю Радзіму, шанаваць родную мову. Пасля Алеся Якімовіча, які аддаў выданню каля 20-ці гадоў творчага жыцця, у 50-я гады галоўным рэдактарам быў Усевалад Краўчанка, у 60-я – Кастусь Кірэенка. Потым часопіс рэдагавалі Васіль Зуёнак, Анатоль Грачанікаў, Вячаслаў Адамчык. Цяпер галоўны рэдактар «Бярозкі» – Уладзімір Ягоўдзік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра, адданы дзецям пісьменнік.

У апошнія гады «Бярозка» абнавілася, памаладзела, апранулася ў бліскучую вопратку. Здаецца, быццам непадуладная яна імклівым вятрам часу, калі Беларусь шукае свой шлях, сваё месца ў няпростым і зменлівым свеце. Сакрэт, напэўна, у тым, што часопіс сапраўды, як дрэва каранямі сваімі, зніталаваны з роднай зямлёй, жывіцца яе легендамі і паданнямі, гісторыяй і лепшымі праявамі сучаснасці. У гэтым яго сіла, у гэтым вернасць традыцыі, закладзенай папярэднікамі. І сёння лепшыя нашы пісьменнікі лічаць за гонар надрукаваць свае творы і часопісе. І сёння «Бярозка» гартуе маладыя дараванні ў прыгожым пісьменстве і мастацтве, шчодра аддаючы ім свае старонкі пад рубрыкай «Верасок». Нашы чытачы добра ведаюць, што ніхто не застанецца па-за ўвагай, калі прышле свой твор.

Мне здаецца, што цяпер, калі мо і не кожнай сям'і пад сілу купіць кнігу, ды і не так шмат беларускіх кніжак выдаецца, «Бярозка» можа ў нейкай ступені кампенсаваць гэтае становішча. Тым больш, што ў адрозненне ад кнігі, матэрыялы тут друкуюцца разнастайныя, на любы густ, кожны знойдзе для сябе нешта цікавае. Не выходзячы з дому, можна павандраваць па сваёй краіне, чытаючы матэрыялы рубрыкі «Славутыя мясціны Беларусі». З выдатнымі людзьмі рэспублікі знаёміць рубрыка «Ведай нашых». На старонках часопіса друкаваліся «Сем цудаў Беларусі» Уладзіміра Ягоўдзіка, яны потым сталіся кнігай, вокамгненна зніклай з паліц кнігарняў. Праз усе нумары 1999

года прайшла «Еўрапейская сталіца», дзе расказвалася пра цэнтральныя ансамблі нашага любімага Мінска. У 2000 годзе ў матэрылах «Беларусь – 2000» мы прайшлі крок за крокам стагоддзямі беларускай гісторыі. Сёлета такой скразной рубрыкай стала «Помнікі архітэктуры».

Жыццё нашых дзяцей і падлеткаў у самых разнастайных праявах штонумар адлюстроўваецца ў матэрыялах рубрык «Класная дошка», «Хачу сказаць». Заўсёды выклікаюць цікавасць публікацыі «Музычнага экспрэса», «Паўлінкі», «Апошняй парты». Ёсць старонка «Пасябруем», дзе можна знайсці сабе сяброў і сяброўак з розных куткоў Беларусі. Праводзіць «Бярозка» разнастайныя конкурсы, віктарыны. Усяго і не пералічыш. Выйсце бачыцца адно – стаць сябрам часопіса, яго пастаянным чытачом, штомесяц браць у рукі прыгожае каляровае выданне, цудоўна аформленнае выдатнымі мастакамі.

Дзяцінства не ведае расчараванняў, яно поўніцца аптымізмам. Так і мне на заканчэнне невялікага аповеда хочацца падзяліць аптымізм Генадзя Бураўкіна, прыхільніка заўсёды маладой «Бярозкі»:

*І веру:*
*Часам светлым,*
*Пазбыўшыся нягод,*
*Пад беларускім ветрам*
*Шумець ёй сотні год!*

# ЗМЕСТ

Знакі гісторыі .......... 5
Пошум стагоддзяў .......... 11
X стагоддзе. Калі прыплылі крыжы .......... 12
XI стагоддзе. Дабравест Полацкай Сафіі .......... 14
XII стагоддзе. Крыж Еўфрасінні Полацкай .......... 17
XIII стагоддзе. Пад крылом Пагоні .......... 20
XIV стагоддзе. Віленскі шлях .......... 21
XV стагоддзе. Рэха Грунвальдскай бітвы .......... 26
XVI стагоддзе. Золата сонца маладзіковага .......... 29
XVII стагоддзе. Час беларускай смуты .......... 33
XVIII стагоддзе. Скон Вялікага княства .......... 36
XIX стагоддзе. У цені двухгаловага арла .......... 39
XX стагоддзе. Беларускі дом .......... 42
Ніву ўзарэ араты .......... 49
На мяжы старадаўняй Літвы .......... 66
Зямнымі шляхамі Збавіцеля .......... 71
Беларускі храм .......... 82
Званы Дабравесту .......... 89
Нонканфармізм Міколы Равенскага .......... 95
Крыж на магіле Бабро ўскага .......... 103
Пад беларускім ветрам .......... 107

**Мароз У. В.**

**М 28** Беларускі храм: Эсэ / Уладзімір Мароз. – Мн.: Міжнар. Цэнтр культуры кн., 2003. – 112 с.

ISBN 985-6168-33-3

Выраз «беларускі храм» для Уладзіміра Мароза ёсць адной з асноўных дэфініцый нацыянальнай ідэі ўпоравень з азначэннямі «беларускі Шлях» і «беларускі Дом». Яны суіснуюць у адзінстве і адметнасці: шлях — гісторыя, дом — дзяржава, храм — узвышэнне духу. У тэкстах кнігі, як гістарычных, так і звернутых да сучаснасці, знаходзіць адбітак кожная з гэтых граняў. Погляд аўтара скіраваны праз прызму духоўнасці, веры. Цэнтральнае месца займае эсэ «Пошум стагоддзяў», якое ўяўляе сабою ланцужок беларускай гісторыі ад першых летапісных згадак да сённяшняга дня.

УДК 726.03(476)
ББК 85.11(4Беи)

Літаратурна-мастацкае выданне

**МАРОЗ Уладзімір Вікенцьевіч**

**БЕЛАРУСКІ ХРАМ**

Эсэ

Рэдактары **Г.Далідовіч, К.Камейша**

Мастак **А. Глекаў**

Мастацкі рэдактар **В.Мішчанка**

Камп'ютэрная вёрстка **А.Глекаў**

Фота на вокладцы **П. Татарнікаў**

Карэктары **Н.Доваль, Г.Кучынская**

Набор **У.Мароз**

Падпісана ў друк з арыгінал-макета Фармат 84x108 1/32.
Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 3.74. Ул. выд. арк 5.14.
Наклад 600 асобнікаў. Зак. 227

Міжнародны цэнтр культуры кнігі.
Ліцэнзія ЛВ №185 ад 23.01.1998.
220048, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Надрукавана на УП «Технапрынт»
Ліцэнзія ЛП №203 ад 26.01.1998.
Мінск, пр. Ф. Скарыны, копр. 14, п. 215



ISBN 985-6168-33-3
9 789856 168331